ARCHE Зьмест № 4’2000 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Дэклясаваная эліта. „Беларуская думка“ і беларуская рэальнасьць канца стагодзьдзя. Валерка Булгакаў у ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Калі задуменна пазіраць на беларускую рэальнасьць канца стагодзьдзя, міжволі пачынае здавацца, што неўзабаве надыдзе час, калі ўсё, што ёсьць наўкола, застыгне, а можа, закупорыцца. Надта ўжо штучнымі, нацягнутымі падаюцца..."
3. Сьвятарная худоба на музычным траўніку. Агляд філярманійнага жыцьця. Юлія Андрэева ў ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Як выпеставаць у сябе пад акном сапраўдны ангельскі траўнік? Вельмі проста. Трэба толькі кожны дзень яго падстрыгаць — 300 гадоў запар — і ня пасьвіць на ім каровы. ...Большасьць менскіх аматараў музыкі сёньня жыве ўспамінамі пра тыя далёкія гады, калі за 15 рублёў можна было даехаць у купэйным вагоне да Масквы і там мець асалоду з сапраўднага мастацтва..."
4. Расія і свабода. Уладзімер Роўда ў ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Многія расійскія інтэлектуалы лічаць, што сёньняшні аўтарытарны рэжым — гэта цана, якую расійскае грамадзтва вымушанае заплаціць за адносную стабільнасьць і „ўстойлівую недатыкальнасьць асобы“. На нашу думку, гэта перш за ўсё цана за ўтрыманьне імпэрыі..."
5. Паміж багацьцем і беднасьцю. Анджэй Карашэўскі ў ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Шукаючы крыніцы багацьця нацыяў, Адам Сьміт на першае месца стаўляў вольны абмен тавараў і паслугаў. У гэты самы час у Польшчы абсалютная бальшыня палітычных і рэлігійных элітаў трактавала такія ідэі як герэзію, абразьлівую для Бога. Пакуль Бог маўчыць, тлумачэньне таго, што Яго абражае,

бяруць на сябе простыя сьмертныя..."
6. Гісторык, які перайграў гісторыю. Алег Гардзіенка ў ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Вярнуцца ў Беларусь для Міколы Ўлашчыка значыла выракчы сябе на беспрацоўе і непазьбежны новы арышт. Улашчык, прайшоўшы школу ГУЛАГу, з усіх мажлівых і немажлівых сілаў імкнецца ўнікнуць другога тэрміну за кратамі..."
7. Цэрквы з дрэва. Сяргей Харэўскі ў ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Найбольшую вартасьць кнізе надае менавіта ілюстрацыйны матэрыял. У прыватнасьці дзьве мапы Беласточчыны, на адной зь якіх пазначаныя ўсе бажніцы ўсіх канфэсіяў, а на другой выключна праваслаўныя й стараверскія цэрквы. Супастаўленьне абедзьвюх мапаў дае яскравае ўяўленьне, наколькі трывалы на Падляшшы артадаксальны праваслаўны ўплыў..."
8. Радзівілаўскія конікі. Генадзь Туровіч у ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Новая кніжка Ю.А.Татарынава пабачыла сьвет у сэрыі „Бібліятэка прыгод і фантастыкі“. Выдавецтва „Юнацтва“ шчэ ў 1982 годзе распачало друкаваць найлепшыя творы сусьветнай літаратуры для дзяцей. Стаяць на адной паліцы з А.Дзюма ганарова для любога пісьменьніка, але гэта таксама накладае на яго пэўную адказнасьць..."
9. Яшчэ пра Галакост. Вольф Рубінчык у ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Аўтар кнігі — прафесійны гісторык, PhDr. Нарадзіўся ў Беларусі ў 1955 г., эмігравaў у Ізраіль у 1992 г. Працуе ў Інстытуце яўрэйскай дыяспары пры Тэль-Авіўскім універсітэце..."
10. У дзяржаўніцкіх каардынатах. Ганна Штэйнман у ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Гістарычная хроніка ў памяці кожнага з нас складаецца з шэрагу вядомых нам гістарычных падзей, паводле якіх мы арыентуемся ў гісторыі, атаесамляючы даты з пэўнымі эпохамі. „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі“ мусяць „пераарыентаваць“ чытача з падзеяў расейскай ці іншай гісторыі на падзеі

гісторыі Беларусі..."

11. Трывожнае ўспрыманьне рэчаіснасьці. Наста Гулак у ARCHE 4(9)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Госьці п’юць за сталом, потым пераходзяць да вогнішча. То яны таўкуцца ў хаце, кладучыся спаць… Лірычны герой увесь час адчувае сябе дыскамфортна. Ён, старэйшы амаль за ўсіх сяброкоў, выглядае сумным напаўізгоем з уласнага жаданьня: не жартуе, не кахаецца, толькі іранічна, часам зьдзекліва, пасьміхаецца сам сабе..."

[image]

A R C H E **S k a r y n a** **№ 4 (9) – 2000**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

4 [image] – [image] 2000

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

З ь м е с т

Валерка Булгакаў

Дэклясаваная эліта

„Лукашэнка, гэты інтэлігент з народу, выявіў усю праблематычнасьць і беларускай нацыі, і беларускага грамадзтва, і беларускіх элітаў. Яго абраньне на прэзыдэнта ў пэўных колах тлумачылі прыкрай выпадковасьцю, фатальным зьбегам абставінаў, непамыснай палітычнай кан'юнктурай. За нейкі час, аднак, стала ясна, што іншага проста не было дадзена, што гэта заканамернасьць. Так сама ў гэтых колах мянялася стаўленьне да асобы Лукашэнкі. Ад страху і адкрытай непрыязьні яно пачало хінуцца ў бок асьцярожнага зацікаўленьня яго няўрымсьлівай асобай. У гэтых колах пачалі справядліва аддзяляць сэнс палітычнай дзейнасьці Лукашэнкі ад яго яскравай, маляўнічай індывідуальнасьці…“

Юлія Андрэева

Сьвятарная худоба на музычным траўніку

„…Так, любілі мы калісьці легенду *Большого театра* і Маскоўскай кансэрваторыі! Цяпер працьверазелі. Рыхтэр памёр; Трацьцякоў, як высьветлілася, заўжды йграў фальшыва; Пятроў у азарце нястрымнай самарэклямы страціў рэшткі музычнай тонкасьці, а таксама й піяністычнай тэхнікі. Піяніст Навум Штаркман апошнім разам прыяжджаў да нас толькі для таго, каб сыграць „з аркуша па нотах“ канцэрт Гайдна (мая матуля іграла яго ў трэцяй клясе). Выкананьне было па-дзіцячаму брудным, мо шчэ й таму, што Ўладзімер Шаліхін ня вельмі спрытна гартаў старонкі…“

Уладзімер Роўда

Расія і свабода

„…Многія расійскія інтэлектуалы лічаць, што сёньняшні аўтарытарны рэжым — гэта цана, якую расійскае грамадзтва вымушанае заплаціць за адносную стабільнасьць і „ўстойлівую недатыкальнасьць асобы“. На нашу думку, гэта перш за ўсё цана за ўтрыманьне імпэрыі. М.Сакалоў ня мае рацыі, калі піша, што 12 чэрвеня 1990 г. дэлегаты Зьезду народных дэпутатаў РСФСР, прагаласаваўшы за сувэрэнітэт Расіі, тым самым зрабілі выбар на карысьць нацыянальна-дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі…“

Анджэй Карашэўскі

Паміж багацьцем і беднасьцю

„Шукаючы крыніцы багацьця нацыяў, Адам Сьміт на першае месца стаўляў вольны абмен тавараў і паслугаў. У гэты самы час у Польшчы абсалютная бальшыня палітычных і рэлігійных элітаў трактавала такія ідэі як герэзію, абразьлівую для Бога. Пакуль Бог маўчыць, тлумачэньне таго, што Яго абражае, бяруць на сябе простыя сьмертныя. Пытаньне Адама Сьміта пра крыніцы багацьця нацыяў застаецца ў сіле. Два гады таму ў Злучаных Штатах зьявілася кніга аднаго з найлепшых сучасных гісторыкаў эканомікі Дэвіда Лэндза пад прыкметнай назвай „Дабрабыт і галеча нацыяў: чаму адны багацеюць, іншыя галеюць?“…“

Алег Гардзіенка

Гісторык, які перайграў гісторыю

„Савецкая Беларусь 1921–1928 гадоў — гэта апошні момант сытага жыцьця перад перакрышам, *Апошняя Аркадыя*, залатая пара сялянскай, вясковай, зрэбнай Беларусі, залаты век нацыянал-камуністаў, легенда беларускага сацыялізму. Вымушаны антракт, зацішша перад крывавым патопам…“

Кнігі – Рэакцыі – Лісты ў рэдакцыю

Сяргей Харэўскі: **Цэрквы з дрэва**
Генадзь Туровіч: **Радзівілаўскія конікі**
Вольф Рубінчык: **Яшчэ пра Галакост**
Ганна Штэйнман: **У дзяржаўніцкіх каардынатах**
Наста Гулак: **Трывожнае ўспрыманьне рэчаіснасьці**

[image]
[image]

№ 4 (9) – 2000

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2000
[image]

Валерка Булгакаў Дэклясаваная эліта „Беларуская думка“ і беларуская рэальнасьць канца стагодзьдзя

Беларуская думка/Белорусская мысль. Штомесячны навукова-тэарэтычны і грамадска-публіцыстычны часопіс. № 1. Студзень 2000.

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопіса ARCHE, аўтар эсэ „Мой Багушэвіч. Дыялектыка клясычнага тэксту" (1998). Апошняя ягоная публікацыя — артыкул „Каляндарык для Кастрата" ў мінулым нумары ARCHE Скарыны.

1.

Пры канцы стагодзьдзя міжволі зьяўляецца жаданьне абагульняць і параўноўваць. Паспрабуем абагульніць і параўнаць і мы: што зьмянілася ў жыцьці беларускага народу за апошнія сто год? Што мы шчасьліва набылі і што незваротна страцілі?

Калі йсьці ў рэчышчы павярхоўнага абагульненьня, то можна скласьці гэткі рахунак. Сто год таму беларусы ўяўлялі сабой адносна гамагенную традыцыйную аграрную супольнасьць з патрыярхальнымі этыка-маральнымі нормамі, разьяднаную рэлігійна і культурна, але сцэмэнтаваную адной мовай і мэнтальнасьцю. У сацыяльным пляне гэта быў збольшага сялянскі народ, сувязі зь якім за рэдкім выняткам выракліся

верхнія слаі аграрнай супольнасьці фэўдальнага тыпу — шляхта, клер, дробныя і буйныя ўраднікі. Горад быў у сутнасьці закрыты для беларусаў. Нават трапіўшы ў яго, яны выконвалі найменш прэстыжныя сацыяльныя ролі. „Беларус“ фактычна быў сынонімам разгубленага селяніна, дэзарыентаванага новымі павевамі часу, носьбіта размытай, у многім прамежкавай ідэнтычнасьці, пад'ярэмленага, прыбітага і падуладнага вонкаваму панаваньню. Яго галоўным клопатам было фізычнае выжываньне.
З пункту гледжаньня ідэнтычнасьці мала што зьмянілася за гэтыя сто год. Яна па-ранейшаму застаецца недааформленай і плыткай. Адначасна адбылася рэзкае зьмяншэньне колькасьці носьбітаў беларускай мовы, відавочна, больш як у два разы, прычым сфэра распаўсюджаньня мовы істотна не пашырылася. Вынятак тут складае мастацкая літаратура.
XX стагодзьдзе — гэта час раскладаньня і пэрманэнтнага крызысу традыцыйнага беларускага сьветагляду і стыхійнага засваеньня новых, выпрацаваных у Савецкім Саюзе стэрэатыпаў паводзінаў і ўяўленьняў пра рэчы і людзей. Гэта таксама час „рэпрэсіўнай урбанізацыі“, абумоўленай няроўнымі магчымасьцямі існаваньня (альбо гібеньне на сяле, альбо эвэнтуальнае працьвітаньне ў мястох).
Беларусы перасталі быць вузкай сацыяльнай групай — паляцелі ў космас, хадзілі ў партызанах, рабіліся дырэктарамі саўгасаў, народнымі пісьменьнікамі, заслужанымі артыстамі і функцыянэрамі КПСС. Пад канец стагодзьдзя Беларусь сталася незалежнай, і неўзабаве ў нас зьявіўся першы свойскі прэзыдэнт і яго апарат.
Карацей, беларусы займелі собскую эліту, якая вядзе за сабой свой народ.

2.

Як выхадцы з народных нетраў, прадстаўнікі новасьпечанай эліты перанялі бальшыню рысаў свайго сілкуючага асяродзьдзя. Першая і галоўная зь іх: надзвычайная, звышканфармісцкая гнуткасьць перад уладу трымаючымі. Другая й таксама вельмі важная: адсутнасьць свайго інстытуцыйна замацаванага сацыяльнага статусу, калі, зразумела, ня браць пад увагу тую частку элітаў, што

складаецца з былой савецкай партнамэнклятуры і таго, ува што яна выродзілася сёньня. Гэта натуральна: ад нашых элітаў ніколі не патрабавалася быць на інтэлектуальнай, прафэсійнай і проста чалавечай вышыні.

Новыя беларускія эліты пры гэтым вельмі неаднародныя. Часам нават здаецца, што паміж імі існуе больш разьдзяляльных ліній, чымся яднальных пачаткаў. Вельмі неаднародныя яны і лінгвістычна, і паводле свайго нацыянальна-этнічнага складу, і паводле сьветапоглядных установак ды вартасьцевых арыенціраў.

Апошняя пазыцыя заслугоўвае асаблівага разгляду, таму што дзякуючы ёй можна вылучыць тры асноўныя складовыя часткі, якія ўрэшце і ўтвараюць гэты гетэрагенны масіў беларускіх элітаў. Насоўваецца такая спантанічная спроба клясыфікацыі:

а) ужо згаданая былая савецкая намэнклятура — апаратчыкі, функцыянэры, ідэолягі, партыйныя і савецкія кіраўнікі, дырэктары, галоўныя інжынэры *etc.* заводаў і фабрыкаў, работнікі міністэрстваў і ведамстваў — цяпер яна альбо абслугоўвае лукашэнкаўскі рэжым, або займае прывілеяванае становішча ў беларускім бізнэсе, верхні аддзел якога так ці інакш падкантрольны ўсё тым жа „прэзыдэнцкім структурам“;

б) нованароджаная праслойка дробных і сярэдніх прадпрымальнікаў, якая сваім зьяўленьнем абавязаная гаспадарчым ператварэньням канца 80-х — пачатку 90-х. Нягледзячы на свой дзяціны век, некаторыя прадстаўнікі групы ўжо цяпер дабіліся пераканаўчых посьпехаў у сваёй справе. Гэта дае надзею на тое, што зь цягам часу яны стануцца касьцяком новай беларускай эканамічнай эліты;

в) інтэлігенцыя ў шырокім, „савецкім“ разуменьні гэтага слова. У нас традыцыйна вылучалі „творчую“ ці „гуманітарную“, „навукова-тэхнічную“ і г.д. інтэлігенцыю. Да яе прылучалі настаўнікаў, выкладчыкаў, лекараў, работнікаў культурных установаў. Гаварылася, што, каб стаць інтэлігентам, ня трэба мець вышэйшай адукацыі, галоўнае, быць носьбітам высокіх маральна-этычных якасьцяў. Існаваў нават эўфэмізм „інтэлігент з народу“.

Так зразуметая „інтэлігенцыя“ прадукуе „беларускую палітычную апазыцыю“ (перакінчыкі накшталт Юр’я Захаранкі ці Пятра Краўчанкі з стану былой намэнклятуры тут ня ў лік — колькасна яны пакуль у меншыні). Не дасягнуўшы перамогі

тады, калі яна была магчымая, беларускія апазыцыянэры аддаюцца тыпова інтэлігенцкім — не хваробам, а так, слабасьцям. Беларускія апазыцыянэры страшна некамфортна пачуваюцца ў рэальным беларускім грамадзтве, далёка не дасканалым і, можна сказаць, амаральным. І іх палымяныя, агністыя позіркі скіроўваюцца некуды наперад, а можа быць, назад — ува ўсякім разе, туды, дзе шматпакутная Беларусь ужо аквеціласа вясёлкавымі промнямі і зацурчэла жыватворнай крыніцай беларуская мова. У сапраўднасьці ўсё інакш: калі рэальная палітычная актыўнасьць не скіраваная на рэальныя палітычныя аб'екты і не прыносіць у агляднай пэрспэктыве жаданых вынікаў, значыць, у разьлікі, у аналітычныя пабудовы закралася памылка.

Шмат сказана пра беларускую раздвоенасьць, калізію „дзьвюх душаў" у целе беларускага інтэлігента. Выглядае на тое, што цяпер беларускі інтэлігент мае ня толькі „дзьве душы", але й жыве ў двух сьветах. Першы не залежыць ад яго і існуе як аб'ектыўная сапраўднасьць, другі ж сьвет канструюецца ягонай ня ў меру буянай уявай. Гэты сьвет напоўнены такімі субстанцыямі і рэчамі, як „талерантнасьць", „памяркоўнасьць", „альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары". Тое, што сёлета беларуская палітычная апазыцыя салідарна адмаўляецца браць удзел у „недэмакратычных выбарах", нам здаецца рэчай таго ж самага парадку. Ад нязноснага ўціску рэальнасьці ў сьвядомасьці чыніцца свайго роду „паўстаньне супраць нячыстай рэальнасьці", вынікам чаго стаецца „перанос" выбараў у плашчыню гульні ўяўленьня і ўзьвіваў фантазіі. У такіх выбарах перамагчы можа кожны.

Сказаць, што беларускія эліты неаднародныя, што аб'ектыўна і адначасна ў Беларусі існуюць гаспадарчыя, культурныя, інтэлектуальныя і г.д. эліты, паміж якімі ня толькі не вядзецца дыялёгу, але і адсутнічаюць найменшыя адзнакі паразуменьня, значыць не сказаць усяго. Фактычна адразу пасьля іх нараджэньня адбылася *нацыяналізацыя* эліт. Сёньня мы назіраем адваротны працэс — іх частковае разьдзяржаўліваньне. Перашкодзіць яму ня ў стане нават прэзыдэнт Лукашэнка.

3.

Лукашэнка, гэты інтэлігент з народу, выявіў усю праблематычнасьць і беларускай нацыі, і беларускага грамадзтва, і беларускіх элітаў. Яго абраньне на прэзыдэнта ў пэўных колах тлумачылі прыкрай выпадковасьцю, фатальным зьбегам абставінаў, непамыснай палітычнай кан'юнктурай. За нейкі час, аднак, стала ясна, што іншага проста не было дадзена, што гэта заканамернасьць. Так сама ў гэтых колах мянялася стаўленьне да асобы Лукашэнкі. Ад страху і адкрытай непрыязьні яно пачало хінуцца ў бок асьцярожнага зацікаўленьня яго няўрымсьлівай асобай. У гэтых колах пачалі справядліва аддзяляць сэнс палітычнай дзейнасьці Лукашэнкі ад яго яскравай, маляўнічай індывідуальнасьці.

Сваім зьяўленьнем Лукашэнка абавязаны гістарычнай мэтамарфозе. Раней такія, як ён, былі дырэктарамі саўгасаў, нізавымі актывістамі, сакратарамі пярвічных партыйных арганізацый, настаўнікамі ў школах, участковымі міліцыянэрамі, пажарнымі, лекарамі, вясковымі фэльчарамі. Ніколі іх не дапускалі на пасады, на якіх у іх зьявіліся б рэальныя інструмэнты ўлады, рэальны апарат уціску — ня важна, якога, уяўнага ці сапраўднага — на рэчаіснасьць, а таксама гэтулькі апаратных рэсурсаў. Стаўшы ля стырна ўлады, Лукашэнка стаўся пародыяй на вышэйшага прадстаўніка савецкай кіраўнічай эліты — прадмета яго насьледаваньня і абагаўленьня.

Адчуваючы сваю непаўнавартасьць і, часткова, увесь камізм свайго палажэньня як вышэйшага кіраўніка дзяржавы, Лукашэнка мусіў штодня і шточасіны пацьвярджаць свой высокі статус перадусім самому сабе. Для гэтага ён выкарыстоўвае шырока пашыраны ў нашых краёх стэрэатып носьбіта ўлады і ўладных паўнамоцтваў. Згодна зь ім, першакрыніцай улады ёсьць нічым не ўтаймаваная сіла, а не выкананьне літары закону. Быць валадаром азначае выпраменьваць гэтую сілу на сваіх падданьнікаў, усьцяж трымаць іх у стане жорсткага падпарадкаваньня. Добрым начальнікам будзе толькі той начальнік, ад якога дранцьвее ўсё навокал. Карацей, галоўным атрыбутам *такой* улады стаецца паранаідальная воля да панаваньня ўзапар з адкрыта садысцкімі ўхваткамі.

У такім грамадзтве менавіта ўлада дае ўсё. Ні сумленная шматгадовая праца, ні прарыў на навуковай ніве, ні геройскі

вайсковы чын ня здольныя дабіцца таго, чаго носьбіт найвышэйшай улады можа здабыць махнуцьцём свайго пешчанага/спрацаванага пальчыка. Каб зрабіць сваю ўладу сакральнай, найвышэйшы кіраўнік прымушае ўсё грамадзтва лічыць усіх астатніх прэтэндэнтаў на ўладу „экстрэмістамі“ і „адмарозкамі“. Адно на яго чале ляжыць боскі знак. Зрэшты, так пачынае думаць ня толькі ён, але і маса грамадзян, у якіх наіўныя палітычныя пагляды шчасьліва спалучаюцца з рабскай псыхалёгіяй.
Засяродзіўшы па магчымасьці ўсю ўладу ў сваіх руках, зрабіўшы гэтую ўладу, наколькі гэта магчыма ў дадзеных варунках, абсалютнай, Лукашэнка тым самым пераняў абсалютную віну за ўсё тое ліхое, што дзеецца наўкола. Будучы адзіным і паўсюдна культываваным увасабленьнем рэальнай улады, Лукашэнка стаецца адказным за ўсё — майскія замаразкі, зьнішчэньне флёры і фаўны, прайгранку беларускай зборнай на чэмпіянаце сьвету па хакеі. Некалі, думаецца, надыдзе момант пералому ў масавай сьвядомасьці — цяжар адказнасьці пераважыць той афэктыўна каштоўны і ўгрунтаваны на інстынктах комплекс найвышэйшага правадыра-кіраўніка.
Сваім зьяўленьнем Лукашэнка выявіў таксама праблематычнасьць і „беларуса“ як такога, і „простага чалавека“, і „беларускага інтэлігента“. Можна сказаць нават больш: беларуская інтэлігенцыя, як ніхто іншы, усяляк рыхтавала прыход Лукашэнкі да ўлады.

4.

Але што трэба для таго, каб быць беларускім інтэлігентам? Валодаць некалькімі заходнеэўрапейскімі мовамі і свабодна разьбірацца ў французскім жывапісе канца XIX ст.? Не. Атрымаць адукацыю ў сусьветна прызнаных унівэрсытэтах Захаду і выкарыстоўваць здабытыя веды для таго, каб жыла Бацькаўшчына? Таксама не. Выступаць на роўных з сваімі калегамі з Польшчы ці Нямеччыны, ствараючы пазытыўны інтэлектуальны імідж Беларусі? Ізноў не. Напружана працаваць, стаўляючы сабе мэту ператварыць Беларусь з культурнай пустыні ў культурную аазу? Не, не і яшчэ раз не. Галоўны варунак, пры спаўненьні якога да апошняга часу

можна было лічыцца беларускім савецкім інтэлігентам, трэба сфармуляваць так: быць расейскім нацыяналістам і, у пэўнай колькасьці выпадкаў, умець гаварыць і пісаць па-беларуску.
У 30—40-х гадох адыходзячага стагодзьдзя для беларускіх пісьменьнікаў настала новая пара: часіна актыўнага і пасьлядоўнага выяўленьня ляяльнасьці крываваму імпэрскаму рэжыму. Мова беларускіх пісьменьнікаў таксама зьмянялася. Каб ня быць абвінавачаным у нацыяналізьме, шкодніцтве, дывэрсіі, правакацыі, каб увогуле выжыць, у свае літаратурныя творы, перадусім вершы, яны пачалі жыўцом устаўляць расейскія словы. „Цьвёрда трымаўся юнак на дапросе“ ці ня самае сакрамэнтальнае з гэтага доўгага шэрагу. Падобныя фігуры ляяльнасьці на добры лад пазначалі адно *капітуляцыю* перад агрэсіўнай расейшчынай.
У 80-я мы фактычна ўвайшлі з тым багажом, які быў назапашаны часткова ў 20-я ў савецкай Беларусі, часткова ў міжваенны пэрыяд у Заходняй Беларусі, часткова беларускімі пасьляваеннымі эмігрантамі на выгнаньні. Парадаксальна, але якраз гэтыя часы вызначаліся тварэньнем аўтэнтычных зьместаў беларускай культуры. Паводле свайго культуратворчага значэньня яны, відаць, не саступаюць, а нават пераўзыходзяць тыя збольшага ўяўныя культурныя дасягненьні, пра якія савецкая прапаганда ў Беларусі безупынна трубіла з 30-х і па сярэдзіну 80-х гадоў. У гэты час на гэтай тэрыторыі была замарожана сапраўдная культуратворчая актыўнасьць. Не разьвівалася, а засьмечвалася мова, трымалася ў падвешаным стане літаратура. Беларускія пісьменьнікі пісалі нуднаватыя і манатонныя тэксты. Нават найлепшыя зь іх накшталт Уладзімера Караткевіча так і не здабылі хоць нейкага сур’ёзнага прызнаньня вонках Беларусі. Здавалася, час спыніўся.
Адсутнасьць культурнага разьвіцьця для нас была роўная сьмерці.

5.

„Штомесячны навукова-тэарэтычны і грамадска-публіцыстычны часопіс“ „Беларуская думка“, адзіным заснавальнікам якой выступае „Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“, хоць і „выдаецца з кастрычніка 1991 г.“ (мы сумысьля абстрагуемся

ад таго, што зьдзеялася ў верасьні-кастрычніку 1991 і што папярэднічала ўзьнікненьню гэтага часопісу — няўжо „Политический собеседник“?), але арыентуецца на цяпер ужо падзабытыя часы, якія акурат і папярэднічалі „кастрычніку 1991 г.“. Гэтая арыентацыя выяўляецца ня толькі на ўзроўні ідэяў, але і моўных канструкцый, тэрміналягічнага апарату, нават асноўных уяўленьняў пра сьвет і жыцьцё.

„Беларуская думка“ — выданьне шырокага профілю. Будучы галоўным рупарам такога „часопіснага“ фармату сучаснага палітычнага рэжыму на Беларусі (тут друкуюцца артыкулы буйных лукашэнкаўскіх начальнікаў — „Председателя Совета Национального собрания Республики Беларусь“ Паўла Шыпука „Каждый держит вотчину свою, но будем сердцем едины…“ пра патрэбу як мага цясьнейшай інтэграцыі з Расеяй і Ўкраінай, „Заместителя премьер-министра Республики Беларусь“ Аляксандра Папкова „Трактор сдвинет воз проблем“ пра абнаўленьне машыннага парку рэспублікі і г.д.), часопіс публікуе літаратурную крытыку пяра Алеся Марціновіча, публіцыстыку Ўладзімера Глушакова, паэзію і прозу, па-свойму адгукаецца на пякучыя праблемы сёньняшняга дня, а таксама праяўляе сваю грамадзянскую пазыцыю па розных іншых пытаньнях, знаёміць чытача зь цікавымі і займальнымі зьявамі навакольнай рэчаіснасьці.

У рэдакцыйную калегію „Беларускай думкі“ ўваходзяць такія прадстаўнікі беларускага істэблішмэнту, як кіраўнік адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі Міхаіл Мясьніковіч, віцэ-прэм’ер беларускага ўраду Ўладзімер Русакевіч, былы дэкан факультэту журналістыкі БДУ і цяперашні намесьнік міністра адукацыі Алег Слука, міністр эканомікі Ўладзімер Шымаў, і ўжо згаданы публіцыст і па сумяшчальніцтве першы намесьнік старшыні Дзяржаўнага камітэту па справах друку Ўладзімер Глушакоў.

Думаецца, што прэзыдэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка не ўваходзіць у рэдакцыйную калегію толькі з прычыны асабістай мяккасьці, прыроджанай сьціпласьці і вечнай занятасьці*.

* Адсутнасьць Аляксандра Рыгоравіча ў рэдкалегіі зь лішкам кампэнсуецца тымі вобразнымі выказваньнямі яго ласкавай ласкі ўнасьлядкаванасьці, прыкладаў якіх дае нам „Беларуская думка“. Напрыклад, у №1 за 2000 іканая пасьвядоўнасьць была тэткай

„Будни ГАИ“, „Прокурор поднимает проблему“, „Лицо бизнеса“, „Опыт регионов“, „Подробности“ і г.д. Мова такой дапаможнай рубрыкі заўсёды беспамылкова паказвае, на якой мове напісаны наступны за ёй матэрыял.

На працягу доўгага часу не мяняецца памер „Беларускай думкі“ — 192 старонкі фарматам 70х108 1/16. Вокладка часопіса кардонная, афарбоўка — ад сьветла-зялёнай да цёмна-чырвонай. Наклад выданьня вагаецца паміж 8500 асобнікаў (№9 за 1999 г.) і 5500 (№10 за 1999 г.). №1 за 2000 год выйшаў накладам у 6901 асобнік. Адны думаюць, што гэта адбылося дзякуючы павелічэньню падпіскі. Другія, больш назіральныя, упэўненыя, што болей грошай дае Лукашэнка на прамываньне мазгоў і што гэта не рэальны наклад. Увесь наклад, на іх думку, да таго ж рэальна не прачытваецца і ляжыць у культпрасьветустановах, кабінэтах, бібліятэках і вайсковых часьцях. Кошт „Беларускай думкі“ напрыканцы мінулага году складаў 10—12, а во сёлета падвысіўся да 30 амэрыканскіх цэнтаў.

Выданьне штомесячнае і дзьвюхмоўнае. У №1 за 2000 г. зьмешчана агулам 32 артыкулы і тэксты, зь іх 21 матэрыял дадзены па-расейску, а 11 — па-беларуску. Расейская мова ў часопісе практычна адзінаўладна абслугоўвае рубрыкі „Момант

ісціны“, „Філасофія і сучаснасць“, „Улада“, „Права“, „Эканоміка“, „Сацыяльныя праблемы“, „Планета і Мы“, „Эўрыка!“, карацей, для яе зарэзэрваваныя ці мала ня ўсе „агульнагуманітарныя“, „забаўляльныя“, „інфармацыйныя“ тэмы. Беларуская мова, на думку рэдакцыі, больш арганічна прыдаецца для „Слова галоўнага рэдактара“, а таксама для асьвятленьня краязнаўчых, літаратуразнаўчых, мастацтвазнаўчых пытаньняў, ну і, натуральна, для пісаньня літаратурных твораў.

Могуць запярэчыць, маўляў, сама рэдакцыя засьцерагае: „Часопіс выходзіць на беларускай і рускай мовах у залежнасці ад мовы аўтарскага арыгінала“. Гэтая стылёва недасканалая і сэмантычна двухсэнсоўная фармулёўка, безумоўна, хавае ад нас ладную часьціну праўды: канкрэтныя матэрыялы ў канкрэтных аўтараў замаўляе рэдакцыя, і ніякая „самаадвольнасьць“ тут недапушчальная. Пагатоў у выпадку з такім салідным выданьнем нявыпрабаваных аўтараў і выпадковых тэкстаў проста не бывае.

Выданьне ілюстраванае, прычым ілюстрацыйны шэраг тут складаецца ня толькі з фотаздымкаў, а з фотакаляжаў. Пад фотаздымкамі там-сям стаяць подпісы „Задушевная беседа о жизни ветеранов труда“, „День руководителя в ПМК-65“, „Президент Республики Беларусь А.Г.ЛУКАШЕНКО с членами Совета по развитию предпринимательства в Республике Беларусь...“

Карэктура часопіса ўвогуле добрая, хоць там-сям стрэліся абмылачкі.

Рэдагуе „Беларускую думку“ „Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Вялічка“.

** Беларуская думка. №10. 1999. С.14 — 15.

Было б сур'ёзнай памылкай спыняцца на фармальным зьмесьце першага сёлетняга нумару „Беларускай думкі“ і спрабаваць максымальна дакладна апісаць усё тое, што знаходзіцца за яго непаўторнай, у белых разводах, вокладкай. Значна цікавей у пазнавальным сэнсе будзе сканцэнтравацца на тым, якія праблемы ставяць перад сабой аўтары часопіса і якім чынам яны вырашаюцца.

А праблема перад імі стаіць адна: ідэалягічнае забесьпячэньне стабільнасьці сучаснага беларускага палітычнага рэжыму,

прапаганда, папулярызацыя і данясеньне ў выразьліва пазытыўным сьвятле да кожнага чытача ўсяго таго, што робіць прэзыдэнт Лукашэнка.
Разьвязваецца гэтая праблема некалькімі шляхамі. Перадусім вульгарнай, з характэрнымі перакурчаньнямі і дэмагагічнымі дадумваньнямі, крытыкай незалежніцкіх культурных ініцыятываў і грамадзянскіх акцый. Прызнаны спэцыяліст у гэтай дзялянцы, згаданы вышэй У.Глушакоў у №10 за 1999 год так фармулюе сутнасьць пытаньня:

„На жаль, сёння пакуль няма дакладна распрацаванай ідэалагічнай праграмы, і вось тут, мне думаецца, хаваецца адказ на набалелае пытанне: чаму частка „эліты“, арыентаваная на БНФ, была і застаецца ў ролі суддзі, які вырашае, што такое беларуская гісторыя і беларускі народ, беларуская культура і родная мова. Дзіўная і незразумелая атрымліваецца рэч: страціўшы палітычныя рычагі ў ідэалогіі, БНФ па-ранейшаму тлумачыць, указвае, патрабуе, папярэджвае, нападае, прымушае апраўдвацца. І мы апраўдваемся, неўпрыкмет здаючы адну пазіцыю за другой. Важна нарэшце ўсвядоміць, што флірт, як сведчыць падобны заганны вопыт, часцей перарастае ў звычайнае падлашчванне перад БНФ, у выніку чаго, хочаш ці не хочаш, вымушаны часткова агучваць аргументы, маўляў, у іх (рускіх) у вёсцы ўсё быллём парасло, а мы, беларусы, умеем працаваць і г.д.
…
*Варта ўсвядоміць, што беларуская культура, нацыянальная свядомасць народа — гэта зусім не тое, што спрабуюць працягнуць пад гэтымі шыльдамі (вылучана намі. — **Аўт.**) БНФаўскія ідэолагі, якія чамусьці прысвоілі сабе манапольнае права вырашаць, хто сапраўды „шчыры“ беларус, а хто не. Варта сказаць, што беларуская культура — гэта не прамовы Пазняка, артыкулы Лябедзькі, „шэдэўры“ К.Тарасава або У.Арлова“**.*

*** Старшыня верхняй лукашэнкаўскай палаты Павел Шыпук у №9 за 1999 выказаў ідэалягічную задачу ясна і адназначна: „Расам, Украінцам і Беларусам — трэба ствараць адзіную інфармацыйную прастору“. Пакуль што ў Беларусі ініцыятыва ў гэтай сфэры належыць БНФ. Таму ўсякі нетрадыцыйны погляд на беларускую культуру, артыкулы Лябедзькі, „шэдэўры“ К.Тарасава або У.Арлова — **за Аўтам** ў разрад элемэнтаў ідэалёгіі БНФ. Такі трук, аднак,

стварае момант дадатковай мабілізацыі ўсіх сілаў супраць „калектыўнага непрыяцеля“.
Багата такіх трукаў і прыёмаў і ў разгляданым намі №1 за 2000 г. (тут і далей усе спасылкі даюцца на гэтае выданьне з указаньнем у дужках адпаведнай старонкі. — **Аўт.**). Прывядзем толькі некалькі цытатаў:
„В последние годы и в Беларуси появились организации, рассматривающие возможность политического насилия, в том числе и свершение террористических актов как приемлемый, действенный метод борьбы. К ним относятся “Белорусская националистическая организация”, “Белый легион”, “Правый реванш”...
Об этом красноречиво свидетельствуют события 17 октября 1999 года в Минске, когда так называемая оппозиция на деньги западных покровителей устроила на улицах столицы беспорядки, вызвавшие осуждение широкой общественности...“ (с. 20, с. 24).
„Экс-спикер Семен Шарецкий, литовский сиделец, объявивший себя „заложником Конституции 94-го года“ и одновременно и.о. главы государства, намерен вести диалог лишь о передаче ему президентских полномочий. Оппозиционные партии обставляют начало переговоров таким множеством условий, что создается впечатление, что они заинтересованы не в переговорах, а в том, чтобы обвинить власть в их срыве... Что может означать на практике требование освободить всех “политзаключенных”? Ведь оппозиция считает “узниками совести” даже тех, кто находится под следствием за экономические преступления. По разряду “борцов с тоталитарным режимом” идут и организаторы массовых беспорядков в Минске 17 октября“ (с. 54).
„Правым, к которым принадлежат у нас БНФ, Объединенная гражданская партия, Белорусская социал-демократическая партия “Народная грамада”, предстоит преодолевать свой разрушительный радикализм, отрыв от народа и адаптировать свои программы к белорусской реальности“ (с. 56).
„...Оказывается, как полагает автор одной из опубликованных там (“Народная воля”. — **Заўв. рэд.**) *статей небезызвестный С.Шарецкий, в отечественной истории есть две группы фактов или исторических событий. Одни из них, скажем так, “хорошие”: это, например, 1514 год — победа “Под Воршай”, 1252 —*

коронация первого короля Белорусско-Литовского государства, годы принятия статутов Великого княжества Литовского. Другие — "плохие": годы разделов Речи Посполитой, захват Полоцка новгородским князем Владимиром, 1832 год — закрытие Виленского университета, 1996 год — дата "государственного переворота" и так далее.
В данном случае, видимо, нет необходимости вспоминать о диалектике, которой, к слову, обучают не только по марксистским учебникам, но и во всей "Эўропе"…" (с. 30—31).
Апошні пасаж сваім, на думку яго аўтара, зьедлівым „во всей „Эўропе" дае рэальную падставу прыпусьціць, што тут гэтаксама вядзецца прыхаваная палеміка з усё тымі ж „БНФовскими идеологами". Часам гэтая палеміка перарастае ў адкрытую непрыязь да заходняй культуры ў цэлым і да яе складовых частак у прыватнасьці. Чатыры прыклады: *„…На думку спецыялістаў, міжнацыянальная разня на Каўказе і ў іншых "гарачых кропках" планеты на 90% ствараецца СМІ. Невыпадкова ў ЗША за апошнія 15 гадоў толькі расходы на інфарматыку ў інтарэсах ваеннай стратэгіі выраслі ў 4 разы"* (с. 4—5, "Слова рэдактара"). *„По существу, однополюсный мир постепенно деформируется в некую особую форму тоталитаризма, для которой существует уже и название: "мир золотого миллиарда". 20 процентов населения планеты будут жить в условиях демократии и благоденствия, в "экологически чистых деревнях", куда будут стекаться все основные ресурсы планеты, в том числе и интеллектуальные. А остальные 80 процентов — обеспечивать эту жизнь" (с. 118). „Одновременно с такой тенденцией наблюдается и обратная: в восьми крупных городах из 50 вообще прекращено фторирование. Это Лос-Анджелес, Сан-Антонио, Сан-Хосе, Портленд (штат Орегон), Сакраменто, Сан-Диего, Гонолулу и Тусон (большинство их в той же Калифорнии, два последних — Гавайи и Аризона). Так что на вкус и цвет и там товарищей, то есть господ, нет" (с. 36). „И разумно ли, наконец, допускать к управлению страной политиков, для которых благосклонный кивок Клинтона или Шредера важнее судьбы собственного народа?"* (с. 56).
Другі кірунак рэдакцыйнай актыўнасьці можна акрэсьліць як нічым ня стрыманае ўзьнясеньне і папулярызацыю асобы й дзейнасьці першага беларускага прэзыдэнта. Для аўтараў часопіса стала ўжо трывалай традыцыяй у сваіх матэрыялах

пра адукацыю, эканоміку, экалёгію гаварыць пра натхняльную і кіруючую ролю Аляксандра Лукашэнкі. Аб гэтым па парадку:
„Президент Республики Беларусь А.Г.Лукашенко в ежегодном послании Национальному собранию 7 апреля 1999 г. определил ряд важнейших элементов экономической политики, решение которых должно обеспечить общий успех на инновационном пути“ (с. 6—7).
„Состоявшийся в ноябре 1999 г. саммит ОБСЕ в Стамбуле, в котором приняла участие официальная делегация нашей страны во главе с Президентом А.Г.Лукашенко, несмотря на призывы представителей некоторых стран Запада о так называемом „гуманитарном вмешательстве“ в дела России в связи с событиями в Чечне, пришел к консенсусу об отношении к раковой опухоли терроризма“ (с. 19).
„Можно спорить об эффективности шагов Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко в той или иной сфере народнохозяйственного комплекса, соглашаться или не соглашаться с его взглядами. Но непреложным фактом является то, что он, его деятельность стали во многом символизировать новое качество и политической жизни, и отношения к этой политике людей. Речь идет об укреплении государственности, об упрочении авторитета власти, международного авторитета страны и о ликвидации унижающей людей бедности“ (с. 29—30).
„По поручению Президента Республики Беларусь работа над Концепцией уже ведется. При этом возникает немало проблем, по которым точки зрения разработчиков не всегда совпадают“ (с. 41).
„В своей деятельности опираемся на установки Президента Республики Беларусь по совершенствованию воспитательной сферы… И, конечно же, учитываем рекомендации Гомельского облисполкома“ (с. 48). І так бясконца.
Прапагандысцкае нутро „Беларускай думкі“ знаходзіць сваё рэльефнае адлюстраваньне ў трэцім кірунку ідэалягічнай апрацоўкі масаў. Яго мы вызначым дваяка, з аднаго боку, як уласную вытворчасьць ідэалягічных клішаў і стэрэатыпаў, а з другога, — як прапаганду „ўсяго таго харошага, што зьявілася ў нас за апошнія гады“, а таксама штучнае ўзьвелічэньне розных другарадных праблем з мэтай адцягваньня ўвагі ад „магістральных“ пытаньняў сучаснасьці, зьвядзеньне рахункаў

зь мінуўшчынай (паэтызацыя недалёкай мінуўшчыны і падкрэсьлена дыфэрэнцыяванае стаўленьне да мінуўшчыны сівой), культываваньне „славянскай духоўнасьці“ і г.д. Возьмем самае паказальнае:

„Ва ўмовах бушуючай у свеце інфармацыйна-псіхалагічнай вайны вялікая сіла праўдзівага слова. Сёння ў ім асабліва востра зацікаўлены ідэалагічныя кадры, запатрабаваныя жыццём... Мы ўпэўнены, што ўзмацненне індывідуальнай работы з людзьмі палепшыць маральна-псіхалагічны клімат, выб'е глебу з-пад ног герастратаў, якія налаўчыліся маніпуліраваць грамадскай свядомасцю“ (с. 5, “Слова рэдактара”).

„Да, у врачей небольшая зарплата. Но мы уверены: будь она хоть в 10 раз больше, качество лечения не улучшится“ (с. 125).

„Бренчало ли золото в кармане нашего пращура? Знающие люди отвечают: на протяжении всей истории Беларуси золото в кармане простолюдина никогда не бренчало. Золотые монеты в Великом княжестве Литовском были привилегией знатных и богатых людей“ (с. 95).

„Трэба сказаць, кніга “Апазнаецца асоба мужчыны...” стваралася акурат у той час, калі ў нашай краіне адбываўся пераход ад таталітарнай сістэмы да шырокай дэмакратыі, вызначаліся новыя інстытуты ўлады. Простым людзям яшчэ мала што гаварыла і прозвішча першага беларускага Прэзідэнта. Напрыклад, “малады, чырванашчокі, кругленькі вадзіцель” знаёмую кабету суцяшае так: “Нічога, бабуся, пацярпі. Хутка ў нас новы “бацька” будзе, Кажуць, гэты ўжо сапраўды нікога не пакрыўдзіць, спагадлівы і разумны, сам некалі нагараваўся...” Размову выпадкова чуе бомж, ён жа Чалавек з вялікай літары, чуе і сур'ёзна задумваецца над сваім і чужым жыццём: як быць далей, хто з людзей мае рацыю?“ (с. 142).

„Немногим более двадцати лет назад, стылым зимним утром 27 декабря 1979 года, Советская Армия впервые после победоносного завершения Великой Отечественной войны выступила в боевой поход, выполняя союзнические обязательства перед дружественным тогда афганским государством... История обязательно скажет свое слово и об афганском походе Советской Армии. Правдивое и прямое, как солдатское: „Я тебя прикрою!“ И я уверен, что она скажет нашим ребятам: Вы не обманули народ, который позвал вас на помощь. Вы не изменили Знамени, у которого присягали. Вы не

опозорили седины матерей, воспитавших вас. Вы были и остались достойными сынами великой и прекрасной страны“ (с. 130).

Як бачым, перад намі адкрываецца багаты эмпірычны матэрыял, які адкрывае шырокую дарогу для роздумаў і абагульненьняў. Чытаючы „Беларускую думку“, паддаешся ўражаньню, што ўсе зьмешчаныя ў ёй тэксты напісаныя адным і тым аўтарам — настолькі безаблічнымі падаюцца яны. Няясна, дзе тут канчаецца звычайная чалавечая сьлепата і пачынаецца сьвядомы аўтарскі выбар, але як інакш патлумачыць паталягічнае няўменьне адрозьніць сваё ад чужога, жывое ад мёртвага, прыгожае ад звыродлівага? Часопіс робіцца людзьмі, якія страцілі — а можа, і ніколі ня мелі — нутраную незалежнасьць і якія заўзята праектуюць гэтую страту незалежнасьці навонкі. Тыя думкі, ідэі, канцэпцыі, якія фігуруюць у іхных тэкстах, як правіла, не зьяўляюцца прадуктамі іх уласнай інтэлектуальнай дзейнасьці, а больш ці менш удалым плягіятам добра вядомых узораў. Ім не патрэбная ні свабода *ад*, ні свабода *для* — такім людзям і бяз гэтага свабодна.

Тое, што часопіс робіцца людзьмі ўнутрана несвабоднымі, адразу кідаецца ў вочы. У яго аснове ляжыць архаічная на сёньня тэхніка моўнай гульні, якая была распрацаваная яшчэ шмат дзесяцігодзьдзяў таму і якая ўмела выкарыстоўвае навязьлівыя станы сьвядомасьці „савецкага чалавека“. Пэўнае апраўданьне рэдакцыі „Беларускай думкі“ палягае ў тым, што яна служыць *ідэі,* так, як сама сабе гэта разумее. Але гэтае служэньне ідэі ў дадзенай сувязі спалучаецца з а) кепскім эстэтычным густам, б) рэтраградна-кансэрватыўнымі сьвядомаснымі ўстаноўкамі, в) прымітыўнымі адсталымі ўяўленьнямі пра асобу і жыцьцё, г) культываваньнем казёншчыны ў яе самых радыкальных праявах.

Рэжым Лукашэнкі, як лішні раз падкрэсьлівае „Беларуская думка“, ідэалягічна грунтуецца на перадусім мэханічнай мабілізацыі ірацыянальных, але пры гэтым афэктыўна каштоўных комплексаў ідэяў, уяўленьняў і сьветапоглядных канструкцыяў, якія за савецкім часам склаліся ў адносна цэльную сыстэму. Цэнтральнымі вузламі гэтай сыстэмы ёсьць вульгарнае непрыняцьцё заходняга ладу жыцьця, дамарослы панславізм***, антымадэрнізм і вечная туга за нязбытным.

6.

Калі задуменна пазіраць на беларускую рэальнасьць канца стагодзьдзя, міжволі пачынае здавацца, што неўзабаве надыдзе час, калі ўсё, што ёсьць наўкола, застыгне, а можа, закупорыцца. Надта ўжо штучнымі, нацягнутымі падаюцца дачыненьні паміж асобамі і людзкімі калектывамі. Неспакой узбуджае знадворны выгляд дамоў, іншых будынкаў. Выглядае на тое, што даволі толькі піхнуць, і ўсё рассыплецца ўдрузачкі. Такія нездаровыя і алягічныя думкі ўзьнікаюць таму, што ў беларускім грамадзтве нават на пачуцьцёвым узроўні адсутнічае пазытыўны сацыяльны ідэал. Беларускае грамадзтва ні да чога не імкнецца. Гэта адбываецца з маўклівай згоды, больш таго, з ініцыятывы тых эліт, якія цяпер карыстаюцца ўладнымі паўнамоцтвамі.

Ідэолягі з партыйна-савецкім мінулым, якія па першым клічы рынуліся абслугоўваць рэжым, хочуць заткнуць гэтую зьзяючую дзіру, выкліканую адсутнасьцю пазытыўнага грамадзкага ідэалу, рознымі хімэрамі ўласнай вытворчасьці, а таксама зацяганымі дагматычнымі канструкцыямі мінулых-прамінулых гісторыка-філязафічных эпохаў.

Сваёй бязьдзейнасьцю гэтаму як ніхто іншы дапамагаюць так званыя беларускія інтэлектуалы з процілеглага ідэалягічнага стану.

Што, як не аналіз і інтэрпрэтацыя тых ідэалягічных фігураў, на якіх так актыўна паразытуе цяперашні рэжым, можа быць адной з пэрспэктыўных задачаў беларускага мысьленьня?

7.

Праблемай імпэрыі заўсёды ёсьць праблема ідэнтычнасьці. Імпэрскі цэнтр у ходзе свайго гістарычнага разьвіцьця немінуча дасягае такога пункту, калі разрыў у інтэлектуальным пляне паміж ім і шматлікімі ўскраінамі стаецца асабліва цямкім і відавочным. У нейкі момант інтэлектуалам з імпэрскага цэнтру стаецца нязносна цяжка назіраць і прымаць заведзены спрадвеку парадак рэчаў — усю гэтую жывёльную агрэсію і пабытовую тупасьць. А адсюль недалёка і да больш важкіх высноваў.

Выданьні накшталт „Беларускай думкі“ амаль немагчымыя ў

імпэрскім цэнтры, якім бы той ні быў — былым ці цяперашнім. Гэта прэрагатыва ўскраінаў, дзе яшчэ не закончыўся і доўжыцца ў дадзены момант крызыс клясычнай імпэрскай ідэнтычнасьці. Такімі запаведнымі мясьцінамі на постсавецкай мапе будуць Прыднястроўе, Беларусь, шматлікія рэгіёны Ўкраіны і Расеі.
Узьнікае ў нейкім сэнсе парадаксальная сытуацыя, калі мы маем [адносна] лібэральны [пост]імпэрскі цэнтр і [глыбака] цемрашальскую пэрыфэрыю. Гэтае цемрашальства пэрыфэрыі, абумоўленае ў канцавым выніку ўплывам комплексных калянізацыйных працэсаў на масавую сьвядомасьць пэрыфэрыйных грамадзтваў, ідзе ад агульнай коснасьці і неразьвітасьці. Агрэсіўнае непрыняцьце новых, адпаведных духу часу вартасьцяў і ўстановак, тут можа набываць такі масавы маштаб і ўсеагульны характар, што ўжо немагчымыя для [пост]імпэрскага цэнтру.
Патас „Беларускай думкі“ — гэта патас культываваньня агрэсіі на ўзроўні ідэнтычнасьці. Далёкасяжны ідэал „Беларускай думкі“ — захаваньне імпэрскай кампанэнты ў сьвядомасьці нашых суграмадзян. Іронія гісторыі акурат і палягае ў тым, што часу нельга павярнуць назад, але можна цешыцца кароткачасовымі і малаэфэктыўнымі экспэрымэнтамі штучнага стрымліваньня яго хады. Пры дапамозе гэтага параноікі набіваюць сабе цану і павышаюць свой аўтарытэт у сваіх і чужых вачах. Надта ж рупіць патэнцыйным кліентам лячэльных установаў выглядаць барацьбітамі супраць дыктату абсалюту і ўціску сапраўднасьці.

8.
Крызыс клясычнай імпэрскай ідэнтычнасьці, пра які мы кагадзе гаварылі, мае сваім наступствам беспрэцэдэнтны выбух расстройстваў сьвядомасьці. Ён можа выклікаць доўгатрывалыя паталёгіі сьвядомасьці як у „простага чалавека“, так і ў „прадстаўніка элітаў“. І першым, і другім у галаву беспрычынна і начэпна лезуць своеасаблівыя „паразыты мазгоў“ — так перакручаны і дэфармаваны сьвет уявы ўзаемаскрыжоўваецца з рэальным сьветам. Ад гэтага хаўрусу нараджаюцца істоты больш цялесныя — пачварныя мяшанцы мутацыі.
Вот што зрабілі з нашым народам.

Новае крытычнае мысьленьне, пачаткі якога можна назіраць ужо цяпер, з частковым пераводам аб'екту дасьледаваньня і зацікаўленьня ў беларускім дыскурсе ад абстрактна-інфантыльных разважаньняў на агульнагуманітарныя тэмы да навукова карэктнай і ўзважанай аналітыкі ўласна беларускага матэрыялу, зь неабходнасьцю будзе нечым паміж хірургіяй і вівісэкцыяй. Каму, як не яго аніматарам, давядзецца ўрэшце рэшт ускрыць гнайнікі, выдаліць пухліны, зьнішчыць паразытаў нашай сьвядомасьці і самасьвядомасьці? І ці нехта, хто яшчэ ня страціў розуму, будзе адмаўляць патрэбу такога хірургічнага ўмяшальніцтва?

9.

Савецкая імпэрыя, як і кожная іншая таталітарная дзяржава, трымалася на канструкцыях цэнтралізацыі. Абсалютны імпэрскі цэнтр трымаў пэрыфэрыйныя імпэрскія цэнтры ў стане залежнасьці і безумоўнага падпарадкаваньня. Для індывіда жыцьцё ў абсалютным цэнтры імпэрыі абярталася рэзкім узростам магчымасьцяў самарэалізацыі, больш таго, пэўныя прафэсійныя пэрспэктывы былі фактычна закрытыя для людзей з імпэрскіх ускраінаў. Ступень канцэнтрацыі культурных элітаў у гэтым „райскім" месцы намнога перасягала ступень іх канцэнтрацыі ўва ўсіх бяз вынятку іншых пунктах імпэрыі. Натуральна, што і цэнтральная імпэрская — у нашым выпадку расейская — мова паводле сваіх выяўленчых патэнцыяў далёка пераўзыходзіла ўсе ўскраінныя „іншародныя" мовы. Іншага быць проста не магло — такая жалезная імпэрская лёгіка. Люстэркавае адбіцьцё такога становішча назіралася і назіраецца ў Беларусі. Пасьля апошняй вайны Менск стаўся для Беларусі тым, чым для ўсёй імпэрыі была Масква — горадам-цмокам, які высмоктваў усе жывыя сокі з навакольнай прасторы. Асабліва сумны стан рэчаў тут назіраўся ў галіне культуры, бо калі эканамічна Беларусь мела колькі буйных прамысловых цэнтраў, то сапраўдным культурным цэнтрам быў і ў вялікай ступені застаецца толькі Менск. Акурат тут былі засяроджаныя ўсе беларускія выдавецтвы, а таксама пераважная бальшыня культурных і навучальных установаў, рэдакцый газэт і часопісаў. Падобная імпэрская мадэль культурнай палітыкі, адаптаваная для калёніі, якой была Беларусь, давала свой бясспрэчны плён, праўда, са знакам

„мінус“. Яна, ведама, забясьпечвала пэўную — такую, у якой была зацікаўлена каляніяльная адміністрацыя, — канцэнтрацыю культурнай эліты ў беларускай сталіцы (якая ўсё роўна была пастаянна недастатковай, каб атрымаць, прынамсі, эўрапейскае прызнаньне), але адбывалася за страшны кошт вымываньня колькі-небудзь пэрспэктыўных кадраў зь месцаў. Тым самым беларуская вёска выракалася на пэрманэнтны крызыс і выраджэньне: пазбаўленай уласнай інтэлігенцыі, ёй не заставалася нічога іншага, як ціха трызьніць пра свой скон, адначасна стаючыся ўсё больш і больш анахранічнай.

Гэта была трагічная зьява пагатоў з увагі на тое, што беларуская вёска здаўна была найважнейшым аргумэнтам супраць русіфікацыі. Якраз выхадцамі зь вясковага асяродзьдзя, перадусім з гістарычнай Віленшчыны і Меншчыны, сілкавалася беларускае адраджэньне на пачатку стагодзьдзя. Дый на сёньняшні дзень для шмат каго вёска застаецца той ідэальнай інстанцыяй, тым выточным пунктам, зь якога і пачынаецца ўсьведамленьне чалавекам самога сябе. Ператварэньне вёскі ў *колхоз*, у нездаровы дэфэктыўны арганізм, дзе жывуць адно паджылыя жанчыны, недалугі-небаракі і п’яніцы, фізычна няздольныя ўцячы зь яе ў места, істотна спрыяла запаволеньню, калі не спыненьню працэсу ўтварэньня беларускай нацыі. А як жа ж: людзі, неабыякавыя да беларушчыны, у мястох апыналіся пад жорсткім прэсінгам гнятлівай балышыні, пазбаўленыя гаючай лучнасьці з матчыным улоньнем. Каму быў на руку гэты абрыў зваротнай сувязі, думаецца, адумысьля гаварыць ня трэба.

Іншымі словамі, доступ да культурных і іншых дабротаў у імпэрыі беспасярэдне залежаў ад палажэньня суб’екта. Чым бліжэй ён знаходзіўся да цэнтру, тым больш сацыяльна, культурна і г.д. прэстыжным быў яго статус, і наадварот, у меру аддаленьня ад цэнтру адпаведна меншаў і гэты статус. Для Заходняй Эўропы гэты досьвед быў характэрны не ў такой меры. На гэтай частцы кантынэнту пачынаючы з Новага часу мела месца і адваротная тэндэнцыя, скіраваная на сьціраньне якасных адрозьненьняў паміж цэнтрам і пэрыфэрыяй. Напрыклад, у Нямеччыне найбольш знакамітымі ўнівэрсытэтамі заўсёды былі „правінцыйныя“ ўнівэрсытэты ў Гайдэльбэргу, Фрайбургу, Тубінгене, Франкфурце-на-Майне; у

апошнім месьце засяроджаныя найбуйнейшыя нямецкія выдавецтвы. Ува ўнівэрсытэце Базэлю, што на ўскрайку Швайцарыі, выкладалі Фрыдрых Ніцшэ і Карл Яспэрс. У сучаснай Чэхіі Канстытуцыйны суд знаходзіцца не ў сталіцы, а другім месьце паводле велічыні — Бырне. Нідэрлянды пайшлі яшчэ далей: там нават органы дзяржаўнага кіраваньня, міністэрствы і ведамствы, разьмешчаныя ня толькі ў сталіцы.
У адрозьненьне ад гэтага, лёгіка імпэрскай дактрыны прадугледжвала поўнае і беззасьцярожнае атаесамленьне культурных, палітычных і эканамічных цэнтраў дзяржавы. Будучы прадуктыўнай на пэўным этапе існаваньня апошняй, яна стаецца яўным анахранізмам і нават тормазам для тых утварэньняў, якія ўзьнікаюць пасьля яе немінучага распаду і ў якіх нацыятворчы працэс і фармаваньне структуры эканомікі прыпадаў на савецкі час. Гэтыя (Беларусь, Малдова, краіны Сярэдняй Азіі і Закаўказьзя) фармальна незалежныя дзяржавы, калі яны так і не пераадолелі ўспадкаваныя мэханізмы функцыяваньня, у сутнасьці застаюцца пародыямі на імпэрыю: з аслабленымі дазваньня, зьнявечанымі ўскраінамі і несувымерным гіпэртрафаваным цэнтрам, які спажывае пераважную бальшыню існуючых у краіне рэсурсаў, як матэрыяльных, так і людзкіх.
Нэгатыўная дынаміка імпэрскай (ці постімпэрскай) цэнтралізацыі вартая асаблівай увагі таму, што беларусы ў той ці іншай меры дагэтуль уяўляюць сабой аграрную супольнасьць, якая жыве паводле аграрнага календара. Тэндэнцыя да цэнтралізацыі ўзьвяла адвечныя беларускія хваробы ў абсалют, зрабіўшы ўставічную інфантыльнасьць масаў найвышэйшай цнотай.
Гэтай інфантылізацыі як ніштo спрыяюць розныя надуманыя ўяўленьні і стэрэатыпы, напрыклад, так званая „славянская духоўнасьць“, гэтая цынічная міталягізаваная абгортка безагляднага расейскага імпэрыялізму. У аснову яе пакладзена паранаідальнае і таму як бы самадастатковае адчуваньне собскай адрознасьці ад астатняга сьвету. Як паталёгія, „славянская духоўнасьць“ ня можа ня быць высакамернай і мэсіянскай: яна апэлюе да супэркаштоўных маральных ідэалаў і незаплямленых этычных нормаў. Рэальныя носьбіты „славянскай духоўнасьці“ ў сапраўднасьці проста жахлівыя: яны спалучаюць сваю першабытнасьць з разьвітым комплексам

собскай выключнасьці. Жывучы ў безнадзейна адсталым грамадзтве, маючы нізкі інтэлектуальны ровень, носьбіт „славянскай духоўнасьці“ сьвята пераканаы, што яго грамадзтва ўсё-ткі дасьць шанец сьвету.
За гады незалежнасьці беларусы так і не павярнуліся да самых сябе і працягваюць жыць, як было заведзена заежджымі начальнікамі. Пэўная рэгіяналізацыя, нягледзячы ні на што, усё-ткі адбылася. Усё часьцей у якасьці рэгіянальных культурных цэнтраў называюцца Горадня, Полацак з Наваполацкам, Віцебск, Мазыр, Магілёў, Жлобін. Цяпер стала зусім ясна, што будучыня незалежнай Беларусі наўпрост залежыць ад таго, ці здолеюць рэгіянальныя эліты пераняць цяжар адказнасьці за лёсы бацькаўшчыны цалком у свае рукі. Ня трэба, натуральна, сьпісваць з рахункаў Менску. Правінцыя, ня маючы собскай мэтраполіі, немінуча стаецца правінцыяй чужой мэтраполіі. Калі Беларусі ўсё-ткі наканавана стаць беларускай, Менску абавязкова давядзецца зьмяніць свой статус, выйсьці на самастойную арбіту. У такім выпадку Менск чакаюць вялікія ператварэньні, так бы мовіць, у дыскурсіўным пляне. Першае ператварэньне можна спрагназаваць як пасьлядоўнае разбурэньне комплексу собскай непаўнавартасьці і ў канцавым рахунку адмову ад ролі культурнага мэдыюму, пасярэдніка паміж чужым цэнтрам і сваёй ускраінай, важнага чыньніка і асноўнага каналу пашырэньня расейскіх уплываў. Па-другое, у сьвядомасьці менскіх элітаў мусіць нарэшце давяршыцца паварот да Беларусі як да экслюзіўнага адрасату іх творчай актыўнасьці. Часткова гэты працэс ужо адбываецца й сёньня. Ну, і нарэшце найважнейшае: беларускія эліты мусяць стварыць такія ўзоры мас-культуры, якія будуць сапраўды запатрабаваныя беларускімі масамі.

10.

Гіпатэтычна, слабасьць нацыянальна арыентаваных элітаў і, што самае галоўнае, нязьмерная дыстанцыя паміж імі і тымі элітамі, што на сёньняшні момант ажыцьцяўляюць уладныя паўнамоцтвы, дае нам шанец. Ён зьвязаны зь вераю ў тое, што некалі нарэшце да ўлады прыйдуць сілы, ня сплямленыя ганьбай дзяржаўнай здрады, ня спляжаныя псыхапатычнасьцю савецкага адміністраваньня, сілы, вольныя ад ранейшых прымхаў і забабонаў, сілы, чый стваральны патэнцыял ня будзе

выклікаць ні ў кога жаднага сумляваньня.
Дагэтуль мы ўжывалі слова „эліты“ блізу цалкам у тэхнічным сэнсе, як пазначэньне пэўных сацыяльных групаў і праслоек, факт існаваньня якіх у беларускім грамадзтве ёсьць аб’ектыўнай дадзенасьцю. Але прызнаемся сабе: гаварыць пра беларускія эліты можна толькі ў фармальным сэнсе або ўва ўмоўным ладзе. Гэтыя эліты так і ня здолелі споўніць тэлеалягічна закладзенай у іх місіі — *пераадолець дыктатуру пасярэднасьці*.
Пасярэднасьць у сваіх бясконцых формах і праявах ёсьць той інстанцыяй, якая прадвызначае культурнае, палітычнае і любое іншае жыцьцё ў сёньняшняй Беларусі. Ёй належыцца аўтарства як шматлікіх літаратурных твораў, якія цяпер вывучаюцца ў беларускіх школах і ўнівэрсытэтах, так і заканадаўчых актаў, прынятых беларускім парлямэнтам, а таксама палітычных ініцыятываў, падтрыманых беларускім народам.
Застаецца дадаць, што паняцьце „беларускага народу“ карэлюе з паняцьцем „беларускіх элітаў“. І першы, і другія могуць лічыцца такімі толькі ўмоўна. Мець поўнае права на такое словаўжываньне мы будзем тады, калі „беларускі народ“ адбудзецца як народ, а „беларускія эліты“ адбудуцца як эліты.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

ЮЛІЯ АНДРЭЕВА
кампазытарка, музычны крытык, выкладчыца Беларускага Калегіюму. Сярод апошніх значных публікацыяў — артыкул *Losy opery białoruskiej* у польскім часопісе *Ruch muzyczny* (Варшава, 1998).

Юлія Андрэева Сьвятарная худоба на музычным траўніку. Агляд філярманійнага жыцьця

Як выпеставаць у сябе пад акном сапраўдны ангельскі траўнік? Вельмі проста. Трэба толькі кожны дзень яго падстрыгаць — 300 гадоў запар — і ня пасьвіць на ім каровы. Нават сьвятарныя. Ці ня ёсьць для нас музычная культура гэткім жа ангельскім траўнікам — адвечным прадметам інтэлігенцкае пыхі, на які з-за нашае галечы не стае ані сродкаў, ані часу?
Большасьць менскіх аматараў музыкі сёньня жыве ўспамінамі пра тыя далёкія гады, калі за 15 рублёў можна было даехаць у купэйным вагоне да Масквы і там мець асалоду з сапраўднага мастацтва.

Альхімовіч, Крымер
Масква, як многа ў слове гэтым!.. Увесну 1984 году нават да Менску даляталі сэнсацыйныя чуткі пра гастролі піяніста Ўладзімера Горавіца, што прыляцеў у Маскву са сваім раялем і

даў *адзін* канцэрт, білет на які каштаваў мінімум 100 рублёў. Што горш, купіць гэты квіток было цалкам немагчыма. Памятаю, як найавантурнейшы зь менскае музычнай тусоўкі, кампазытар Пётра Альхімовіч (мянушка „Аль-Хаймовіч“; кажуць, цяпер у яго ў Мэксыцы свой рэстаран) дамовіўся-ткі са сваімі маскоўскімі сябрамі наконт квітка, заплаціў за яго падвойную цану і спадзяваўся нават завітаць да Горавіца за кулісы, каб прапанаваць яму для выкананьня сёе-тое з сваёй пісаніны (здаецца, з Рыхтэрам гэта яму ледзь не ўдалося). Змагаліся менчукі і з маскоўскаю міліцыяй — але гэта было ўжо пазьней, у лістападзе 1989 году. У Маскве ішоў сьнег, у кавярні „Север“, што на вуліцы Горкага, менчукі спажывалі марожанае, а намэнклятурныя шчасьліўцы зь білетамі ў руках сьпяшаліся ў *Большой театр*. Вядома, ня проста разглядаць інтэр’еры сьвятарнага кароўніка ў стылі „вампір“ ці слухаць нейкага там „Яўгена Анегіна“ (дарэчы, на той час даволі занядбанага). Уся культурная эліта ў тыя дні жыла маскоўскімі гастролямі славутага мілянскага тэатру *La Scala*. „Які спэктакль табе больш падабаецца: „Адрыена Лёкуўрор“ ці „Рамэа і Джульета?“ — пыталіся адзін аднаго менчукі, і ў кавярні надоўга завісала змрочная ціша. Трапіць у тэатр не было аніякай надзеі, і гаворка ішла не пра самыя спэктаклі, а толькі пра назвы, якія выклікалі ў нас найбольшы апэтыт.
Адзіным сьмелым чалавекам сярод усёй нашай кампаніі аказаўся піяніст Алег Крымер (дарэчы, зусім нядаўна ён зьехаў у Нямеччыну). Ён меў дастаткова адвагі, каб стаць у жывы ланцуг масквічоў, якія не былі цырульнікамі ў партыйнай эліты, аднак таксама хацелі паглядзець і паслухаць спэктакль *La Scala*. Моцна пабраўшыся за рукі, людзі рушылі ў дзьверы, проста на міліцэйскі заслон. А міліцыя, у сваю чаргу, стала іх адціскаць, так што ў вэстыбюлі ўтварылася маленькая няміга. У выніку адна дзяўчына зламала руку, а многія, у тым ліку і Крымер, — рэбры. Аднак жа яны паслухалі канцэртнае выкананьне вэрдзіеўскага „Рэквіему“... На зайздрасьць нам, баязьліўцам зь „Северу“.

Рыхтэр, Штаркман, Архіпава, Подлесь, П’яўко, Галкоўскі
У Менску ж усё было непараўнальна больш празаічна — прытым што сыстэма не скупілася на прыезды маскоўскіх гастралёраў. Калі ў 1997 годзе сьвяткавалі чарговы юбілей

Беларускай філярмоніі, дык падлічылі, што за 60 гадоў ейнага існаваньня Сьвятаслаў Рыхтэр выступаў у Менску 29 разоў, Навум Штаркман — 23 разы, Віктар Трацьцякоў і Мікалай Пятроў — 22, Марыя Біешу — 17, Ірына Архіпава — 13, Алена Абразцова — 10 разоў. Ці магчыма выкінуць з памяці тыя незабыўныя вечары — з авантурным даставаньнем уваходных квіткоў на стаячыя месцы, зь вясёлаю і зацятаю штурханінаю на філярманічным ганку, з патройным кантролем білетаў, з задухаю перапоўненага балькону, дзе на прыступках цесьненька сядзелі „ўсе нашы“, і, канечне, з шалёнымі воплескамі, што выбухалі пасьля кожнае п’есы, — нават тады, калі выкананьне было надта далёкім ад Недасяжнае Дасканаласьці? Тыя воплескі не датычылі музыкі як такой, а былі выразам чыстай дзіцячай радасьці ад спажываньня дэфіцытнага тавару, ад быцьця разам, ад адчуваньня таго, што *сапраўднае мастацтва* нарэшце прыйшло і ў наш горад… Мы разумелі, што амаль для ўсіх маскоўскіх гастралёраў Менск, Берасьце, Маладэчна — нешта накшталт рэпэтыцыйных пляцовак напярэдадні адказных выступаў на Захадзе. Аднак мы гатовы былі радавацца ня толькі сапраўдным музычным падзеям, але нават крошкам з панскага стала.

Затое калі ў наш горад нейкім цудам трапляла сапраўдная каштоўнасьць, мы лічылі за лепшае яе не заўважаць. Навошта апаганьваць пантэон маскоўскіх сьвятых фігурай нейкага чужароднага божышча? Таму прыезд Эвы Подлесь (здаецца, у 1988 годзе) ня выклікаў у менчукоў аніякага ажыятажу. Хоць за плячыма ў польскай сьпявачкі былі перамогі на конкурсах у Жэнэве, Рыё-дэ-Жанэйра, Атэнах, Барсэлёне, Тулюзе… І нават у Маскве, на конкурсе Чайкоўскага; хаця тамтэйшая прафэсура адшукала ў ейным вакале нейкія хібы і прысудзіла ёй толькі восьмую прэмію.

Ці варта сумлявацца, што нашае філярманічнае кіраўніцтва цалкам давярала меркаваньню вышэйшых таварышаў? Таму канцэрт Эвы Подлесь адбываўся не ў вялікай залі, а ў касьцёле сьв.Роха, дзе ейнаму агромністаму кантральта катастрафічна бракавала прасторы. Таму не было ніякай рэклямы і іншых буржуазных прыдумак. Эва сьпявала акурат тую музыку, дзеля якой нарадзілася на сьвет, — арыі Гендэля зь іхнымі фантастычнымі каляратурамі. Гэта была Дасканаласьць! А ў залі сядзела хіба дваццаць восем чалавек — збольшага

вясковыя настаўніцы, якія зь дзіцячай стараннасьцю адбывалі сваю культурную праграму. Адно шчасьце, што вядучыя прадстаўнікі нашага музычнага істэблішмэнту не чытаюць замежных часопісаў і не глядзяць спадарожнікавага TV. Іначай яны б даўно паадкусвалі сабе локці, даведаўшыся пра тое, якую модную сьпявачку яны прагапілі. Цяпер Эва Подлесь літаральна разрываецца паміж ньюёркскім *Metropolitan Opera*, лёнданскім *Covent Garden*, мілянскім *La Scala* і яшчэ тузінам тэатраў… Зрэшты, у *Большой театр* яе, здаецца, дагэтуль не запрашалі.

…Так, любілі мы калісьці легенду *Большого театра* і Маскоўскай кансэрваторыі! Цяпер працьверазелі. Рыхтэр памёр; Трацьцякоў, як высьветлілася, заўжды йграў фальшыва; Пятроў у азарце нястрымнай самарэклямы страціў рэшткі музычнай тонкасьці, а таксама й піяністычнай тэхнікі. Піяніст Навум Штаркман апошнім разам прыяжджаў да нас толькі для таго, каб сыграць „з аркуша па нотах“ канцэрт Гайдна (мая матуля іграла яго ў трэцяй клясе). Выканаьне было падзіцячаму брудным, мо шчэ й таму, што Ўладзімер Шаліхін ня вельмі спрытна гартаў старонкі. Біешу канчаткова састарэла яшчэ на памяці мінулага пакаленьня; Абразцова ператварылася ў рыклівага монстра. Архіпава ў свае 72 гады сьпявае яшчэ дасканала, але што нам Архіпава? Яна ж да нас ня езьдзіць. Памятаю, яшчэ за СССРам наша філярмонія запрасіла яе прасьпяваць вялікі цыкль абанэмэнтных канцэртаў пад агульнаю назваю „Анталёгія расейскага рамансу“. Здаецца, некалькі канцэртаў усё-ткі адбылося; але пасьля Белавескіх пагадненьняў Архіпава больш ні разу не прыехала. На руках у людзёў засталіся абанэмэнты, за якія былі плочаныя грошы. Адным словам, „Архі-МММ“.

Аднак навошта клапаціцца і дасылаць былым сябрам запозьненыя прабачэньні, калі можна адправіць ім сапраўдны дарунак? Верагодна, з гэтаю думкаю народная артыстка СССР і прыслала ў Менск свайго былога мужа — таксама народнага артыста СССР Уладзіслава П’яўка зь ягонаю новай жонкаю, Людмілай Магамедавай і маладым, інтэлігентным (у акулярах) барытонам Андрэем Грыгор’евым. Тое, што ўся кампанія завітала да нас ад імя і на даручэньне маскоўскае пяюльлі, недвухсэнсоўна пацьвярджалася афішнаю шапкаю „Ірына Архіпава прадстаўляе“. Здаецца, Беларуская філярмонія

спадзявалася атрымаць з гэтае імпрэзы немалыя грошы.
На дварэ была вясна 1998 году, лэйбл *Большого театра* даўно згубіў сваю былую прыцягальнасьць, і з гэтае прычыны П'яўко разам з Магамедавай забясьпечыліся больш прывабнаю шыльдаю „зоркі бэрлінскай *Staatsoper*“. Якія яны зоркі, мы ведалі загадзя, бо з Бэрліна даходзілі ўпартыя чуткі, што тытуланосны карыфэй гібее на трэціх ролях, а ягоная маладая сяброўка — у лепшым выпадку, „пятая прымадонна“. Больш за тое, іхную „зорнасьць“ мы ўжо аднойчы спазналі на ўласным досьведзе, калі Беларуская Опэра ў 1995 годзе запрасіла іх засьпяваць „Аіду“. Пацешнае гэта было відовішча (ці, лепей сказаць, слуховішча): гульлівая і смазьлівая Аіда (Магамедава) зь міленькім галаском апэрэтачнай субрэткі, а побач зь ёю — 54-гадовы Радамэс (П'яўко) з моцным торсам і голасам, падобным да Ерыхонскай трубы. У Эўропе гэткі сьпеў даўно ўжо выйшаў з моды, але ў нашых краях шчэ робіць пэўнае ўражаньне, асабліва ж на людзях наіўных. Найбольш разумныя яшчэ тады зрабілі выснову, што гучны голас — не падстава для абагаўленьня, што Бэрлін ня верыць даўнім сувязям у ЦК, дый увогуле — ня ўсё тое золата, што з Масквы.
І вось цяпер, праз тры гады, гэты канцэрт быў ужо канчаткова падобны да заапарку: П'яўко тэмпэрамэнтна квохкаў, як лемур-шапатун, Магамедава па-ільвінаму рыкала сваім далікатненькім галаском; а Грыгор'еў з азартам паляўнічага сабакі ўвесь час беспасьпяхова шукаў ноту „до“. Нешматлікая публіка альбо рагатала, альбо хуценька кіравалася ў буфэт, дзе давалі вельмі смачныя цестачкі „бушэ“.
А мне падумалася: мо гэты амаль што парадыйны правал — элемэнтарная расплата за беспрынцыпнасьць? Бо пад час сваіх мінулых гастроляў сп.П'яўко нечакана зьявіўся на БТ у „Навінах“ у якасьці бясплатнага дадатку да прапагандысцкае акцыі тэнара Міхаіла Галкоўскага (ня блытаць з былым сакратаром польскага пасольства Марэкам Голкоўскім). Галкоўскі-тэнар, заслужаны артыст Беларусі, выдатны выканаўца партыяў Атэла, Германа і Радамэса, калі няўмольны час і злоўжываньне алькаголем ператварылі яго ў жалосны цень самога сябе, заняўся палітыкай — дробнай і вялікай. У студзеньскія дні 1995 году сп.Галкоўскі наладзіў у Беларускай філярмоніі „фэстываль славянскіх тэнараў“ пад дэвізам „Да 60-годзьдзя з дня нараджэньня вялікага артыста“. Пад вялікім

артыстам разумеўся Зінові Бабій — наш легендарны тэнар, колішні выпускнік Кіеўскай кансэрваторыі, вакаліст высокай, несавецкае пробы (як сказаў Іван Казлоўскі, „ён, яго голас — дзяржаўны скарб“). Гэты Бабій, даўно нябожчык, нягледзячы на ўсе свае артыстычныя посьпехі, быў чалавекам цяжкога лёсу. Заходнік, „украінскі нацыяналіст“, відавочна ня любы савецкай уладзе (іначай яна напэўна прыдбала б яго ў *Большой театр*), падобна, нават выгнаньнік і ўжо напэўна — пакутнік, бо рана памёр ад алькагольнай хваробы сэрца… Ці можна было знайсьці якую-небудзь асобу, што *меней* надавалася б у якасьці патрона рэваншысцка-савецкіх ідэалягічных спэкуляцыяў? Неўзабаве высьветлілася, што Галкоўскі са сваім тэнаравым фэстам цэліў надта далёка — аж на восеньскія выбары ў Вярхоўны Савет, на якія ён ішоў з праграмай Славянскага Сабору. Выбары ён прайграў з рэкордным лікам: 150 галасоў — „за“, усе астатнія супраць.

Кульмінацыяй таго фэстывальнага фарсу была цалкам тэатральная сцэна на могілках, якую паказала ТБ. Стоячы над магілай нябожчыка-сябра, сп.Галкоўскі патэтычна заклікаў грамадзян Беларусі да славянскага яднаньня, пільнасьці да ворагаў і падтрымкі „ўсенародна абранага“. Побач зь ім стаяў Уладзіслаў П’яўко.

Навошта салідны народны артыст дазволіў выкарыстоўваць сябе ў якасьці фігуранта ў нечых палітычных гульнях? Толькі з пачуцьця настальгіі па імпэрыі? О, гэтая вуда, на якую трапляюць многія прадстаўнікі расейскай інтэлігенцыі, незаўважна для сябе саміх губляючы крэдыт даверу ў публікі і калегаў!

Так сталася з апошнімі „Днямі расейскай культуры ў Беларусі“ — бляклай і куртатай пародыяй на былыя пампэзныя „дэкады“. Усё мерапрыемства, нібыта прысьвечанае 50-й гадавіне перамогі над фашысцкай Нямеччынай, уціснулася ў тры дні — лічба альбо сымбалічная, альбо ня вельмі прыстойная. Галоўная прынада для публікі — два сымфанічныя канцэрты з удзелам моднага цяпер Маскоўскага сымфанічнага аркестру пад кіраўніцтвам народнай артысткі СССР, 79-гадовай Вэранікі Дударавай. Зрэшты, у ейным дырыжаваньні амаль не праглядвала аніякага дырыжорскага мастацтва; ейныя рукі нікім і нічым не кіравалі, музыка рухалася неяк сама па сабе, і адзінаю праяваю творчай волі быў дзіўны танец дрогкіх,

няўпэўненых пальцаў пад гукі Моцарта і Бэтховэна. І гэтая бездапаможная кабета ганарліва называлася ў анонсе *„адным з праслаўленых дырыжораў XX стагодзьдзя“*, побач з Караянам і Стакоўскім! А да таго ж — „першай жанчынай-дырыжорам“, хоць менчукі цудоўна ведаюць, што наша Тацяна Каламійцава — калярытны опэрны дырыжор — распачала сваю кар’еру гадоў на 10 раней. Разам з Дударавай прыехалі правінцыйнага ўзроўню вакалісты з *Большого театра*. Адзіным сьветлым праменьчыкам ва ўсім гэтым паноптыкуме быў 20-гадовы скрыпач Ягор Грачышнікаў (дзе ён цяпер?). Мо ягоная йгра зрабіла на мяне аж такое ўражаньне, бо *такога* скрыпача ў нас у Беларусі пакуль што няма? Былі калісьці Раман Нодэль і Леў Гарэлік, але гэта асобная гісторыя. Застаецца толькі чакаць, калі падрасьце Алег Яцына — зараз ён вучань 9-е клясы. Дарэчы, калі ўжо казаць пра рознага кшталту „дні“, дык прыгадваецца незабыўны „гранд-канцэрт опэрных сьпевакоў і артыстаў балету Ўкраіны“, што адбыўся ў рамках самых апошніх Дзён культуры і мастацтва Ўкраіны ў лютым 1995-га. Найяскравейшаю прыкметаю гэтага вечару быў… мікрафон, што ганарліва высіўся каля рампы ў атачэньні сваіх радыйных братоў. І гэта не на стадыёне і нават не ў Палацы спорту, а ў памяшканьні опэрнага тэатру, якое штодня без асаблівых праблемаў агучваецца нашымі сьпевакамі! „Навошта мікрафоны?“ — запыталася я ў тэатральнага гукарэжысэра, які наладжваў усю гэтую гаспадарку. „Украінцы баяліся, што ў нашай залі не прагучаць“. Так што канцэрт нагадваў паказальны выступ байдарачнікаў з маторчыкамі пад днішчам. Але бывае й горш. У рамках таго самага фэстывалю „Менская вясна-1998“, дзе блішчэла апошнім разам сямейства Архіпавай, адбыўся міні-фэст „Салісты Вены — дзецям Беларусі“. Ня ведаю, колькі грошай для беларускіх дзяцей удалося сабраць пад час гэтага фэсту (агульным меркаваньнем, даляраў 20), але „салісты“ — дзьве ўсьмешлівыя дамы неакрэсьленага веку (калі верыць біяграфічнай даведцы, адна зь іх даўно ўжо на пэнсіі), апранутыя ў крыклівыя сукні, — магчыма, калісьці й жылі ў Вене. Аднак публіка з канцэрту разьбягалася ўва ўсе бакі. Ды яе і ад пачатку было нямнога. Людзям сьмяротна абрыдлі амэрыканскія мэца-сапрана ў бліскучых блюзонах і штоніках з штучнае скуры, што сьпяваюць антыфашысцкія зонгі ў суправаджэньні камэрнага аркестру (21 лютага 1995 году),

нарвэскія настаўнікі, што практыкуюцца ў дырыжаваньні, выкарыстоўваючы беларускія аркестры ў якасьці паддосьледных трусоў (28 лістапада 1991 году); дочкі ўплывовых расейскіх імпрэсарыё (28 лютага 1997 году); юныя скрыпачы нібыта з Аўстрыі, а напраўдзе з Расеі, што прыяжджаюць да нас пайграць па нотах канцэрт Сыбэліюса (31 студзеня 1997 году, акурат у 200-годзьдзе з дня нараджэньня Франца Шубэрта); і ўсе незьлічоныя дылетанты, што папросту акупавалі беларускую філярмонію пачынаючы з 1991 году. Адзін з тагачасных філярманічных начальнікаў цалкам шчыра мне прызнаўся, што „многія з гэтых людзёў гатовыя плаціць добрыя грошы, абы толькі тут выступіць“. А чаго толькі ня зробіць кіраўнік філярміоніі, каб падкарміць згаладнелыя мясцовыя калектывы ды прыкупіць пару-тройку трамбонаў для сымфанічнага аркестру?!
Менская публіка спазнала за апошнія гады і вартую жалю ігру сьмяротна хворага Рыхтэра, і безгалосасьць састарэлай Кабалье, і камэрцыйныя патугі Сьпівакова, які дайшоў ужо да таго, што сфатаграфаваўся з голым торсам і скрыпкаю ў руках для каляровае вокладкі маскоўскага часопіса *Огонёк*. Марнасьць! Чыстая марнасьць! Нават дзівуешся, чаму апошнім часам шырокі паток гэткіх малакаштоўных рэчываў перасох. Ці мо ветры ў нашым сьвеце перамяніліся?

Марозаў, Смольскі, Сергіеня
Адзінае, што цешыць, — амаль заўжды, як паслухаеш сярэднестатыстычнага замежнага гастралёра, філярманічнага ці опэрнага, — з глоткі сам сабою вылятае пераможны вокліч: „Нашы лепшыя!“ І якое ж гэта цудоўнае слоўца — „нашы“! Слоўца спартовых заўзятараў, поўнае жывога азарту „хварэньня“, неабыякавасьці і запалу вясёлай барацьбы, якая заўжды застаецца гульнёй, барацьбой на жыцьцё, а не на сьмерць. Слоўца, якое ляжыць зусім у іншай сэнсавай плоскасьці, чым словазлучэньне „сьвятарная карова“. Нашы — гэта тыя, хто аж да сёньня, нягледзячы ні на што, пачуваецца арганічнаю часткаю нашае культуры — але, магчыма, заўтра ці пасьлязаўтра зьнікне зь яе назаўсёды. Як зьнік кудысьці ў Нямеччыну піяніст Зьміцер Марозаў. У яго была процьма ляўрэацкіх тытулаў; а ў жніўні 1992 году ён першым з нашых маладых музыкаў дастаўся на конкурс у ЗША. У той час нават

самая паездка ў Злучаныя Штаты здавалася чымсьці неверагодным — як у царства мёртвых ці на іншы бок Месяца. У слаўным горадзе Сіэтле 18-гадовы выпускнік ліцэю здабыў першую прэмію і свой чарговы залаты мэдаль.
Тады ж ён паступіў у Маскоўскую кансэрваторыю; на той час гэткая стратэгія ў пабудове кар'еры яшчэ здавалася адзінай магчымай і цалкам натуральнай. Марозаў быў першы, хто паставіў яе пад сумнеў. Ён рашыўся на нетрадыцыйны крок: ніхто да яго не рызыкаваў пайсьці з Маскоўскай кансэрваторыі *добраахвотна*. Са словаў Зьмітра, ягоны побыт у Маскве „нельга нават назваць навучаньнем, гэта была экскурсія". Мара адляцела, як дым, і сталася відавочным, што сапраўдны ўзровень Маскоўскай кансэрваторыі зьневажальна нізкі. Марозаў зразумеў: у Менску, у свайго даўняга прафэсара Валянціны Рахленкі, ён атрымае непараўнальна болей у сэнсе сьцісла прафэсійным, чымся ў хвалёнага маскоўскага Кастэльскага. Пасьля Масквы Марозаў нават нібыта стаў патрыётам, узяўся з энтузіязмам выконваць творы беларускіх кампазытараў (у прыватнасьці, спэцыяльна для яго быў напісаны скандальна вядомы фартэпіянны канцэрт Зьмітра Смольскага з дакладнымі цытатамі з музыкі Бэтховэна, Шапэна, Чайкоўскага й Расіні). Марозаў сарамліва прызнаваўся, што ня мысьліць сябе нідзе, акрамя Беларусі, што хоча працаваць для сваёй культуры і што ягоныя нямецкія сябры дарагія яму толькі таму, што размаўляюць па-расейску (!) як на сваёй роднай мове. Але ў 1996 годзе ён пакінуў Беларусь. Цяпер ён у Кёльне, і вельмі цікава, што дарагога ён знаходзіць цяпер у сваіх нямецкіх сябрах. Ці езьдзіць ён на конкурсы, ці іграе канцэрты?
Бо пераважная большасьць менчукоў, што зьехалі ў Нямеччыну, адно ганяюць на роварах па ўтульных тамтэйшых вуліцах і даюць прыватныя ўрокі.
Мо такі ж лёс чакае й Цімура Сергіеню, што зьехаў туды зусім нядаўна? Аднак Сергіеня, прынамсі, заўжды быў шчырым у сваім імкненьні на Захад. Сябраваў з скрыпачом Міхаілам Бязьверхнім, колішнім ляўрэатам першай прэміі конкурсу імя каралевы Элізабэты, і ягонай жонкай Вольгай, колішняй скрыпачкаю ў камэрным аркестры Рэспублікі Беларусь, якая часам нават выступала з сольнымі канцэртамі. Бязьверхні таксама калісьці прыяжджаў з канцэртамі ў Менск, але ўжо

доўгі час працуе ў Бэльгіі аўтамэханікам. Калі цяпер ён зрэдку іграе, Вольга абавязкова акампануе яму на раялі. Здаецца, Цімур Сергіеня таксама браў удзел у гэтых імпрэзах.
Шкада, што ў нашым культурным ляндшафце ўзьнікла чарговая дзіра. Бо на чацьвертым дзясятку Сергіеня, нарэшце, паказаў сябе дыхтоўным музыкантам, а добрым піяністам ён быў заўсёды. Ніхто і ніколі не чакаў, што школьны двоечнік і чэмпіён па кунг-фу будзе выдатна, па-філязофску, іграць позьняга Бэтховэна. (Прытым што кунг-фу да апошняга часу было для Цімура галоўнай крыніцай заробкаў.) Адна з найцудоўнейшых музычных падзеяў апошніх гадоў — Першы канцэрт Чайкоўскага ў ягоным выкананьні. Дырыжаваў Віктар Собалеў (13 жніўня 1996 году). Праўда, ня быў Сергіеня ні ляўрэатам, ні нават дыплямантам міжнародных конкурсаў. Ён удзельнічаў у конкурсах толькі двойчы (затое ў самых амбітных: імя каралевы Элізабэты ў Брусэлі і імя Шапэна ў Варшаве) і ні разу далей другога этапу не сягнуў.
Зьнікаюць людзі… А дзірка ў ляндшафце хутка зарастае ілюзіямі. Аматарам музыкі мроіцца квітнеючы музычны рай, у якім усе жывуць разам: тутэйшыя артысты і тыя, што зьехалі назаўжды. І ў гэтых мройных снох менавіта эмігранты — ці на Ўсход, ці на Захад — увасабляюць усе тыя таленты й магчымасьці, якіх нам нібыта не стае і па якіх мы сумуем. На жаль, хвароба ілюзорнае любові хутка вылечваецца — дастаткова палкаму аматару хаця б аднойчы сустрэцца з аб'ектам свайго абагаўленьня і паслухаць яго жыўцом.

Дэдзік, Шупеніч, Гулегіна, Сухін

Яшчэ памятаюць старажылы опэрнага закулісься, які адчай ахапіў нашу музычную грамадзкасьць дзесьці пры канцы 1980-х, калі наш найлепшы тагачасны тэнар Аляксандр Дэдзік нацэліў у Санкт-Пецярбург (тады шчэ Ленінград). Страсьці хутка суцішыліся, калі з паўночнага ўсходу сталі даходзіць весткі пра тое, што былая славутасьць замацавалася ў Марыінскім тэатры на трэціх ролях, накшталт масьё Трыке. Зрэшты, акурат за масьё Дэдзік атрымаў ганаровы тытул народнага артыста Расеі.
Праз пару год ён наведаў нас, каб удзельнічаць у канцэртным выкананьні вэрдзіеўскага „Рыгалета". Нашыя сьпявалі па-расейску, а ён — па-італьянску; нашыя сьпявалі на памяць, а ён

увесь час неадрыўна глядзеў у ноты. Уяўляеце сабе песеньку Герцага (*La donna u mobile, qual pium' al vento…*), сьпяваную ў акулярах, без адрыву ад нотаў, і да таго ж яшчэ й фальшыва? Праз пэўны час кіраўніцтва опэрнага тэатру — відаць, пад уплывам постсавецкае настальгіі — запрасіла Дэдзіка на гастрольны выступ у „Тосцы". Тым разам усё было наадварот: нашыя сьпявалі па-італьянску, а Дэдзік — па-расейску. Але якасьць ягонага сьпеву была ня лепшай; на вакальным жаргоне гэта называецца „дзьмухаць у адну ноздру"… Аднак які ж ён трапны, той вакальны жаргон!

А неўзабаве Дэдзік стаў прыяжджаць нават на тэнаравыя фэсты сп.Галкоўскага… І пасьля гэтага ён ужо надаваўся хіба толькі для затыканьня дзюрак пад час гастроляў Беларускай Опэры ў Гішпаніі.

А як лямантаваў увесь горад, калі ад'яжджаў Янка Шупеніч! Сапраўдны гадаванец Беларусі, пінчук, абаяльны тэнар, які, нягледзячы на маладосьць, сьпяваў амаль увесь бягучы рэпэртуар опэры. У 1991 годзе ён паехаў вучыцца ў Італію — выпраўляць вакальныя хібы, якія ён нібыта набыў у клясе нашага славутага прафэсара Леаніда Івашкова. Ці, як гэта называецца ў народзе, — „па кроплі выціскаць зь сябе вараб'я". Усе неяк адчувалі, што назад ён ня вернецца. Дый праўда, ён уладкаваўся дзесьці ў Славаччыне і зараз быццам бы выяжджае на спэктаклі ў Аўстрыю і нават Нямеччыну.

Аднойчы яго запрасілі прасьпяваць у нас прэм'еру „Рыгалета". І што? Ды тое ж, што заўжды. „Чаму ён навучыўся ў той Італіі?" — дзівіліся знаўцы. Насамрэч, „баранчык" у ягоным голасе ня тое што не паменшыўся, а нават узрос да такой ступені, што зь яго (з баранчыка) можна было б згатаваць дасканалы плоў. З таго часу лёс Шупеніча ў Беларускай Опэры стаўся акурат такі, як лёс Дэдзіка, — для затыканьня дзюрак.

Падобных прыкладаў — бездань; апошні ў часе — Натальля Кастэнка.

І нават прыезд сусьветна славутай Марыі Гулегінай у пэўным сэнсе аказаўся расчараваньнем. Увесну 1992 году ў Беларускай Опэры яна давала свой першы пасьля разьвітаньня зь Менскам і аж дагэтуль апошні (хоць філярмонія штогод жывіць нас абяцанкамі-цацанкамі) сольны канцэрт. За дырыжорскім пультам стаяў Генадзь Праваторaў — адзіны дырыжор, зь якім яна згадзілася выступаць; калісьці ён быў таксама адзіным, хто

ў крытычны момант аказаў ёй падтрымку. Зрэшты, неўзабаве ён стаў такім жа выгнаньнікам з Опэры, як і Марыя; толькі яна — выгнаньніца ў замежжа, а Праваторaў быў урачыста высланы на пасаду галоўнага дырыжора духавога аркестру „Няміга“. Заля была поўная да краёў; прысутнічаў нават Станіслаў Шушкевіч; усе чакалі на нешта нечуванае і незвычайнае. Аднак ці мо менскае надвор’е сыграла злы жарт з прыежджаю пяюльляю, ці мо вірус безнадзейнасьці, які здаўна носіцца ў тутэйшым паветры… Сьпявала яна зусім ня так, як мы спадзяваліся. Але гэта была *нашая* Гулегіна, прынамсі *ілюзорна* нашая…

У савецкі час быў такі ўсенародны звычай: не знайшоўшы прытулку ў родным горадзе ці тэатры, сьпевакі шукалі яго празь сьпявацкую біржу, што наладжвалася, наколькі я памятаю, у Сарататве… Ці папросту ехалі на праслухоўваньне ў той ці іншы тэатр, які ім зь нейкае прычыны падабаўся. Беларуская Опэра была прыцягальнай, галоўным чынам, дзякуючы геаграфічнай блізкасьці да заходняй мяжы і абедзьвюх сталіцаў Расеі. Так у яе траплялі вельмі цікавыя, таленавітыя людзі, якім у расейскіх сталіцах не было месца. Напрыклад, легендарны Аскольд Сухін — выпускнік Малдаўскай кансэрваторыі, дасканалы бас і ня менш дасканалы актор — менавіта так распавядаюць пра яго вэтэраны глядзельнае залі. Менавіта яму належыць фантастычнае на той час дасягненьне: у 1968 годзе, прабіўшыся празь церні ўсесаюзнага адбору, ён стаўся ляўрэатам першай прэміі Міжнароднага конкурсу вакалістаў у Сафіі. Але гэта ніяк не зьмяніла ягонага лёсу: глухая слава правінцыйнага артыста, багемная галеча, гарэлка, сьмерць. Наступнай фігурай гэткага ж памеру і кшталту была Гулегіна, аднак ейны лёс склаўся зусім іначай. Я вельмі добра памятаю, як яна пасьля заканчэньня Адэскай кансэрваторыі (1983 год) праслухоўвалася ў нашым опэрным. Чарнявая, худая, адчайная — суцэльны змрок і сполахі агню — яна сьпявала з акампанэмэнтам фартэпіяна арыю Тоскі. Мы з матуляй „хварэлі“ з-за кулісаў, але за іншую сьпявачку. На шчасьце, мастацкая рада выбрала Гулегіну (тады ейнае прозьвішча шчэ было Мурадзян). Зрэшты, кіраўніцтва тэатру зусім не сьпяшалася даваць ёй найлепшыя ролі; напачатку ёй прыйшлося задаволіцца Другім Хлопчыкам у „Зачараванай

жалейцы“. Як раптам — першая прэмія на ўсесаюзным конкурсе, а неўзабаве — трэцяя прэмія ў Рыё-дэ-Жанэйра. Людзі ў белых штанах, затаіўшы подых, слухалі, як яна сьпявае Аіду!

Прайшоў яшчэ год, і яна атрымала трэцюю прэмію ў Маскве, на конкурсе імя Чайкоўскага. Здавалася б, вялікае шчасьце! Але пад час урачыстае цырымоніі ганарлівая Гулегіна-Мурадзян нават не працягнула рукі „сьвятарнай карове №1“ Ірыне Архіпавай — маладая сьпявачка цьвёрда лічыла, што заслугоўвае Гран-пры. Выпадак беспрэцэдэнтны на савецкай прасторы! Гулегіна мо першай і адзінай з нашых сьпявачак зразумела, што быць прымадоннаю ў Менску ня менш пачэсна, чым у Маскве, і не гублялася ў прысутнасьці імпэрскіх сьвятарных жывёл. Яна ўжо мела дастатковы тыл у беларускай опэры: партыі Іяланты, Тацяны, Элізабэты ў опэры Вэрдзі „Дон Карлас“, Аіды, Разіны…

Неўзабаве тэатр *Arena di Verona* стаў шукаць сьпявачку з моцным і добра выпрацаваным голасам для выкананьня партыі Абігайль у опэры Вэрдзі „Набука“. Дзякуючы конкурсам імя Гулегінай было ўжо вядомым, і яе запрасілі ўдзельнічаць у той пастаноўцы. Уявіце сабе сцэну: італьянскі імпрэсарыё тэлефануе да прымадонны ў інтэрнат. А на іншым канцы дроту — інтэрнатаўская вахцёрка, што ня ведае аніякай мовы і ня можа ўцяміць, чаго ад яе хочуць. Пра гэтую гісторыю ўведала начальства, і сьпявачцы далі кватэру ў белым доме на беразе Сьвіслачы. Тут бы жыць ёй у Менску ды жыць…

Аднак пасьля „Набука“ быў „Баль-маскарад“ — у *Arena di Verona* на італьянскай мове, а ў Беларускай Опэры, зразумела, на расейскай. Ну, а Гулегіна ня мела ні найменшага намеру трымаць у галаве абодва варыянты і адмовілася сьпяваць па-расейску. Выбухнуў канфлікт, у выніку якога яна зьехала назаўсёды; хаця й захавала кватэру й беларускае грамадзянства. У 27 гадоў яна дэбютавала ў мілянскім тэатры *La Scala* — у тым самым тэатры, куды менчукі не маглі трапіць нават у якасьці гледачоў. Потым надышла чарга лёнданскага *Covent Garden* — тут яна сьпявала ў „Тосцы“ разам з Плясыда Дамінга. Назаўтра ж лёнданская крытыка прызнала яе „найлепшай Тоскай плянэты“, а кіраўніцтва тэатру падаравала сукенку, у якой выступала Марыя Калас.

І, нарэшце, прыйшоў ейны „зорны час“ — дзень сьв.Сыльвэстра

1997 году. Па традыцыі, у гэты дзень — 7 сьнежня — тэатр *La Scala* адкрывае сэзон. Тым разам ён распачынаўся прэм'ерай опэры Вэрдзі „Макбэт". У галоўных ролях — найзнакаміцейшыя сьпевакі сусьветнай опэрнай сцэны: Рэната Брузон, Рабэрта Аланья, Марыя Гулегіна (якой дасталася надзвычай складаная для выкананьня партыя лэдзі Макбэт). Гэта было сьвята для вуха, вока і сэрца! Адзінае, што непрыемна зьдзівіла пад час трансьляцыі спэктаклю на расейскім канале „Культура", — што Сьвятаслаў Бэлза назваў Марыю „расейскай сьпявачкай". Хаця ні паводле крыві, ні паводле духу, ні паводле пашпарту, адукацыі, жыхарства яна ніколі не была расейскай.

Пабачыўшы той спэктакль, многія менчукі сталі меркаваць, як было б цудоўна, калі б Гулегіна засталася ў Менску.

Ці каб застаўся піяніст Леанід Кузьмін (таксама нібыта славутасьць). Ці аркестранты з розных нашых калектываў, якія ў апошнія 8—10 год з шалёнаю хуткасьцю разьляталіся па сьвеце. Маўляў, калі б гэтыя людзі заставаліся на месцы, дык наш філярманічны аркестр (ці, на афіцыйнай мове — Дзяржаўны акадэмічны сымфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь) іграў бы болей прыстойна.

Такая вось чарговая ілюзія — быццам мы ўвесь час нешта губляем, і праз гэтыя страты ўзьнікае культурны заняпад. Але ці гэта праўда? Так, эміграцыя — гэта заўжды страта, у тым ліку і для тых, хто застаецца на месцы; страта сяброў, страта нейкіх асабістых колераў у палітры мастацкага жыцьця. Аднак, шчыра кажучы, за апошнія гады сымфанічны аркестр ня стаў іграць ані лепш, ані горш. Як не зьмяніўся і аркестр Опэры, хаця там працэс прымусовага аднаўленьня ідзе нават хутчэй. Я маю на ўвазе, што аркестр Опэры па-ранейшаму слухаць прыемна, а вось у філярмоніі больш ці менш далікатныя вушы заўжды пакутуюць, хаця самі музыканты гэтага й не заўважаюць. У стварэньні прыемных ілюзіяў ім надта дапамагае Беларускае тэлебачаньне, бо запісы канцэртаў сталіся ў нас рэдкасьцю. А калі запіс усё-ткі адбываецца, дык музыканты, пабачыўшы сябе ў тэлевізары, не даюць яму веры. „Бач, Насьця, — кажа адна аркестрантка другой, — у тэлевізары я атрымалася брунэткай, а я ж напярэдадні пафарбавалася ў каштанавы колер. А што яны робяць з гукам — гэта ўвогуле нешта неверагоднае! Суцэльны фальш!" —

„Так, нават музыку прызнаць немагчыма. Ды якія ў іх гукарэжысэры — адны дылетанты!“
І няўцям бедным дзяўчатам, што наракаць на люстра — справа няўдзячная і цалкам безвыніковая.

Кузьміны, Цырук, Алоўнікаў
Дарэчы, Кузьміных было двое — два браты. Старэйшы зь іх — Аляксандр, якога ў нас ужо мала хто памятае, — быў першым зь беларускіх піяністычных вундэркіндаў, хто здабыў перамогу на міжнародным дзіцячым конкурсе „Канцэртына Прага“. Пазьней ён скончыў Маскоўскую кансэрваторыю, потым — асыстэнтуру-стаж… І атрымаў усе тыя „даброты“, якія здабывалі сабе нашыя хлапцы і дзяўчаты, што ехалі ў Маскву па славу й тытул. Ані кватэры ў Маскве, ані кар’еры, ані нават ляўрэацтва — толькі горыч на донцы душы. Нічога дзіўнага, што большасьць зь іх сарамліва ўцякала ў далёкія краіны — з надзеяй даваць там прыватныя лекцыі ці проста жыць.
Так здарылася і з Аляксандрам Кузьміным. Калі ён атрымаў разьмеркаваньне на пасаду пэдагога ў Гомельскай музвучэльні, бацькі рашылі кожнай цаной ратаваць яго ад такога лёсу. Быў пачатак ці нават сярэдзіна 1980-х — самы пік габрэйскай эміграцыі. А бацька Кузьміных быў, як аказалася, зусім і не Кузьміным (ягонага праўдзівага прозьвішча я аж дагэтуль ня ведаю). Гэткім чынам сям’я Кузьміных трапіла ў Нью-Ёрк. Там Аляксандр адразу ж паступіў у славутую Джульярдзкую школу, выйграў запар цэлых шэсьць найпрэстыжнейшых конкурсаў (у тым ліку ў Манрэалі і ў Тэль-Авіве), і, здавалася, ягонае жыцьцё магло пайсьці іначай, чым у звычайных ахвяраў „маскоўскай ліхаманкі“… Але вірус безнадзейнасьці ўжо крэпка засеў у ягоным арганізьме і незаўважна рабіў сваю справу. Цяпер Аляксандр Кузьмін пасьпяхова гандлюе кампутарамі.
Затое ягоны малодшы брат, Леанід Кузьмін, стаў-ткі ў Амэрыцы гастралюючым піяністам. Ён пакінуў Беларусь, не пасьпеўшы нават скончыць музычны ліцэй пры Беларускай акадэміі музыкі, — непаслухмяны, яршысты хлопчык, зь якім школьныя настаўнікі ня ведалі, што рабіць. У Нью-Ёрку ён працаваў таксістам, у Джульярдзкую школу яго не прынялі, іграць на раялі ён не хацеў… Але патроху-патроху… Ён здабыў прэмію на Міжнародным конкурсе імя Бартака-Ліста ў Будапэшце, запісаў пару кампакт-дыскаў… Тры гады запар

ягоныя менскія сябры дамагаліся, каб кіраўніцтва філярмоніі запрасіла Кузьміна выступіць з сольным канцэртам, і нарэшце перамога аказалася на іхным баку.
Першы ж выступ няўрымсьлівага амэрыканца ў траўні 1995 году стаўся сапраўдным трыюмфам, хаця публікі ў той вечар сабралася зусім нямнога. Кузьмін іграў п'есы Ліста. Зрэшты, яшчэ ў школьныя гады ён дэманстраваў выдатную віртуознасьць, якая на той час здавалася нейкім дзівам. Сёньня многія менчукі так іграюць, але яшчэ нядаўна тэхнічная спраўнасьць выканаўцы рабіла на нашых слухачоў неадольнае ўражаньне. Эфэкт быў агромністы. Назаўтра прэса дружна лямантавала, якія таленты губляе Беларусь у выніку бескантрольнай эміграцыі.
Аднак ужо ў наступны, лістападаўскі прыезд Кузьміна той лямант прыкметна сьціхнуў. Публіка ліхаманкава чакала нечага незвычайнага, праграму канцэрту трымалі ў таямніцы, у філярманічнай залі народ хіба што не вісеў на жырандолях… І гэта нягледзячы на скандал, што стаўся напярэдадні, пад час урачыстага адкрыцьця чарговага фэстывалю „Беларуская музычная восень". У той вечар Кузьмін мусіў іграць з аркестрам Пяты канцэрт Бэтховэна; за дырыжорскім пультам стаяў ягоны колішні аднаклясьнік Вячаслаў Чарнуха. У залі сядзела найлепшая, рафінаваная публіка, стаялі камэры тэлебачаньня. Ужо першыя такты бэтховэнскага канцэрту ўвагналі публіку ў стан, падобны да лёгкага трансу. А неўзабаве ў выніку чарговай памылкі Кузьміна між салістам і аркестрам запанаваў хаос, зь якога Чарнуха ніяк ня мог выблукацца. Тады музыка спынілася, і, пад наглядам добрай тысячы слухачоў і трох тэлекамэраў, два таварышы дзесяць хвілін дыскутавалі з нотамі ў руках, абмяркоўваючы, што здарылася і зь якога месца трэба пачаць.
У параўнаньні з тым скандалам няўдалы *Klavierabend*, што адбыўся назаўтра, здаваўся ўжо драбніцай. Народу сабралося багата; паўсюль адчувалася вялізная нецярплівасьць; спадзяваліся, што Кузьмін неяк сябе рэабілітуе. Чакаць прыйшлося даволі доўга: піяніст выйшаў на сцэну са спазьненьнем на 20 хвілінаў і зайграў… усё тыя ж п'есы Ліста. Нашы мэляманы былі амаль у шоку: спадзяваліся на нешта навюткае і сьвежае, як подых далёкага акіяну. А ім прапанавалі б/у, ды ў дадатак сыгранае без належнага бляску.

Раніцой уся менская прэса пыталася, што сталася з Кузьміным? Куды падзеўся яго фэнамэнальны бляск, ягоная віртуознасьць? Вірус безнадзейнасьці часам разьбівае нават самых моцных і таленавітых...

А менавіта гэткія людзі, як атлянты, і ўтрымліваюць на сваіх плячах увесь цяжар нашае культуры. Піяніст Ігар Алоўнікаў — адзін зь нямногіх беларускіх „акадэмічных“ музыкантаў, хто, скончыўшы Маскоўскую кансэрваторыю, здолеў вызваліцца ад ейнае атруты і навучыўся служыць адно Недасяжнай Дасканаласьці. Колькі цудоўных імгненьняў сапраўднае музыкі ён падарыў нам за апошнія 20 гадоў!

Хіба можна забыць, як Алоўнікаў выратаваў сымфанічны канцэрт 13 кастрычніка 1991 году? У Беларускай філярмоніі чакалі Сьвятлану Навасардзян — выдатную армянскую піяністку, якая ня ўпісвалася ў маскоўскія схемы і таму (як і Алоўнікаў) не зрабіла гучнае ўсесаюзнае ці сусьветнае кар’еры. У праграме быў Бэтховэн; дырыжаваць мусіў Юры Цырук — адзін з найцікавейшых музыкаў, якія калі-любя працавалі ў Менску. На працягу многіх гадоў ён быў галоўным дырыжорам Менскага камэрнага аркестру і рабіў зь ім дасканалыя рэчы — як, напрыклад, грандыёзны цыкль з усіх 28 фартэпіянных канцэртаў Моцарта. Цырук быў улюбёнцам Рыхтэра, і з гэтай нагоды Менскі камэрны аркестр даволі рэгулярна атрымоўваў запрашэньні ў Маскву на элітарныя фэстывалі.

Аднак у 1991 годзе Цырук быў ужо ня той; ён гінуў ад цырозу, у яго дрыжалі рукі, а апошні цьвік у ягоную труну былі забілі музыканты ягонага ж Менскага камэрнага аркестру (цяпер ён называецца больш салідна: Дзяржаўны камэрны аркестр Беларусі), якія яго выкінулі. Кажуць, адна з музыкантак нешта там фатаграфавала скрозь замочную шчыліну, а потым занесла здымак ці то ў Мінкульт, ці то ў ЦК. Праз 10 год гэтая ж музыкантка пад час юбілейнага канцэрту выконвала штосьці „памяці Цырука“... Так ці іначай, але Цырука скіравалі ў вечную ссылку — трэцім дырыжорам сымфанічнага аркестру.

І вось, гэтага няшчаснага, зьнішчанага, хворага чалавека напаткала чарговая непрыемнасьць: літаральна ў апошнюю хвіліну Сьвятлана Навасардзян паведаміла, што не прыедзе. Магчыма, чытач памятае, які гэта быў час: у Арменіі заваруха, самалёты то лёталі, то не, атмасфэра ненадзейнасьці й жаху... Што рабіць? Цырук з маланкавай хуткасьцю затэлефанаваў

Алоўнікаву: „Ігар, ты не сыграеш з намі Пяты канцэрт Бэтховэна?“ — „Пятага канцэрту я ніколі не іграў, а вось Трэці крыху разьбіраў у кансэрваторыі. Колькі дзён засталося да канцэрту?“ — „Тры“. — „Нармалёва. Мо пасьпею вывучыць, каб сыграць хаця б па нотах...“ На канцэрце ён іграў на памяць, ды як іграў! Болей за тое — ён у значнай ступені ўзяў на сябе кіраўніцтва аркестрам, бо Цырук увесь час „губляў ніць“ і відавочна не спраўляўся з сваёй задачай.
А хіба можна забыць фартэпіянны „матч у адны вароты“, калі на адной палове поля — прабачце, у першым аддзяленьні — іграў маскоўскі прафэсар, народны артыст СССР і двойчы ляўрэат Леў Уласенка, а ў другім аддзяленьні — Алоўнікаў? (Тут трэба дадаць, што ў свой час Уласенка быў прызначаны на ролю пераможцы Першага міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага, але нечакана для „партыі і ўраду“ там зьявіўся Вэн Клайбэрн.) Пакуль іграў Уласенка, публіка мірна спала; і раптам усе, як адзін, прачнуліся. Іх абудзіў першы гук „Карцінак з выстаўкі“, што паўставалі пад пальцамі Алоўнікава так маляўніча і падрабязна, быццам на нашых вачах нараджаўся цэлы сьвет жывых постацяў.
А неўзабаве менавіта Алоўнікаў як адзін з энтузіястаў „Беларускай капэлы“ адкрыў нам сапраўдны твар Міхала Клеафаса Агінскага… І аднак жа нават на Алоўнікава часам нападае вірус безнадзейнасьці, так што ягоную ігру немагчыма пазнаць — столькі ў ёй тады нядбалае, рыхлае млявасьці.

Палішчук, Скорабагатаў, Байдаў

A propos „Беларускай капэлы“ — мо не існуючай юрыдычна, але дзейснай і існай — мне заўсёды шкада, што там вельмі мала *па-сапраўднаму* добрых сьпевакоў. Канечне, Рыгор Палішчук зь ягоным нябесным тэнарам; ды на жаль, ён апошнім часам усё часьцей бадзяецца па замежжах. Яшчэ кіраўнік капэлы Віктар Скорабагатаў (зрэшты, каб належна меркаваць пра ягонае мастацтва, мусіш бачыць і чуць яго ў маленькай залі, дзе рэльефна праслухоўваюцца ўсе падрабязнасьці выкананьня). Ці ня дзіўна пры гэтым, што ў справе адраджэньня даўняй беларускае музычна-культурнае традыцыі ўдзельнічаюць толькі *безгалосыя* сьпявачкі?
Аднак капэла моцная сваімі сувязямі з самымі рознымі музыкантамі. Напрыклад, з ансамблем салістаў „Клясык-

авангард“, хоць у апошнія гады гэты калектыў нешта страціў з свайго ранейшага бляску. Ужо ня так чыста й дасканала гучаць струнныя інструмэнты; не стае роўнасьці ў акордах; а галоўнае — няма былой жывасьці і праўдзівай *гульні* ў кожным гуку. І ўсё-ткі „Клясык-авангард“ разам зь ягоным мастацкім кіраўніком Уладзімерам Байдавым — гэта вельмі калярытнае ўпрыгажэньне нашага музычнага пэйзажу. Хаця б таму, што „байдаўцы“ частуюць нас рознымі рэпэртуарнымі дзівамі — не заўжды лёгкімі для стравaваньня, але ўва ўсякім разе цікавымі. Я аж дагэтуль памятаю першае і адзінае выкананьне монаопэры Г.Фрыда „Лісты ван Гога“, што адбылося амаль 10 гадоў таму — 29 кастрычніка 1990 году — у „Клюбе сяброў опэры“. Зараз і клюбу таго няма, бо кіраўніцтва опэры занятае зусім іншым. А быў час, калі для „сяброў“ наладжваліся цудоўныя (і цалкам бясплатныя) імпрэзы; па панядзелках у верхнім фае выстаўляліся крэслы, ажываў раяль, гучалі сьпевы і галасы суразмоўцаў. Тэмы для гэтых сустрэч былі самыя розныя: дырыжоры і рэжысэры распавядалі пра будучыя прэм’еры, вакалісты сьпявалі камэрныя праграмы і нізкі рамансаў, адбываліся міні-прэм’еры сучасных опэраў — часам нават у прымітыўных дэкарацыях і строях. Але для пастановак звычайна арандавалі (бясплатна) гасьцёўню ў Палацы мастацтваў і забясьпечвалі „сваіх“ запрашальнымі квіткамі. У такой атмасфэры рабіў свае першыя крокі „Клясык-авангард“. Якім жа чуйным, гнуткім партнэрам ён быў для сьпевакоў, як жа зацікаўлена ён удзельнічаў ува ўсім, што адбывалася на сцэне! Здаецца, сёньня яму гэтага бракуе. Як не стае праўдзівага азарту, зь якім салістка ансамблю Анжэла Жарэга разыгрывала на скрыпцы габрэйскія фрэйлахс зь „Біблійных сцэн“ Віктара Капыцькі.

Красьніцкі, Бліноў, Паначэўны, Сікорскі

Азарт — вось яно, унівэрсальнае зельле, якое абараняе арганізм і ад вірусу безнадзейнасьці, і ад ператварэньня ў „сьвятарную карову“! Вось чаго не стае і нашым слухачам, і нашым музыкантам. Сьпіць сымфанічны аркестр, сьпіць камэрны, і толькі зрэдку які-небудзь жвавенькі дырыжор (зазвычай зусім ня юнага ўзросту) абудзіць музыкантаў ад засонку. Калі няма азарту, публіка сумуе, а музыканты ганяюцца за грошамі, паціху інтрыгуюць.

Азарт — праўдзівы вітамін жыцьця. Інакш нельга вытлумачыць, адкуль гэткі натоўп слухачоў пад час нядаўняга конкурсу „Менск-2000“. Прыгадваецца і леташні фэст, што называўся „Маладыя піяністы — ляўрэаты першых прэміяў“. Тады ў філярмоніі ледзь не абрынуўся балькон. Ігра маладых праменіла радасьцю; хай і сярод іх сустракаліся „сьвятарныя цяляты“, задаволеныя з уяўнае велічы. Аднак увесь посьпех прыпаў на долю азартных паляўнічых за Нядасяжнаю Дасканаласьцю.

Гэты азарт вельмі розны ў сваіх вонкавых праявах. Гульлівы, амаль дзіцячы (ці нават шчанячы), радасны і бліскучы, як брыльянцік, азарт Канстанціна Красьніцкага. Злы і энэргічны, амаль сварлівы азарт Юр’я Блінова. Ніколі не забуду, як аднойчы пад час выкананьня ён лаяўся з дырыжорам Мішам Кацам. Ігралі Першы канцэрт Брамса, філярманічная заля была паўнюткая, тэлекамэры, радыйныя мікрафоны, вялізны аркестр… Маэстра Кац (па мянушцы „фэхтавальшчык“) уявіў сябе капітанам акіянскага судна і імкліва кіраваў яго да непазьбежнай пагібелі. Бліноў іграў і адначасова нешта гаварыў, спрабуючы выратаваць іхны сумесны карабель ад катастрофы. Але дарэмна! Канцэрт разваліўся ўшчэнт. Аднак потым былі й іншыя канцэрты — ужо бяз Каца. Напрыклад, усе дзевяць эцюдаў-карцін Рахманінава. Гэта быў той рэдкі ў нас выпадак, калі Рахманінава ігралі добра і без усякай думкі пра маскоўскага прафэсара Мяржанава — якога, на шчасьце, сёлета не запрасілі нават у журы конкурсу піяністаў. А магутны быў чалавек! Вяршыцель лёсаў!..

Дарэчы, у Мяржанава нейкі час вучыўся адзін з самых азартных і таленавітых нашых піяністаў, Андрэй Сікорскі. Ягоная маскоўская эпапэя скончылася выпрабаваньнямі настолькі цяжкімі, што іх хапіла б на некалькі біяграфіяў. Армейскі дысбат, балючая няўдача на конкурсе Чайкоўскага (праз тры месяцы па вызваленьні з турмы), здрада з боку настаўнікаў, адзін зь якіх — не Мяржанаў, але таксама ўплывовы чалавек — вымагаў ад Сікорскага хабар пасьля ягонай перамогі на конкурсе ў Італіі. Цяпер Андрэй зноў з намі, і толькі шкада, што апошнім часам ён амаль без астачы аддае сваю гарачую душу кансэрваторскім вучням і сябрам, так што слухачам мала чаго дастаецца.

Яшчэ ў нас ёсьць Андрэй Паначэўны — геніяльны піяніст-

лірык, якіх мо няма ў цэлым сьвеце.
Існавала калісьці такая рэч, як „усесаюзны адбор“. Напярэдадні чарговага міжнароднага конкурсу — хай у Брусэлі, хай у Маскве — савецкія культурчыноўнікі наладжвалі праслухоўваньне ўсіх прэтэндэнтаў на ўдзел у спаборніцтве. Неабходнасьць цэнтралізаванага адбору абгрунтоўвалі вельмі проста: дзяржава дае грошы — яна й рашае, каго пасылаць на конкурс (гэткае тлумачэньне мы часта чуем і цяпер). Насамрэч з дапамогаю такое працэдуры дзяржава стварала найлепшыя ўмовы акурат для тых, хто найболей адпавядаў рэклямным крытэрам тагачаснай ідэалёгіі.
Акурат гэткія людзі й атрымлівалі першыя прэміі — і ня толькі ў Маскве, на конкурсе імя Чайкоўскага, дзе журы бездакорна выконвала загады партыі. Мэханізм выцісканьня прэміяў дасканала дзейнічаў і ў Варшаве; ледзь ня ўся пасьляваенная гісторыя тамтэйшага конкурсу імя Шапэна — гэта барацьба паміж двума клянамі ў журы. Часам у гэтай паддывановай барацьбе перамагалі сапраўдныя рыцары музыкі, і тады першую прэмію атрымоўваў Маўрыцыё Паліні ці Марта Аргерых; часам — намэнклятурныя гадаванцы, і тады галоўная ўзнагарода прыпадала якому-небудзь бяздарнаму выхаванцу Маскоўскай кансэрваторыі з Паўночнага Віетнаму. Зрэшты, „жывёлаводы“ заўжды бывалі пераможцамі, бо нават калі ім не ўдавалася здабыць для свайго студэнта галоўны прыз, астатнія прэміі непазьбежна траплялі ў рукі людзей „сваіх“ і „ў дошку савецкіх“. Ну, а тых, хто меў хаця драбінку таленту і мог бы скласьці канкурэнцыю для іхняга выбраньніка, папросту не пускалі ў фінал.
Так сталася ў 1980 годзе з харвацка-амэрыканскім піяністам Іва Пагарэлічам (цяпер ён сусьветная славутасьць). Скандал быў агромністы! Публіка на вуліцах Варшавы наладжвала пікеты і мітынгі, найаўтарытэтнейшыя сябры журы Марта Аргерых і Мікіта Магалоў адразу ж паехалі па дамох… А як жа Васька (г.зн. прафэсар Мяржанаў і ягоныя маскоўскія калегі)? Як заўжды — *слушал да ел*.
Празь пятнаццаць гадоў — ужо ў цалкам новую эпоху — гэткая ж гісторыя паўтарылася акурат з Андрэем Паначэўным. У той год на конкурсе Шапэна ўпершыню пачулі слова „Беларусь“. Двое нашых удзельнікаў — 18-гадовы Паначэўны і больш сталы Цімур Сергіеня — ужо ў першым туры зрабілі ў Варшаве

маленькую сэнсацыю. Паначэўны ўвесь час быў у тройцы лідэраў, якую вызначылі крытыкі варшаўскіх газэт. Але ніхто з гэтай тройкі ня трапіў у фінал. Туды дасталіся зусім іншыя людзі. У прыватнасьці, нехта Аляксей Султанаў, выпускнік Маскоўскай кансэрваторыі, што спэцыялізаваўся ня столькі ў адтварэньні Шапэна, колькі ў выкідваньні розных конікаў. Праз тры гады на конкурсе Чайкоўскага самі ж расейцы не прапусьцілі гэтага чалавека далей адборачнага этапу. Але тут, у Варшаве, Мяржанаў здабыў для яго другую прэмію; першую вырашылі не прысуджаць.

Скандал быў амаль такі ж, як з Пагарэлічам! Хоць у 1995 годзе палякі ўжо крыху развучыліся будаваць барыкады. Пад ціскам публікі і прэсы ўжо пад час цырымоніі ўзнагароджаньня журы абвясьціла новае рашэньне: пяць спэцыяльных прызоў, падмацаваных буйнымі сумамі ў амэрыканскай валюце, „лепшым выканаўцам, якія не прайшлі ў фінал“. Прыкметна, што некаторыя з тых „лепшых“ — як, напрыклад, аргентынец Нэльсан Гёрнэр, італьянец Рабэрта Камінаці і наш Андрэй Паначэўны — неўзабаве сталіся ляўрэатамі найаўтарытэтнейшых конкурсаў Эўропы і Амэрыкі. Дастаткова нагадаць наступныя крокі ў кар’еры Паначэўнага: восень 1996-га — першая прэмія на конкурсе ў Кёльне, лета 1998-га — першая прэмія ў Вашынгтоне, далей выступы ў *Carnegy Hall*… А вось шчасьлівыя фіналісты конкурсу Шапэна, якіх вылучылі спэцыяльна, каб стварыць належны фон для Султанава, так і засталіся са сваёю брыдкаю славаю.

І вы думаеце, пасьля гэтага Паначэўны спрабаваў кудысьці зьехаць на сталае жыхарства? Не, ён жыве ў Менску, шмат гастралюе, галоўным чынам у замежжы, але ягоны нядаўны выступ на шапэнаўскім фэстывалі ў Горадні стаўся ўжо мясцовай легендай. Тамтэйшы раяль увогуле далёкі ад дасканаласьці, а тым разам нешта зрабілася з нотай „до“. Паначэўны адважна распачаў *Opus* 28 Шапэна, які складаецца з 24 прэлюдыяў, але на трэцяй ці чацьвертай кінуў іграць, папрасіў прабачэньня і накіраваўся за кулісы. Праз хвіліну ён зьявіўся з грабянцом у руках і стаў корпацца дзесьці там у нетрах раялю. На паратунак яму прыбег іншы ўдзельнік фэстывалю — Аляксей Пятроў (таксама піяніст), — і хутка раяль зайграў, як новы. Кажуць, што Паначэўны іграў геніяльна нават бяз ноты „до“, а направіўшы раяль, дасягнуў на ім

вышыняў мастацтва. І я цалкам у гэта веру, бо для мяне 24 прэлюдыі ў выкананьні Паначэўнага сталіся адным з наймацнейшых музычных уражаньняў.
І гэты чалавек не здабываецца нават на *паклоны* ўдзячным гледачам! Пад час воплескаў, што стыхійна ўзьнікаюць паміж п'есамі, ён сядзіць ля раялю засяроджаны, адвярнуўшы твар кудысьці ў глыбіню сцэны. Нібы там, над балотнымі выпарэньнямі савецкай мінуўшчыны, над мітусьнёй псэўдаартыстычнага побыту ён бачыць Цудоўнага Бога Музыкі — невідочнага і неадчувальнага, якога нельга назваць словам і выявіць у вобразе, але зразумелага ў духу, — аднаго зь нямногіх багоў, якім варта маліцца. Ці не ў такіх людзях нашая апошняя надзея? Бо музычная культура — гэта ня толькі траўнік, на якім пасьвяцца сьвятарныя каровы, але й нешта непараўнальна большае.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

Уладзімер Роўда Расія і свабода

УЛАДЗІМЕР РОЎДА
палітоляг, кандыдат філязофскіх навук, выканаўчы дырэктар інфармацыйна-аналітычнага аддзелу Асамблеі Нязгодавых Арганізацый Беларусі. Укладальнік кнігі „Да дэмакратыі праз грамадзянскую супольнасьць“ (Шчэцін, 1999).

У 1952 годзе ў Нью-Ёрку выйшла ў сьвет пасьмяротная серыя артыкулаў філёзафа і публіцыста Георгія Фядотава, прысьвечаная лёсу свабоды ў Расіі: „Нараджэньне свабоды“, „Расія і свабода“ і „Лёс імпэрыяў“.
Яны прыцягваюць да сябе ўвагу нетрадыцыйным для расійскіх інтэлектуалаў падыходам аўтара да праблемы суадносінаў лібэралізму і імпэрскай ідэі. Цяпер, калі Расія ў чарговы раз дэманструе сваю адданасьць этатызму і прыносіць у ахвяру вялікадзяржаўніцкай ідэі інтарэсы асобы і, урэшце, лёс расійскай нацыі, аналіз тэкстаў Фядотава, а таксама іншых прысьвечаных пытаньню лёсу свабоды ў Расіі, зноў уяўляе цікавасьць.

1.

У XX ст. Расія тройчы падыходзіла да практычнага зьдзяйсьненьня лібэральна-дэмакратычных вартасьцяў на нацыянальнай глебе і кожны раз адступала ад іх, вяртаючыся да дэспатызму. Першы раз — у часы расійскай рэвалюцыі 1905—1907 г., потым у лютым 1917 г. і нарэшце ў 1991—1993 г. пасьля распаду СССР.

Першая спроба была, бадай, адной з самых пасьпяховых. Абсалютысцкі рэжым пад ціскам зьнізу вымушаны быў пайсьці на стварэньне прадстаўнічых органаў улады, увядзеньне

элемэнтаў парлямэнтарызму і шматпартыйнасьці. Але вельмі хутка ўлады зразумелі, што расійскае грамадзтва не гатовае ўсур'ёз абараняць свабоду, якая была падарункам манархіі, і адабралі яе, зьдзейсьніўшы дзяржаўны пераварот. Другая спроба была задушана ўжо не абсалютызмам, а народам, які падтрымаў бальшавікоў. Пры канцы стагодзьдзя мы сталі сьведкамі трэцяй спробы ператварыць Расію ў дэмакратычную дзяржаву праз радыкальныя эканамічныя і палітычныя рэформы.

У 1991—1993 г. ішла жорсткая барацьба паміж рэфарматарамі, якія кантралявалі выканаўчую ўладу, і кансэрватарамі, што мелі большасьць у Вярхоўным Савеце. Каб замацаваць сваю перавагу і паралізаваць сабатажнікаў, прыхільнікі лібэральных рэформаў прапанавалі такі варыянт новай Канстытуцыі, які даваў велізарныя паўнамоцтвы прэзыдэнту і абмяжоўваў правы вышэйшага заканадаўчага і судовага органаў улады. На рэфэрэндуме ў сьнежні 1993 г. расійскія выбарцы прагаласавалі за гэты праект Асноўнага Закону. Прайшло няшмат часу, і мы ўбачылі, як „дэмакратычная Расія" душыць свабоду ў Чачэніі, з дапамогай найманых забойцаў распраўляецца зь незалежнымі журналістамі, будуе намэнклятурны капіталізм, абапіраючыся на вузкае кола алігархаў.

Сучасныя палітычныя тэхнолягі арганізуюць амаль са стопрацэнтовай дакладнасьцю тое ж самае, што так удала рабілі камуністы ў часы СССР — выбары бяз выбару.

На зьмену двару яго імпэратарскай вялікасьці прыйшла алігархія, якая вырашае амаль усе галоўныя пытаньні кіраваньня велізарнай краінай. Апошнія падзеі не даюць нам падставаў думаць, што ў сыстэме фаварыцтва пры ўсерасійскіх гаспадарох нешта зьмянілася кардынальным чынам пасьля адстаўкі Ельцына з пасады прэзыдэнта і абраньня Пуціна. Г.Фядотаў пісаў, спасылаючыся на расійскіх эўразійцаў, што „Расія арганічна спараджае дэспатызм альбо фашыстоўскую „дэмакратыю" са свайго нацыянальнага духу, альбо свайго геапалітычнага лёсу; больш за тое, у дэспатызьме яна лягчэй за ўсё ажыцьцяўляе сваё гістарычнае прызначэньне". Каб зразумець, ці спраўджваецца гэтая тэза, трэба паглядзець на Расію скрозь культурна-цывілізацыйную прызму. Што ўяўляе сабой гэтая краіна як цывілізацыя, наколькі ідэя свабоды

сумяшчальная з аўтэнтычным „расійскім духам“?

2.

Фядотаў лічыў, што адказ на пытаньне аб лёсе свабоды ў Расіі залежыць ад адказу на пытаньне, ці належыць Расія да кола народаў заходняй культуры — да такой ступені паняцьце гэтай культуры і паняцьце свабоды супадаюць сваім зьместам. Ён падкрэсьліваў супярэчлівыя адносіны, якія гістарычна склаліся паміж Русьсю і Захадам, Русьсю і Ўсходам. „У тысячагадовай гісторыі Расіі існуе ясна выказаная розьніца чатырох формаў асноўнай расійскай тэмы: Захад–Усход. Спачатку ў Кіеве мы бачым Русь, якая свабодна ўспрымае культурныя ўзьдзеяньні Бізантыі, Захаду і Ўсходу. Пэрыяд мангольскага ярма зьяўляецца часам штучнай ізаляцыі і пакутлівага выбару паміж Захадам і Ўсходам (Літва і Арда). Масква ўяўляе сабой дзяржаву і грамадзтва істотна ўсходняга тыпу, якая аднак жа хутка (у XVII ст.) пачынае шукаць збліжэньня з Захадам. Новая эпоха — ад Пятра да Леніна — уяўляе сабой, зразумела, трыюмф заходняй цывілізацыі на тэрыторыі Расійскай Імпэрыі“.

Гэты аналіз падаецца не зусім дакладным. Мы цалкам пагаджаемся з аўтарам у тым, што сярод дзясяткаў нам вядомых цывілізацыяў, зь якіх складаецца некалі ўяўляны адзіным гістарычны працэс, толькі ў адной зь іх мы знаходзім свабоду, і то на апошнім этапе яе існаваньня. Гэта сучасная заходняя цывілізацыя. Але Кіеўская Русь у гэтым кантэксьце ня можа ўспрымацца як нейкае адзінства. „Шматковая Імпэрыя Рурыкавічаў“, як характарызаваў яе Маркс, была сама падзеленая паміж Усходам і Захадам: Полацак, Пскоў, Ноўгарад і Галіцка-Валынскае княства былі і праз эканамічныя сувязі, і праз культуру ў большай ступені тагачасным Захадам, чым Усходам; Кіеў і Чарнігаў мелі шчыльныя сувязі зь Бізантыяй; Уладзімірскае княства і іншыя паўночна-ўсходнія землі ўяўлялі сабой аб’ект славянскай калянізацыі вугра-фінскіх тэрыторыяў і зону значнай культурна-палітычнай экспансіі Хазарскага Каганату, а пасьля цюрцкіх плямёнаў. Фядотаў мае рацыю, калі піша, што дзякуючы незалежнасьці царквы ад дзяржавы на рускіх землях, падзелу ўлады між старажытнарускім князем і баярствам, дружынай, вечам,

сувязям з усходнімі ўскраінамі „лацінскага сьвету“ (Польшчай, Вугоршчынай, Чэхіяй і Нямеччынай), больш важным, чым дачыненьні зь бізантыйскімі аднаверцамі, тут стварыліся ня горшыя ўмовы для разьвіцьця свабоды асобы, чым на Захадзе. Але мы абсалютна ня можам пагадзіцца з тэзай аўтара, што перашкодай на шляху да гэтага стаў „брак разьвіцьця дзяржаўніцкіх пачаткаў, адсутнасьць адзінства“, з-за якога „Свабодная Русь на векі зрабілася нявольніцай і даньніцай манголаў“.

Пад шыльдай „Кіеўская Русь“ існавала не адна дзяржава, а як мінімум 7—8 самастойных дзяржаўных утварэньняў, слаба зьвязаных міжсобку дынастычнымі і царкоўнымі сувязямі. Паколькі і паводле этнічнага складу, і паводле культуры, геапалітычных умоваў, палітычнага ладу яны вельмі адрозьніваліся, абсурдна казаць пра тое, што свабоду магло гарантаваць іхнае аб’яднаньне ў адзіную дзяржаву. Хутчэй, такое аб’яднаньне адбылося б коштам свабоды.

Вельмі цікавая заўвага Фядотава аб тым, што пэрыяд мангольскага ярма зьяўляўся для расійскіх земляў часам пакутлівага выбару паміж Літвой і Ардой. Землі былой Кіеўскай Русі, якія ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, разглядаліся аўтарам у якасьці тых, што зрабілі выбар на карысьць Захаду, нягледзячы на праваслаўнае веравызнаньне большасьці іх жыхароў. Гэты крок стаў першым актам векавога змаганьня дзьвюх цывілізацыяў, у якім ВКЛ, а пазьней Рэч Паспалітая Абодвух Народаў адыгрывалі ролю фарпосту Захаду на ўсходзе Эўропы. Гэтыя дзяржавы сталі прытулкам свабоды, пакуль што вельмі абмежаванай і даступнай толькі для шляхты, але свабоды, а не рабства і тыраніі, носьбітамі якіх зрабілася Вялікае Княства Маскоўскае, якое, пачынаючы з праўленьня Івана III, стала высоўваць прэтэнзіі на ўсе праваслаўныя землі былой Русі, скраўшы для Масковіі сам назоў Русь.

„Двухвекавое татарскае ярмо яшчэ не было канцом рускай свабоды, — адзначае Фядотаў. — Свабода загінула толькі пасьля вызваленьня ад татараў. Толькі маскоўскі цар як пераемнік ханаў мог зьнішчыць усе грамадзкія сілы, якія абмяжоўвалі самаўладзьдзе... Абавязаная сваім узвышэньнем перш за ўсё татарафільскай і здрадніцкай палітыцы сваіх

першых князёў, Масква, дзякуючы ёй, забясьпечвае мір і бясьпеку сваёй тэрыторыі, прыцягвае гэтым працоўнае насельніцтва і пераваблівае да сябе мітрапалітаў… Захопы тэрыторыяў, вераломныя арышты князёў-супернікаў адбываюцца пры падтрымцы царкоўных пагрозаў і інтэрдыктаў. У самой маскоўскай зямлі ўводзяцца татарскія парадкі ў кіраваньні, судзе, зборы даніны. Ня звонку, а знутры татарская стыхія завалодала душой Русі, пратачылася ў цела й кроў. Гэтая духоўная мангольская заваёва ішла паралельна з палітычным падзеньнем Арды…
Само зьбіраньне ўдзелаў адбывалася ўсходнімі мэтадамі, не падобнымі да адначасовага працэсу ліквідацыі заходняга фэўдалізму. Здымаўся ўвесь верхні слой насельніцтва і пераводзіўся ў Маскву. Малыя радзімы згубілі ўвесь гістарычны калярыт, які так упрыгожвае іх паўсюль у Францыі, Нямеччыне і Англіі. Русь пераўтварылася ў суцэльную Масковію, аднастайную тэрыторыю цэнтралізаванай улады: натуральная перадумова дэспатызму. Перамаглі іасіфляне і апрычнікі. Трыюмф партыі Язэпа Валоцкага над вучнямі Ніла Сорскага прывёў да акасьцяненьня духоўнага жыцьця. Перамога апрычніны, новае „дэмакратычнае“ службовае клясы, над родавым дваранствам сымбалізавала барбарызацыю кіраўнічага слою, рост халопскай самасьвядомасьці ў ягоным асяродзьдзі і нават узмацненьне эксплюатацыі працоўнага насельніцтва.
Князь Курбскі, гэты Герцэн XVI ст., са жменькай расійскіх людзей, што ўцяклі з маскоўскай турмы, выратавалі ў Літве сваім пяром, сваёй культурнай працай гонар расійскага імя. Народ быў ня зь імі. Народ не падтрымаў баярства і палюбіў Івана Жахлівага. Прычыны ясныя. Яны заўжды адны і тыя ж, калі народ падтрымлівае дэспатызм супраць свабоды — за Аўгустам і ў нашыя дні: сацыяльныя адрозьненьні і нацыянальны гонар. Народ меў, ведама, падставы адчуваць цяжар залежнасьці ад старых гаспадароў — і ня думаў, што ўлада новых апрычных дваранаў прынясе яму прыгон. І, ужо напэўна, ён быў зачараваны відаляй татарскіх царстваў, што падаюць адно за адным перад царом маскоўскім. Расія, учарашняя даньніца татараў, ператварылася ў вялікую ўсходнюю дзяржаву“.
У гэтых, як бы сказалі прыхільнікі вялікадзяржаўніцкай ідэі, антыпатрыятычных радкох кідаюцца ў вочы тры моманты: *Па-першае*, правядзеньне аўтарам лініі падзелу між азіяцкім

дэспатызмам і эўрапейскай свабодай у XIII—XVI ст. па мяжы Вялікіх Княстваў Літоўскага й Маскоўскага. Расійскі народ аказаўся расколатым паміж гэтымі палітычнымі цэнтрамі і ў выніку атрымаў розныя, калі не процілеглыя, умовы для разьвіцьця культуры і нацыянальнай самасьвядомасьці.
Па-другое, разуменьне Фядотавым таго, што ў тую эпоху свабода датычыла толькі прадстаўнікоў вышэйшых клясаў. Менавіта так ішло разьвіцьцё свабоды на Захадзе — праз існаваньне арыстакратыі. Палітычная свабода, існуючая ў гэтых дзяржавах, паступова мяняла арыстакратычную форму на дэмакратычную.
Другая важная крыніца свабоды на Захадзе — гэта адносная незалежнасьць духоўных уладаў ад сьвецкіх у Сярэднія вякі. Незалежнасьць папы ад носьбітаў сьвецкай улады ў Заходняй Эўропе стварыла падмурак для паўсюднай аўтаноміі духоўных асобаў ад дзяржавы.
Вялікае Княства Літоўскае разьвівалася як і астатнія дзяржавы Эўропы, нават у нечым апераджаючы іх — ад арыстакратыі да дэмакратыі. Аб гэтым сьведчыць і наяўнасьць падзелу ўлады ў краіне паміж соймам, вялікім князем і панамі-радай, судовымі органамі, грамадзянскія правы шляхты, вольнасьці месцьцічаў (Майдэборскае права), рэлігійная талерантнасьць, вяршэнства права (вялікалітоўскі Статут 1588 г).
У Вялікім жа Княстве Маскоўскім баярскія спробы абмежаваць уладу цара праваліліся, а праваслаўная царква ўсё больш ператваралася ў прыслужніцу трону.

„Маскоўскі гаспадар… быў пераемнікам і ханаў-заваёўнікаў, і імпэратараў бізантыйскіх. Царамі называлі на Русі і тых, і іншых. Гэтае злучэньне разнародных ідэяў і сродкаў улады стварыла дэспатызм калі не адзіны, то вельмі рэдкі ў гісторыі. Бізантыйскі імпэратар у прынцыпе магістрат, ён добраахвотна падпарадкоўваўся сваім асабістым законам. Маскоўскі цар хацеў уладарыць над рабамі і не адчуваў сябе зьвязаным законам. Як казаў Іван Жахлівы, „жаловать есмя своих холопов вольны, а и казнить вольны же“. З другога боку, усходняга дэспата ня зьвязвае закон, але зьвязвае традыцыя, асабліва рэлігійная. У Маскве Іван IV і потым Пётра I паказалі, як мала традыцыя абмяжоўвае самаўладзьдзе маскоўскага цара. Царква, якая больш за ўсіх садзейнічала ўзросту і посьпехам царскай улады,

першая за гэта і заплаціла. Мітрапалітаў прызначаў на пасаду фактычна цар, ён жа іх і скідаў з найвялікшай лёгкасьцю. Адзін зь іх, калі ня два, былі забітыя на загад Івана Жахлівага. І ў чыста царкоўных справах, як паказала Ніканаўская рэформа, воля цара была вырашальнай. Калі ён пажадаў зьнішчыць патрыяршаства і ўвесьці ў расійскай Царкве пратэстанцкі сынод, і гэта сышло яму з рук беспакарана“.
Па-трэцяе, важная нам думка аўтара аб сувязі паміж пачуцьцём нацыянальнага гонару расійцаў і вонкавай экспансіяй дзяржавы. Вайсковая магутнасьць, пашырэньне межаў дзяржавы былі тымі фактарамі жыцьця ранейшай Масковіі і сёньняшняй Расіі, якія апраўдвалі і апраўдваюць любы дэспатызм уладаў, у ахвяру якім увесь час прыносяцца свабода і правы чалавека. Прэстыж дзяржавы ў Расіі ніколі не вымяраўся найперш эканамічным ці культурным багацьцем. Галоўнае, каб у яе было моцнае войска і як мага большая тэрыторыя.

3.
Бярдзяеў кажа аб Маскоўскім царстве як аб „*таталітарным* (курсіў наш. — **У.Р.**) *па сваім прынцыпе і стылі, тэакратыі зь перавагай царства над сьвятарствам*“… і далей: „*расійская думка мае схільнасьць да таталітарных вучэньняў і таталітарнага сьветаўспрыманьня. Толькі такога кшталту вучэньні і мелі ў нас посьпех. У гэтым адбілася рэлігійнасьць расійскага народу. Расійская інтэлігенцыя заўсёды імкнулася выпрацаваць у сябе таталітарнае цэльнае сьветаўспрыманьне, у якім праўда-ісьціна будзе злучанай з праўдай-справядлівасьцю*“.
Асабістая залежнасьць у Расійскай дзяржаве насіла ўсеагульны характар. Усе станы былі прывязаныя да дзяржавы службай альбо цяглом. Чалавек вольнай прафэсіі быў немагчымай зьявай для Масквы — калі не лічыць рабаўнікоў. Нават правы баярства не былі абароненыя. Усе пасадзкія людзі былі падпарадкаваныя дзяржаве праз натуральныя павіннасьці, жылі ў падпарадкаванай уладзе арганізацыі, перакідваліся зь месца на месца ў залежнасьці ад дзяржаўных патрэбаў. Прыгон сялянства стаў паўсюднай зьявай якраз у той час, калі на Захадзе ён адміраў. Якія ж галоўныя прычыны гэтага? Галоўная прычына, на думку Фядотава, у тым, што „рабства дыктавалася

не свавольствам уладароў, а новым нацыянальным заданьнем: *стварэньнем імпэрыі* на занядбанай эканамічнай базе. Толькі скрайняй і ўсеагульнай напружанасьцю, жалезнай дысцыплінай, страшэннымі ахвярамі магла існаваць гэтая жабрацкая, барбарская дзяржава, якая бясконца пашыраецца. Народ сьвядома альбо несьвядома зрабіў свой выбар паміж нацыянальнай магутнасьцю і свабодай".

Важнае значэньне мела цэзарапапісцкая палітыка, што ператварыла праваслаўную царкву ў інструмэнт дзяржавы. Цар быў абвешчаны намесьнікам бога на зямлі. Яму належала займацца ня толькі інтарэсамі царства, але і праблемамі выратаваньня душаў падуладных. Ідэя пра тое, што місія Расіі-Масковіі заключаецца ў захаваньні і абароне сапраўднага хрысьціянства — праваслаўя, дала ідэалягічны падмурак для экспансіі дзяржавы, у першую чаргу на Захад. У адпаведнасьці з гэтай дактрынай, Расія — гэта адзінае праваслаўнае царства і ў гэтым сэнсе царства ўсяленскае, падобнае да Рыму і Бізантыі. Такім чынам, расійскае рэлігійнае прызначэньне палягае ўва ўмацаваньні і пашырэньні межаў Расійскай манархіі, бо „Русь — усяленская", а „расійскі цар — над царамі цар", як сфармуляваў манах Філафей.

Нарэшце, яшчэ адна рыса, якая дапаўняе партрэт Маскоўскай Расіі: баязьлівае стаўленьне да асьветы, якая можа прынесьці заходнюю распусту.

Так у Маскоўскай Русі з XIII па XVII ст. склалася своеасаблівая і вельмі агрэсіўная цывілізацыя, якая абапіралася на жорсткі цэнтралізм нічым не абмежаванай улады цара і праваслаўную царкву. І Масква была ня проста эпізодам у гісторыі Расіі, які скончыўся разам з прыходам Пятра І. Для народных масаў „маскоўскі" побыт зацягнуўся да вызваленьня ад прыгону ў 1861 г. Дый купецтва і духавенства жылі ў ім на працягу ўсяго XIX ст. Маскоўскае царства выпрацавала незвычайнае адзінства культуры. Гэтае адзінства культуры і надало маскоўскаму тыпу чалавека ягоную незвычайную ўстойлівасьць. Для многіх ён здаецца нават сымбалем расійскасьці. Ён перажыў ня толькі Пятра, але і росквіт расійскага эўрапеізму; у глыбіні народных масаў ён захаваўся да самай рэвалюцыі і быў скарыстаны бальшавікамі дзеля сваіх мэтаў.

* М.Бярдзяеў

4.

Калі сапраўды ў XIII—XVII ст. Маскоўская Русь уяўляла сабой самастойную цывілізацыю ўсходняга тыпу, якая ідзе ўслед за экспансіі і пашырэньня свайго ўплыву, то чым тады можна растлумачыць „надыход новай эпохі — ад Пятра да Леніна“, якая, са словаў Фядотава, была „трыюмфам заходняй цывілізацыі на прасторах Расійскай імпэрыі?“ На думку Фядотава, „эўрапеізацыя“ Маскоўскага царства пачынаючы ад часоў Пятра стала магчымай дзякуючы таму, што, нягледзячы на ўсё, „паміж Расіяй і Захадам, быццам, не было вялікае падабенства: інакш чужая стыхія зьнявечыла б нацыянальнае жыцьцё… За арыенталізмам маскоўскага тыпу ляжалі, некранутыя старажытныя пласты Кіева-Наўгародскай Русі, і ў іх лёгка і свабодна адбыўся абмен духоўнымі рэчамі з хрысьціянскім Захадам“. Бярдзяеў жа лічыў рэформы Пятра Вялікага непазьбежнымі і разам з тым гвалтоўнымі рэвалюцыйнымі*.

Пункт гледжаньня Фядотава — гэта пазыцыя філёзафа-заходніка, які ня ўлічвае наяўнасьці істотнага цывілізацыйнага разрыву між Маскоўскім царствам і Захадам, штораз-пораз эўрапеізацыю ў Расіі, паводле словаў Бярдзяева, „страшэнным гвалтам зьверху над народнай душой“. Пазыцыя Бярдзяева, той значна больш узважаная. Зь ёй можна пагадзіцца амаль ва ўсім, за выняткам аднаго пункту: Маскоўская Расія, якая імкнулася не да самаізаляцыі, а да экспансіі і пашырэньня, гэтыя яе памкненьні і зрабілі непазьбежнымі рэформы Пятра, патрэбныя перш за ўсё для вайсковага ўмацаваньня імпэрыі.

лічыў таксама, што ідэалагічнай падмуркам для Пятра Леніна, паміж пятроўскім і бальшавіцкім перавароту, быў „нігілізм“ — „адмаўленьне ўсяго старога“, „разбурэньне“, „ператварэньне“ ў „ідэал“ і „рэлігію“ „пустыні“ і „пустаты“. Бярдзяеў, той жа Фядотаў, бачыў у нігілізме „рэлігію“ „пустыні“ і „пустаты“, „рэлігію“ „нішто“, „рэлігію“ „ніякага“ Бога, „рэлігію“ „ніякага“ чалавека, „рэлігію“ „ніякага“ грамадзтва, „рэлігію“ „ніякага“ сьвету, „рэлігію“ „ніякага“ жыцьця. Нігілізм, паводле Бярдзяева, „ня толькі адмаўленьне ўсіх каштоўнасьцяў, але і адмаўленьне ўсіх падмуркаў, на якіх можа быць пабудаванае нармальнае жыцьцё“

прыкладна на адным узроўні. Пасьля XV ст. на Захадзе адбыўся сапраўдны прарыў, зьвязаны з працэсамі рэнэсансу і рэфармацыі, навуковай рэвалюцыяй, асьветніцтвам, Вялікай французскай рэвалюцыяй і англійскай прамысловай рэвалюцыяй, разьвіцьцём капіталізму і экспансіяй эўрапейскай цывілізацыі. Для неэўрапейскага сьвету гэтыя працэсы сталі *выклікам мадэрнізацыі,* які патрабаваў адпаведнай рэакцыі. Паводле С.Гантынгтана, „усходні“ сьвет прапанаваў тры варыянты адказу на гэты выклік: (1) адмова ад мадэрнізацыі і вэстэрнізацыі (стратэгія „адмоўніцтва“); (2) успрыняцьце мадэрнізацыі і вэстэрнізацыі (стратэгія „кемалізму“); (3) успрыняцьце мадэрнізацыі, але адмова ад вэстэрнізацыі (стратэгія рэфармізму).

„Адмоўніцтва“ было ўласьцівае Японіі пасьля яе першых кантактаў з заходнікамі ў 1542 г. і да сярэдзіны XIX ст. Гэтая краіна дапускала абмежаваную мадэрнізацыю толькі вайсковай галіны. Такая палітыка працягвалася амаль тры стагодзьдзі да „пераадкрыцьця“ Японіі капітанам Пэры ў 1854 г. і рэвалюцыі Мэйджы 1868 г., што стварыла ўмовы для разьвіцьця тут капіталізму. Аналягічнай была і пазыцыя ўладаў Кітаю, якія ў 1722 г. загадалі хрысьціянскім місіянэрам пакінуць краіну. Тут „адмоўніцтва“ падтачылі брытанскі экспарт зброі і опіюмныя войны 1839—1842 г. У XX ст. разьвіцьцё транспарту і камунікацыяў зрабіла краіны ўзаемазалежнымі, што значна падвысіла плату за „адмоўніцтва“. Толькі скрайнія фундамэнталісты могуць цяпер адмаўляць мадэрнізацыю, выкідваючы тэлевізары і разьбіваючы кампутары. Стратэгія „адмоўніцтва“ ператварылася ў канцы стагодзьдзя ў маргінальную зьяву.

„Кемалізм“ (ад імя Кемаля Ататурка — першага прэзыдэнта Турэцкай Рэспублікі, што ўзьнікла на руінах Асманскай Імпэрыі) выходзіць з таго, што мадэрнізацыя пажаданая і неабходная. Традыцыйная ж культура несумяшчальная з сучаснасьцю і таму яе мусова прыбраць і замяніць заходняй культурай. Іншымі словамі, краіна павінна быць вэстэрнізаваная, каб быць мадэрнізаванай.

Рэфармізм уяўляе сабой трэці шлях між ізаляцыянісцкім „адмоўніцтвам“ і часта траўматычным для нацыі „кемалізмам“. Гэтая стратэгія грунтуецца на спалучэньні мадэрнізацыі з захаваньнем асноўных вартасьцяў, практыкі і інстытутаў

нацыянальнай культуры. Такі падыход, ясна, быў найбольш прымальным для незаходніх элітаў. У Японіі вельмі папулярным быў лёзунг: „Японскі дух — заходняя тэхніка“. У Эгіпце яшчэ ў 1830-х Магамэт Алі заклікаў да тэхнічнай мадэрнізацыі без эксцэсаў культурнай вэстэрнізацыі, а мусульманскія рэфарматары канца XIX ст. імкнуліся давесьці, што іслам можа быць сумяшчальны з мадэрнізацыяй праз ісламскі рацыяналізм і асваеньне лепшага з заходняй культуры.

Усе гэтыя ідэі, аднак, натыкаюцца на складаную культурную праблему. Калі традыцыйная рэлігія і культура японцаў ці карэйцаў ня толькі не стварыла перашкодаў для „асучасьніваньня“ гэтых краінаў, але і паспрыяла хуткім тэмпам індустрыяльнага разьвіцьця, то гэтага нельга сказаць пра ісламскі сьвет ці Афрыку, якія да гэтай пары ня вырашылі праблемы мадэрнізацыі.

Амэрыканскі сацыёляг Дэвід Аптэр падзяляў усе культуры сучаснага сьвету на два тыпы: *інструмэнталісцкага або завершанага кшталту*. Для інструмэналісцкіх культураў характэрная наяўнасьць вялікага сэктару прамежкавых мэтаў, які існуе незалежна ад канчатковых. Інавацыі тут адбываюцца хутчэй і зь меншымі выдаткамі. Сама традыцыя як бы робіць легітымнымі зьмены, што адбываюцца. Інакш выглядае сытуацыя ў межах завершаных культураў. Яны адрозьніваюцца шчыльнымі сувязямі паміж прамежкавымі і канчатковымі мэтамі. Грамадзтва, дзяржава, улада выступаюць тут у якасьці складовых частак адзінай салідарнай сыстэмы, галоўнай зь якіх звычайна ёсьць рэлігія. Завершаныя культуры зь недаверам ставяцца да інавацыяў і з-за гэтага іх вельмі цяжка бывае рэфармаваць. Многія дасьледчыкі лічаць, што больш інструмэналісцкія японскае і індыйскае грамадзтвы значна лягчэй пераносяць мадэрнізацыю, чым ісламскія і кітайскае грамадзтвы, культуры якіх носяць выразна завершаны характар.

Да пералічаных стратэгіяў рэакцыі незаходняга сьвету на экспансію Захаду і выклік „асучасьніваньнем“ варта дадаць і чацьвертую мадэль: *вэстэрнізацыя без мадэрнізацыі*. Яна ўласьцівая многім краінам Афрыкі, у якіх адбываецца вэстэрнізацыя культуры паноўнай эліты бяз значных дасягненьняў на шляху эканамічных і палітычных

пераўтварэньняў.
На першых парах вэстэрнізацыя і мадэрнізацыя былі вельмі цесна пераплеценыя адна з адной. Незаходнія дзяржавы абсарбоўвалі заходнюю культуру і дасягалі першых посьпехаў на шляху „асучасьніваньня“. Аднак чым далей яны прасоўваюцца ў гэтым накірунку, тым больш актыўнымі і настойлівымі робяцца захады па рэстаўрацыі нацыянальнай культуры. Парадаксальным чынам дзейнічае заканамернасьць: *на раньніх фазах мадэрнізацыі ёй дапамагае вэстэрнізацыя; на позьніх этапах мадэрнізацыя абапіраецца на дэвэстэрнізацыю*.
Гэта тлумачыцца наступным чынам:
На ўзроўні грамадзтва мадэрнізацыя спрычыняецца да павелічэньня эканамічнай, вайсковай і палітычнай магутнасьці краіны як цэлага, узрастаньня даверу народу да сваёй культуры. *На індывідуальным узроўні*, аднак, мадэрнізацыя прыводзіць да ўзрастаньня адчужанасьці і крызы ідэнтычнасьці, зьвязаных з разрывам традыцыйных сувязяў і ліквідацыяй звыклых сацыяльных дачыненьняў. Таму, каб зьняць гэтыя небясьпечныя супярэчнасьці паміж сацыяльным і індывідуальным узроўнямі, незаходнія грамадзтвы імкнуцца да максымальна магчымага спалучэньня сучасных вартасьцяў і ладу жыцьця з нацыянальнай культурай і традыцыямі.
Амаль усе незаходнія цывілізацыі пад час свайго шматтысячагадовага разьвіцьця сутыкаліся з праблемай пазычэньня элемэнтаў іншых культураў. Заўсёды гэта рабілася так, каб захаваць сваю адметнасьць. Напрыклад, Кітай праглынуў у свой час народжаны ў Індыі будызм без „індаізацыі“ ўсёй краіны. Будызм быў ужыты на карысьць кітайскіх інтарэсаў, а культура засталася кітайскай. Аналягічным чынам арабы-мусульмане атрымалі ў спадчыну, захавалі й скарысталі з элінскіх вартасьцяў дзеля ўтылітарных мэтаў. У VII ст. Японія імпартавала кітайскую культуру і бяз вонкавага эканамічнага ці вайсковага прымусу паднялася на больш высокую прыступку цывілізацыйнага разьвіцьця. Пры ўсім тым японская культура захавала сваю непаўторнасьць.
На думку С.Гантынгтана, мадэрнізацыя не абавязкова павінна суправаджацца вэстэрнізацыяй. Незаходнія грамадзтвы могуць станавіцца сучаснымі без разбурэньня сваёй нацыянальнай культуры і замены яе заходнімі вартасьцямі, інстытутамі і практыкай. Мадэрнізацыя ўмацоўвае нацыянальныя культуры і

памяншае адносную магутнасьць Захаду. „Увогуле, сьвет робіцца ўсё больш і больш сучасным і ўсё менш і менш заходнім“, — так ацэньвае сучасныя тэндэнцыі Гантынгтан.
З гэтага вынікае некалькі рэчаў, датычных тэмы нашага артыкулу.
Па-першае, мадэрнізацыя многіх неэўрапейскіх краінаў можа адбывацца бязь іхнай суцэльнай эўрапеізацыі. Гэта, у сваю чаргу, ставіць на парадак дня пытаньне аб узьнікненьні ў іх палітычнай свабоды і дэмакратыі як самастойную праблему, не зьвязаную бепасярэдне з „асучасьніваньнем“. Гэтыя вартасьці павінны абапірацца на ўнутраную культурную глебу, каб мець шанцы для жыцьцяздольнага разьвіцьця. Культурныя асаблівасьці Індыі і Японіі паспрыялі ўзьнікненьню тут дэмакратычных грамадзтваў, а цывілізацыйныя адметнасьці Кітаю, Ірану, арабскіх краінаў робяць палітычную свабоду ў іх больш праблематычнай.
Па-другое, культурны і цывілізацыйны плюралізм сучаснага сьвету, які не зьнішчаецца мадэрнізацыяй, а, наадварот, умацоўваецца дзякуючы гэтаму працэсу, непазьбежна патрабуе і адпаведнага палітычна-дзяржаўнага плюралізму.
Разнастайныя нацыянальныя культуры найлепш разьвіваюцца ў незалежных нацыянальных дзяржавах. Гэта азначае, што на мяжы XXI ст. цалкам састарэлі імпэрскія палітычныя ўтварэньні, якія трымаюцца коштам гвалтоўнага паняволеньня і падпарадкаваньня аднаго народу другому. Інтэграцыйныя працэсы могуць быць плённымі толькі як вынік доўгатэрміновага працэсу супрацоўніцтва незалежных краінаў і паміж блізкімі народамі, прыналежнымі да адной і той жа цывілізацыі.
Па-трэцяе, вялікім выклікам для сучаснага сьвету, вартасьцяў свабоды і дэмакратыі зьяўлецца тое, што Гантынгтан назваў канфліктам цывілізацыяў. Ён зьвязаны з тым, што найбольш важнымі адрозьненьнямі сярод людзей і народаў пасьля крышу камунізму сталі не ідэалягічныя, палітычныя ці эканамічныя, а культурныя.

6.

Праблема „эўрапеізацыі“ гістарычна ніколі не стаяла перад Беларусяй, паколькі гэтая краіна была адарванай ад

** На гэтую асаблівасьць расійскай інтэлігенцыі

эўрапейскага цела адно ў канцы XVIII ст. Толькі з прыняццём
II сваімі ўказамі пазбавіла беларускія месты Магдэбурскага
права, а жыхароў некаторых зь іх залічыла да прыгонных
толькі ў 1839 г. была ліквідаваная Берасьцейская царкоўная
поўнай праваслаўнай рэлігійнай уніфікацыі царскім
не ўдалося дасягчы ў сілу прысутнасьці значнай
каталікоў і юдэяў. Нарэшце, толькі цягам XIX ст.
выведзены зь дзеяньня і забаронены Статут ВКЛ
былых вольнасьцях і традыцыях ня зьнішчылася,
знайшла сваё ўвасабленьне ў антырасейскіх
дзейнасьці філяматаў і філярэтаў, адраджэнскім
XX ст, ідэалах БНР.

Што тычыцца Расіі, то ейная „эўрапеізацыя“ прайшла
этапы, для кожнага зь якіх была ўласьцівая
паводзінаў у сувязі з выклікам „асучасьніваньня“
Захаду.

Першы этап з XVI да канца XVII ст. быў пераважна
„адмоўніцтва“. Гэта знаходзіла адбітак у абскурантызме,
перасьледзе сьвецкай навукі, адукацыі і кнігадрукаваньні,
абмежаваньні права падданых пакідаць краіну, зносінах з
„лацінскай гарэзіяй“. Аднак, „адмоўніцтва“ не было
ізаляцыю. Масковія імкнулася да пашырэньня
экспансіі, пікі якой прыходзяцца на войны Івана IV
Аляксея Найцішэйшага.

У пачатку XVIII ст. Расія сутыкнулася з Швэцыяй
пачалася т.зв. Паўночная вайна з мэтай далучэньня
Прыбалтыкі. З самага пачатку яна прадэманстравала
тэхнічную і эканамічную адсталасьць Маскоўскага
якое панесла шэраг паразаў на сушы і на моры
фазы кампаніі. Акурат яны былі галоўным стымулам
Пятра.

На другім этапе, з XVIII па пачатак XX ст., дамінаваў
абмежаванага „кемалізму“. *Мадэрнізацыя* насіла
інструмэнтальны характар і праходзіла без карэнных
эканамічных адносінаў. Каб забясьпечыць войска
неабходнай зброяй, вопраткай, правіянтам, а краіну
сыравінай, ствараліся дзяржаўныя мануфактуры,
працавалі прыгонныя работнікі. Сельская гаспадарка
трымалася на прыгоне. Доля сапраўдных капіталістычных
гаспадарак у Расіі была нязначнай (прычым іх

Ка[illegible]
дзяржаўнага
расійскіх сялян,
фінансаў Сямён
Фрагмент тэксту
крытыцызме
Этыка
Піліяцы“ аб
цалкам. Яна
станоўчых
рэлігійнасці,
уцякае ад
Імкненьне
стратэгія
„прабудзіць
гістарычным і
набыццём
жыцьцём“,
сучасце
тэрмінаў,
шэсьце
свабоднай веры.
Жахлівая
ёсьць нібы
У 1700 г.
паміж Расіяй
асабліва
абмежаваным
сустрэчнай
сацыяльнай
строгімі і
эканамічнай
традыцыямі,
новых
сялянамі,
дзяржаўнымі,
асобных
культурай, на

ўскраінах, чым у цэнтры). Хуткае разьвіцьцё свабодных рынкавых адносінаў пачалося толькі пасьля рэформы 1861 г. У краіне была вельмі слабая буржуазія і сярэднія сталі. Узровень адукацыі ў XVIII ст. быў вельмі нізкім. Пры гэтым прорва наміж верхнім слоем і народам увесь час паглыблялася. Асьвета народу лічылася шкоднай і небясьпечнай, яна дапускалася, толькі ў памерах, неабходных для ўтрыманьня імперыі. М.Ламаносаў быў геніяльным расійскім навукоўцам, які зрабіў шэраг адкрыцьцяў і фактычна стварыў новую навуку — фізычную хімію. Аднак ягоная самота сярод тойдэмпы, якая яго абкружала, была трагічнай. Пад жорсткім кантролем народу знаходзіліся грамадзкія навукі і асабліва філязофія, якія лічыліся больш небясьпечнымі. Абскурантысты рэзка нападалі на філязофскі ідэалізм, бачачы ў ім сувязь зь небясьпечным для праваслаўя сьпірытуалізмам. У 1850 г. расійскі міністр народнай асьветы князь Шырынскі-Шахматаў забараніў выкладаньне філязофіі ўва ўнівэрсытэтах Расіі.

Вэстэрнізацыя таксама была абмежаванай і апранаўтаў нацыянальна-спэцыфічныя формы. На думку Бярдзяева, „заходняя культура ў Расіі XVIII ст. была павярхоўнай пазычэньнем і перайманьнем“. Адным з найзначнейшых дасягненьняў вэстэрнізацыі быў указ Кацярыны II аб „вольнасьці дваранства“, які вызваліў гэты стан ад абавязковай дзяржаўнай службы. Дзякуючы гэтаму ў Расіі ўпершыню ў ейнай гісторыі ўзьніклі вольныя прафэсіі, якія маглі папаўняцца плебэямі-разначынцамі, пераважна выхадцамі з духавенства. Расія стала адзінай у сьвеце краінай, за выняткам Кітаю, у якой дваранства можна было атрымаць праз адукацыю, скончыўшы сярэднюю ці нават паўсярэднюю школу, хоць школы гэтыя заставаліся недаступныя для простых людзей. Але адносная свабода была дараваная расійскаму грамадзтву запозна, калі аўтарытэт манархіі быў падарваны ўва ўсіх клясах нацыі, а „паглыбленьне клясавай надзвычайнасьці ўнемагчымляла перабудову дзяржавы на дэмакратычных пачатках“, як піша Фядотаў.

Нічога дзіўнага ў якраз такім лёсе свабоды ў „эўрапейскай“ Расіі няма. Рэч у тым, што дэмакратычная перабудова — непатрэбная дзяржаве, галоўная мэта якой — панаваньне і ўтрыманьне імпэрыі, для чаго патрабуецца найперш цэнтралізаваны адміністрацыйны апарат і моцная войска, а не

можна сказаць, што ў 1861 г. У Расіі узрослых мерахіна наміж ў Асьветы трудзацца, такой і цыя, які зрабіў стуго — сьці ў цэмпры, якая жыцьцём народу фітэлія, якія ў эканамічнасьці ў ацэнцы падалі бясьпечным для міністраў, такой і ў адданасьці напасаў дуэнаму, як у тым суперасійскім духоўным і абастыры, які ўдзяляе расійская інтэлігенцыя. Але, ад забыўшыся ў праз манастырю, прэстыжнт не абыякаму сьведаў, надзвычай сваіх манастыра ён хоча кіраваць сьцяжам і накаржыць у ім сваю веру; ён — ва войска, а не

прадстаўнічыя органы ўлады і свабода слова. Аперацыі
былі створаныя дзякуючы тым няпоўным мадэрнізацыям,
вэстэрнізацыі, пра якія ішла размова вышэй. Тым самым
стагодзьдзе Расія ператварылася ў найбуйнейшую
Эўразіі і жандара Цэнтральнай Эўропы. На гэтым
„асучасьніваньне“ краіны спынілася. Не было дафінансам і
стымулу.

Другая прычына паразы палітычнай свабоды нам
спэцыфіцы расійскага сацыяльна-вызвольнага руху,
Фядотаў называў другім па важнасьці наступствам
„эўрапеізацыі“ пасьля пабытовай свабоды дваранства
у Расіі доўга заставаўся прадуктам дзейнасьці адносна
сацыяльнай групы — інтэлігенцыі, групы, якая была
спэцыфічна расійскай зьявай. Яе нельга блытаць з тым,
ангельску называецца *intellectuals* (людзі разумовай
творчасьці). Да расійскай інтэлігенцыі маглі аднесьці
не зьвязаныя з разумовай працай. Гэтая група, на думку
Бярдзяева, нагадвала ордэн манахаў ці рэлігійную
сваёй асаблівай маральлю, вельмі нецярпімай, са
абавязковым сьветаглядам, са сваімі асаблівымі
ўзвычаеньнямі**.

Інтэлігенцыя ў дарэвалюцыйнай Расіі была ідэалагічнай,
прафэсійнай ці эканамічнай групоўкай. У яе ўваходзілі
прадстаўнікі розных станаў: дваранства, духавенства,
чынавенства, мяшчанаў, а пасьля ліквідацыі прыгоннага
сялянаў. Гэтая разначынская інтэлігенцыя аб’ядноўвалася
вакол ідэяў сацыялістычнага кшталту.

Галоўнай рысай расійскай інтэлігенцыі была безгрунтоўнасьць
гэтай групоўкі, яе разрыў з станавым побытам і традыцыямі.
Інтэлігенцыя набыла характэрны для Расіі раскольніцкі
характар. Яна жыла ў расколе з навакольнай рэчаіснасьцю,
якую лічыла нядобрай, і ў яе выпрацавалася фанатычная
мараль у дачыненьні да яе. Скрайняя ідэйная нецярпімасьць
расійскай інтэлігенцыі была рэакцыяй самаабароны. Толькі так
гэтая група магла захавацца ў варожым сьвеце, толькі
дзякуючы свайму ідэйнаму фанатызму яна магла абараніць
свае прынцыпы.

Ува ўмовах расійскага палітычнага ладу інтэлігенцыя
аказалася адарванай ад рэальнай грамадзкай справы, і гэта
вельмі паспрыяла разьвіцьцю ў яе сацыяльнай летуценнасьці. У

выніку ў адсталай і дэспатычнай Расіі выпрацоўваліся самыя радыкальныя сацыялістычныя і анархісцкія праекты. Немагчымасьць легальнай палітычнай дзейнасьці прывяла да таго, што палітыка была перанесеная ў гуманітарныя навукі і літаратуру.
Для расійскай інтэлігенцыі ўласьцівы быў таксама скрайні дагматызм. Гэта яшчэ адна нацыянальная рыса расійскага характару, паводле Бярдзяева. Ён пісаў, што расійцы пераймаюць і засвойваюць іншаземныя ідэі, але робяць гэта дагматычна. Тое, што на Захадзе навуковая тэорыя, якая падлягае крытыцы, гіпотэза ці, у лепшым выпадку, частковая (без прэтэнзіяў на ўсеагульнасьць) канцэпцыя, ператвараецца ў расійскіх інтэлігентаў у дагматыку, у нешта кшталту рэлігійнага адкрыцьця. Расійцы ўсё любяць успрымаць татальна, ім не стае скептыцызму і крытыцызму заходніх людзей. Яны ўвогуле дрэнна разумеюць значэньне адноснага, паступовасьць гістарычнага працэсу, дыфэрэнцыяцыю розных сфэраў культуры. З гэтым зьвязаны расійскі максымалізм. Такім чынам, у пачатку XX ст. Расія аказалася падрыхтаваная для пераходу да *трэцяй, „рэфармісцкай“ стратэгіі* рэагаваньня на выклік „асучасьніваньнем“ з боку Захаду.

Капіталістычныя эканамічныя адносіны закранулі шырокія колы насельніцтва, абвастрылі праблему сацыяльнай няроўнасьці і выклікалі чыста расійскую рэакцыю: лепш бунт у імя справядлівасьці, чым паступовая адаптацыя да сытуацыі і марудныя рэформы. Палітычна грамадзтва было рэзка палярызаваным на рэакцыйных кансэрватараў, што імкнуліся захаваць традыцыйную сыстэму ўлады, і радыкальных рэвалюцыянэраў, што жадалі разбурыць яе дазваньня. У культурным пляне Расія таксама ўяўляла сабой тыповы прыклад „расколатай краіны“. Што датычыць замежнай палітыкі, пецярбурская Расія прадэманстравала сваю слабасьць і няздольнасьць да далейшага пашырэньня межаў імпэрыі. Паразы ў войнах зь Японіяй і Нямеччынай зрабілі бунт у імя ўмацаваньня імпэрыі непазьбежнай зьявай. Як гэта ні парадаксальна, бальшавізм аказаўся трэцяй зьявай расійскай вялікадзяржаўнасьці, расійскага імпэрыялізму — першай зьявай было Маскоўскае царства, другой — пятроўская імпэрыя. Бальшавізм выступаў за моцную цэнтралізаваную

дзяржаву. Адбылося аб'яднаньне волі да сацыяльнай праўды з воляй да дзяржаўнай магутнасьці, і другая воля ўрэшце аказалася мацнейшай. Бальшавікі стварылі паліцэйскую дзяржаву, па спосабах кіраваньня вельмі падобную да старой расійскай дзяржавы, — піша Фядотаў.

7.

Рэвалюцыі зьяўляюцца хуткімі, фундамэнтальнымі і гвалтоўнымі зьменамі дамінуючых вартасьцяў і мітаў грамадзтва, ягоных палітычных інстытутаў, сацыяльнай структуры, сыстэмы кіраваньня, дзейнасьці ўраду і палітыкі ў цэлым. Яны — прыкмета сучаснасьці. Старажытныя цывілізацыі ведалі паўстаньні, перавароты, зьмены дынастыяў, але не сацыяльныя рэвалюцыі. Гантынгтан лічыць рэвалюцыі адным са спосабаў пераходу ад традыцыйнага грамадзтва да сучаснага. У іх выяўляецца адна з найяскравейшых характарыстык мадэрнісцкага погляду на сьвет, неўласьцівага традыцыйнаму грамадзтву: перакананьне, што чалавеку цалкам пад сілу кантраляваць і зьмяняць сваё асяродзьдзе, што ў яго ёсьць і магчымасьць, і права дзейнічаць такім чынам.
Рэвалюцыйны выбар расійскага народу ў 1917 г. быў ня толькі выбарам у імя імпэрыі, але і выбарам у імя сучаснасьці. Гэтыя рэчы цесна зьвязаныя міжсобку. Магутная дзяржава, каб прэтэндаваць на сусьветнае панаваньне, у XX ст. не магла ня мець пад сабой трывалай глебы ў выглядзе індустрыяльнай эканомікі, разьвітага вайскова-прамысловага комплексу, сучаснай сыстэмы адукацыі, урбанізаванага насельніцтва. Адзінае, што адкідалася прэч, як непатрэбны атрыбут — гэта дэмакратычная палітычная сыстэма. Рэвалюцыйная мадэрнізацыя Расіі ўяўляла сабой поўны адыход ад ранейшай стратэгіі спалучэньня мадэрнізацыі з вэстэрнізацыяй; яна была спробай „асучасьніць" Расію на мясцовай цывілізацыйна-культурнай глебе і насуперак Захаду. Яна стварыла палітыка-эканамічную сыстэму, на Захадзе нечуваную, але ў імя ідэалёгіі, народжанай на Захадзе. Славянафілы і заходнікі спрачаліся пра тое, ці можа Расія адрозьнівацца ад Захаду, не адстаючы ад яго тэхнічна. Камунізм паспрабаваў вырашыць гэтае пытаньне па-іншаму: Расія ўзначаліла пралетарскую рэвалюцыю, якой наканавана было пранесьціся па ўсім сьвеце;

Савецкая Расія ўвасабляе сабой не адсталае азіяцкае мінулае, а прагрэсіўную савецкую будучыню; Савецкая Расія хоча пераскочыць праз Захад, адрозьніваючы сябе ад яго, не таму, што „вы іншыя, а мы ня хочам быць падобнымі да вас“, як казалі славянафілы, а з-за таго, што „мы розныя, і непазьбежна вы зробіцеся падобнымі да нас“, як гучала тэза Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Галоўная праблема з гэткім падыходам замыкаецца ў тым, што перадавой Расія была толькі ў фармулёўках ейных ідэолягаў, у прапагандысцкіх лёзунгах, у віртуальнай прасторы, як сказалі б цяпер. Але гэтую віртуальную рэальнасьць удавалася выдаваць за праўду многім заходнім інтэлектуалам, якія амаль да краху камунізму ўва Ўсходняй Эўропе ня кідалі надзеі адшукаць у краіне „пераможнага сацыялізму“ ўвасабленьне сваіх марксісцкіх мараў.

Гантынгтан лічыць, што камунізм, які спатрэбіўся савецкім правадырам, каб адмежаваць сябе ад Захаду, парадаксальным чынам злучыў савецкую Расію зь ім. Маркс і Энгельс распрацоўвалі сваю тэорыю ў разьліку на краіны Заходняй Эўропы. Адаптаваўшы заходнюю ідэалёгію і карыстаючыся ёй для барацьбы з Захадам, Расія стала значна бліжэйшай да Захаду, чым калі-кольвек раней у яе гісторыі. Нягледзячы на сур'ёзныя разыходжаньні камунізму і лібэральнай дэмакратыі, абедзьве гэтыя плыні гавораць на адной мове, зьяўляюцца сэкулярызаванымі і сучаснымі, падзяляюць адны вартасьці свабоды, роўнасьці і матэрыяльнага дабрабыту, — піша Гантынгтан.

Але канцэпцыя Гантынгтана ня ўлічвае істотнай розьніцы між заходнім (лібэральным) і ўсходнім (таталітарным) марксізмам, розьніцы значна большай, чым розьніца між лібэралізмам і сацыял-дэмакратыяй, ці нават эўракамунізмам, на Захадзе. Больш за тое, супрацьстаяньне камуністычнай Расіі і лібэральнага Захаду прывяло да новай арыенталізацыі расійскай культуры ў сувязі з тым, што акурат Расія выступіла ў ХХ ст. лідэрам „антыімпэрыялістычнага фронту“, які складаўся пераважна з нацыяналістычных рухаў народаў Азіі і Афрыкі. Пры гэтым марксізм выкарыстоўваўся як ідэалягічная зброя для прыкрыцьця вялікадзяржаўніцкай палітыкі СССР. Зразумела, што такі марксізм і ў Расіі, і ў краінах „трэцяга сьвету“ быў вельмі мала падобны да ідэалёгіі Маркса,

распрацаванай у XIX ст., ня кажучы ўжо пра яе сучасныя варыянты ў краінах Захаду.
Фядотаў заўважаў з гэтай нагоды, што савецкі чалавек стаіць бліжэй да „маскоўца“ менавіта сваёй ганарыстай нацыянальнай сьвядомасьцю, што „ягоная краіна адзіная праваслаўная, адзіная сацыялістычная — першая ў сьвеце: трэці Рым. Ён з пагардай глядзіць на астатні, г.зн. заходні сьвет; ня ведае яго, ня любіць і баіцца яго“.
У рэальнасьці была толькі адна сфэра, у якой савецкая сыстэма хаця й не перагнала Захаду, але на роўных зь ім спаборнічала, — ваенная галіна, у якую СССР кідаў усе матэрыяльныя і інтэлектуальныя рэсурсы. З разьлікам на яе патрэбы былі зьдзейсьненыя індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі, якія каштавалі мільёнаў жыцьцяў. Галоўнай мэтай камуністычнай Расіі было стварэньне сусьветнай імпэрыі. У імя яе бальшавікі нават зьмянілі назоў Расія на СССР. Расія павінна была стаць „першай рэспублікай“ гэтай імпэрыі. Плянавалася, што кожная краіна сьвету, якая ажыцьцёвіць сацыялістычную рэвалюцыю, будзе далучацца да СССР. Гэты курс быў палітычнай рэчаіснасьцю да другой сусьветнай вайны, адносная няўдача ў якой не дазволіла Савецкаму Саюзу падпарадкаваць усе краіны Эўропы. На зьмену яму пасьля 1945 г. прыйшлі стратэгія разбудовы вонкавай імпэрыі, якая ўключала так званыя краіны сацыялістычнай садружнасьці, і дактрына Брэжнева, што дэкляравала права СССР на ўмяшаньне ў нутраныя справы прыналежных да гэтай вонкавай імпэрыі дзяржаваў.
Адноснае зьбліжэньне Расіі й Захаду адбывалася не ў ідэалёгіі, а ў сацыяльнай структуры грамадзтва. Гвалтоўная індустрыялізацыя нарадзіла новы соцыюм з новымі патрэбамі і інтарэсамі. Савецкае грамадзтва стала пераважна гарадзкім (пры канцы 70-х доля гараджанаў перавысіла 2/3 ад агульнай колькасьці насельніцтва), адукаваным (у 80-х доля насельніцтва з адукацыяй, не ніжэйшай за сярэднюю, дасягнула 60%, а колькасьць людзей з вышэйшай адукацыяй у 1989 г. склала пад 10%, зраўняўшыся з амэрыканскім узроўнем).
Сацыёлягі сьцьвярджаюць, што ўрбанізаваныя грамадзтвы, дзякуючы ўмацаваньню ў іх нефармальных і перакрыжаваных сацыяльных сувязяў, ствараюць лепшыя ўмовы для

ўзьнікненьня і існаваньня незалежнай грамадзкай думкі, чым аграрныя грамадзтвы. Існуе таксама карэляцыя паміж падтрымкай лібэральных вартасьцяў і адукацыяй людзей. Важнае й разьвіцьцё індустрыйнага сэктару эканомікі, які стварае больш разнастайную, складаную і залежную ад вонкавых сувязяў гаспадарку, якую цяжка кантраляваць аўтарытарнымі мэтадамі. З дапамогай аўтарытарызму можна правесьці індустрыялізацыю, але немагчыма наладзіць эфэктыўную працу эканомікі. Зьмены адбыліся і ў расійскай кіраўнічай эліце — намэнклятуры. Хрушчоўская дэсталінізацыя зводзілася да патрабаваньня зрабіць першы крок па шляху свабоды — забясьпечыць сябрам вышэйшай клясы „свабоду цела“, г.зн. свабоду ад адвольных апалаў і караў. „Дэлегаты XX зьезду, — піша расійскі публіцыст Максім Сакалоў, — пайшлі добра вядомым у гісторыі шляхам „арыстакратычнай канстытуцыі“ — своеасаблівай намэнклятурнай *Magna Charta-ы*. Спроба, якая двойчы ў расійскай гісторыі зрывалася (няўдача баярскіх канстытуцыйных досьведаў 1613 г. пры абраньні Міхаіла Раманава і правал сябраў Вярхоўнай тайнай рады, што спрабавалі ў 1730 г. абставіць „кандыцыямі“ прыход на трон Ганны Іаанаўны), у 1956 г. была пасьпяховай“.
Праз 30 гадоў гэта дазволіць намэнклятуры зрабіць яшчэ адзін крок наперад: распачаць негалосную кампанію па ператварэньні ўлады ў маёмасьць, па-народнаму кажучы — „прыхватызацыю“.
Да ўнутраных фактараў, што паўплывалі на эрозію камунізму ў СССР, трэба дадаць і замежныя. У 70—80-я гады савецкая Расія сутыкнулася з новым выклікам „асучасьніваньня“. Краіны Захаду ў гэты пэрыяд пасьпяхова перайшлі ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага інфармацыйнага грамадзтва, у якім галоўнай сфэрай дзейнасьці становіцца не цяжкая прамысловасьць, а сфэра паслугаў, вытворчасьць ня рэчаў, а інфармацыі, не прамысловыя гіганты, а маленькія гнуткія кампаніі, узброеныя сучаснай тэхналёгіяй. Адначасова рэзка палепшылася якасьць жыцьця ў краінах Захаду.
Тое, што Расія знаходзіцца ў стане даганяючай краіны, зноў стала больш чым відавочна. Экспарт натуральных багацьцяў дазваляў нейкі час утрымліваць адносную сацыяльную раўнавагу ў савецкім грамадзтве. Аднак краіна ўсё больш саступала ў канкурэнцыі. Найбольш небясьпечным для СССР

было тое, што ён пачаў прайграваць гонку ўзбраеньняў і быў ня ў стане эканамічна і ваенна ўтрымліваць вонкавую імпэрыю. Гэта найбольш яскрава засьведчыла параза ў Аўганістане. Рэвалюцыйная мадэрнізацыя Расіі без вэстэрнізацыі і нават з дэвэстэрнізацыяй, зьдзейсьненая камуністамі гвалтоўнымі мэтадамі і коштам мільёнаў ахвяраў, дазволіла адказаць на выклік сучаснасьці толькі на непрацяглы пэрыяд часу. Абапіраючыся на культурна-цывілізацыйны фундамэнт старой Расіі, бальшавізм доўга падтрымліваў уражаньне, што дзякуючы новай ідэалёгіі і таталітарным мэтадам сваёй палітыкі ён усутыч падышоў да ажыцьцяўленьня старой пецярбурскай панславісцкай мары, пабудовы Вялікай Расіі ад Нілу да Нявы, ад Эльбы да Кітаю і русіфікацыі ўсіх народаў, што яе насяляюць. Але праз 70 гадоў камуністычная палітыка вычарпала свае рэзэрвы, і гэта зрабіла непазьбежным вяртаньне Расіі на капіталістычны шлях разьвіцьця.

8.

У сярэдзіне 70-х выйшла кніга амэрыканскага сацыёляга Дэніэла Бэла „Культурныя супярэчнасьці капіталізму“, што вельмі востра паставіла на парадак дня пытаньне аб пагрозе Захаду, якую стварае размываньне фундамэнтальных вартасьцяў пратэстанцкай працоўнай этыкі, на якія абапіраўся першапачатковы капіталізм і якія амаль зьніклі ў эпоху масавай вытворчасьці, масавага спажываньня і этыкі геданізму. На шчасьце, Захад знайшоў у сабе сілы калі ня цалкам, то хаця б часткова зьменшыць пагрозу з дапамогай працэсаў постіндустрыяльнага разьвіцьця і дзякуючы адмове многіх урадаў ад вялікіх сацыяльных праграмаў дапамогі розным катэгорыям насельніцтва, якія стымулявалі рост патэрналісцкіх настрояў у грамадзтве. Пазытыўная роля ў гэтым належала і нэакансэрватыўнай ідэалёгіі, якая выступала за адраджэньне традыцыйных вартасьцяў, сям'і, рэлігіі, прамежкавых структураў, што аддзяляюць асобу ад дзяржавы.
Іншая сытуацыя стварылася ў краінах, якія ажыцьцяўляюць пераход да свабоднай рынкавай эканомікі пасьля краху камунізму, у тым ліку і ў Расіі.
Ведама, што праваслаўная рэлігія не спрыяла фармаваньню ў грамадзтве пазытыўнага стаўленьня да назапашваньня

капіталу і дасягненьня матэрыяльнага посьпеху чалавекам. Сама царква зь ейнымі багацьцямі і пышнай абрадавасьцю, з аднаго боку, і сыходам ад грэшнага сьвецкага жыцьця ў манастыры, з другога, уплывала на фармаваньне паводзінаў сваіх прыхаджанаў, цяжка сумяшчальных з ладам жыцьця рацыянальнага заходняга прадпрымальніцтва. Гісторыя ня ведае прыкладаў хуткага капіталістычнага разьвіцьця краінаў усходнехрысьціянскай культуры. Да гэтага варта дадаць і „ўцёкі ад свабоды“ і адказнасьці, выпеставаныя ў расійскай душы за стагодзьдзі дзяржаўнага патэрналізму, і геданісцкую этыку матэрыялістычнага сьветагляду, які насаджаўся камуністамі, і дагматычную веру расійскіх лібэралаў ува ўнівэрсалізм манэтарысцкіх рэцэптаў, і шмат што яшчэ.
Усё гэта разам і ўтварае тую выбуховую сумесь, якая называецца сёньняшнім расійскім капіталізмам.
Вышэйшая кляса сучаснага расійскага грамадзтва ўзьнікла ў выніку „прыхватызацыі“ дзяржаўнай маёмасьці намэнклятурай, легалізацыі крымінальнага капіталу і ўзвышэньня нязначнай часткі спэцыялістаў з так званай „сярэдняй клясы“. Амаль усіх чальцоў гэтай стракатай групы аб’ядноўвае бадай што адзін этас: жаданьне ўзбагачэньня любой цаной, імкненьне да вывазу капіталу за мяжу і вядзеньня раскошнага жыцьця, якога не дазваляюць сабе прадпрымальнікі ў іншых краінах сьвету. З гэтай групай цесна зьвязанае расійскае чынавенства. Падзел кіраўнічай клясы на бізнэсоўцаў і бюракратаў — зьява чыста ўмоўная. Фактычна яны зьяўляюцца складовымі часткамі адзінага сацыяльнага арганізму, і ў гэтым таксама адметнасьць сёньняшняй капіталістычнай Расіі. Найбольш яскрава гэта праяўляецца ў вайскова-прамысловым комплексе.
Да вышэйшай клясы Расіі таксама належыць групоўка інтэлектуалаў: спэцыялісты у галіне СМІ, тэлежурналісты, рэдактары газэтаў, паліттэхнолягі і г.д. У гэтым бачыцца праява сучаснасьці — масавым грамадзтвам можна маніпуляваць праз эфэктыўныя сродкі ўзьдзеяньня на масавую сьвядомасьць.
Улада і маёмасьць у Расіі ня проста аб’яднаныя ў руках адной сацыяльнай групы, а часьцяком знаходзяцца ў распараджэньні вузкага кола адных і тых жа асобаў. Расія пераўтварылася ў тыповую алігархію. Вядома, што любая алігархія зьяўляецца няўстойлівай формай і мае тэндэнцыю да выраджэньня ў

тыранію.
Кіраўнічай эліце супрацьстаіць расійскі народ з усё тымі ж добра вядомымі з гісторыі патэрналісцкімі стаўленьнямі і перакананьнямі. Нягледзячы на прыватызацыю, дзяржава для большасьці людзей, калі не на практыцы, то ў сьвядомасьці, застаецца адзіным сродкам атрыманьня нейкай сацыяльнай падтрымкі, а часьцяком і апошняй надзеяй на выжываньне. Усе праблемы сацыяльна-эканамічнага жыцьця зьвязваюцца зь дзейнасьцю ўраду. Формы самаарганізацыі і самаініцыятывы разьвітыя слаба. „Сярэдняя кляса“ істотна скарацілася за апошняе дзесяцігодзьдзе. Першы раз гэта адбылося пад час гайдараўскай рэформы. У жніўні 1998 г. адбыўся другі абвал, зьвязаны з крызай фондавага рынку.
Сацыяльнай структуры, якая склалася, адпавядае і дзяржаўны лад сучаснай Расіі, ейны палітычны рэжым, які называюць „лібэральнай манархіяй“ ці „асьвечаным аўтарытарызмам“. Вельмі важным зьяўляецца аналіз тэндэнцыяў. Калі мы параўнаем стан грамадзянскіх правоў і свабодаў у 1980 г. з сучаснай сытуацыяй у Расіі, то, без сумневу, заўважым наяўнасьць велізарнага прагрэсу; але калі правядзем параўнальны аналіз сытуацыі 1991 г. з сучаснасьцю, то мы ўпэўненыя, што падставаў для аптымізму стане значна менш. Неабходна шчыра адказаць на фядотаўскае пытаньне: ці не адбываецца зараз у Расіі чарговая спроба дасягненьня эканамічнага і вайскова-палітычнага прагрэсу коштам свабоды, ці ўсё ж такі, нарэшце, гэтыя рэчы супадаюць? На нашу думку, менавіта першае зьяўляецца сапраўдным.

9.

Вяртаньне Расіі да капіталізму не суправаджалася рэстаўрацыяй „кемалісцкай“ стратэгіі ейных узаемадачыненьняў з Захадам. Крах камунізму ў СССР нарадзіў у многіх заходніх інтэлектуалаў спадзяваньні на хуткую лібэралізацыю і дэмакратызацыю ўсіх краінаў былога Саюзу. Але, як сьведчыць практыка, з 15 рэспублік толькі краіны Балтыі дасягнулі бясспрэчных посьпехаў на шляху лібэралізацыі. Усе астатнія новыя незалежныя дзяржавы ўяўляюць сабой тую ці іншую форму аўтарытарных рэжымаў. Што тычыцца Расіі, то ейная капіталізацыя прывяла нават да

павелічэньня таго цывілізацыйнага бар'еру, які аддзяляе яе ад Захаду.

У савецкія часы дыскусія паміж „славянафіламі“ і „заходнікамі“, паміж Салжаніцыным і Сахаравым, не адбывалася ў вельмі вострых формах, бо перад імі быў адзіны магутны вораг — камуністычная сыстэма, якую неабходна было перамагчы. Цяпер, калі прывід камунізму сыходзіць у нябыт, фундамэнтальнае значэньне набывае пытаньне цывілізацыйнага выбару. Ці павінна Расія адаптаваць заходнія вартасьці, інстытуты і практыку і ператварыцца ў частку заходняга сьвету, ці ўсё ж яна — асобная праваслаўная або эўразійская цывілізацыя, адрозная ад Захаду і са сваёй гістарычнай місіяй быць злучнікам Эўропы і Азіі? Інтэлектуальныя і палітычныя эліты, як і грамадзтва ў цэлым, сур'ёзна разыходзяцца паміж сабой, адказваючы на яго. З аднаго боку, склалася групоўка „новых заходнікаў“, якіх апанэнты называюць „касмапалітамі“ ці „атлянтыстамі“; з другога боку, вельмі моцныя пазыцыі займаюць „нэаславянафілы“: „эўразійцы“ і „дзяржаўнікі“.

Прынцыповая розьніца паміж імі зьвязаная з выбарам прыярытэтаў замежнапалітычнага курсу і, у другую чаргу, са зьместам і характарам эканамічных і палітычных рэформаў. Памяркоўныя дзяржаўнікі прапаноўвалі адмовіцца ад „атлянтызму“, за які выступалі „заходнікі“, і аддаць перавагу абароне расійскіх інтарэсаў у іншых краінах, а зыходзячы з наяўнасьці традыцыйных цюрцка-мусульманскіх кантактаў Расіі, ажыцьцявіць карэнную пераарыентацыю ейных рэсурсаў, сувязяў і інтарэсаў з Захаду на Ўсход. Прадстаўнікі гэтага кірунку адрадзілі і мадэрнізавалі агучаную ў 1920 г. ідэю Пятра Савіцкага аб тым, што Расія зьяўляецца ўнікальнай эўразійскай цывілізацыяй.

Скрайнія дзяржаўнікі падзеленыя міжсобку на славянскіх нацыяналістаў, кшталту Салжаніцына, якія выступаюць за абмежаваньне імпэрыі славянска-праваслаўнымі тэрыторыямі і далучэньне да Расіі Ўкраіны й Беларусі, і імпэрскіх нацыяналістаў, якія выступаюць за адраджэньне і нават пашырэньне межаў былога СССР. Прадстаўнікі апошняй групы маюць выразныя антысэміцкія і антызаходнія настроі. Яны таксама выступаюць за пераарыентацыю замежнай палітыкі з Захаду на Ўсход і Поўдзень, пабудову вайсковага блёку з

мусульманскімі краінамі альбо з мусульманскімі краінамі і Кітаем супраць Захаду. Абапіраючыся на настроі ў расійскім грамадстве, якія склаліся не на карысьць інтэграцыі краіны ў агульнаэўрапейскі дом, прыхільнікі жорсткай лініі адцясьнілі памяркоўных „заходнікаў“ ад улады і дамагліся істотных зьменаў у палітыцы Расіі, якая ў канцы 90-х гадоў, пасьля косаўскага канфлікту, набыла яскрава антызаходні выгляд. Многія расійскія інтэлектуалы лічаць, што сёньняшні аўтарытарны рэжым — гэта цана, якую расійскае грамадзтва вымушанае заплаціць за адносную стабільнасьць і „ўстойлівую недатыкальнасьць асобы“. На нашу думку, гэта перш за ўсё цана за ўтрыманьне імпэрыі. М.Сакалоў ня мае рацыі, калі піша, што 12 чэрвеня 1990 г. дэлегаты Зьезду народных дэпутатаў РСФСР, прагаласаваўшы за сувэрэнітэт Расіі, тым самым зрабілі выбар на карысьць нацыянальна-дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі: „*Ідэя нацыянальнай дзяржавы была прынамсі зразумелай — ёсьць Францыя, ёсьць Нямеччына, ёсьць Швэцыя, дык вось будзе і Расія, тады як выразнай артыкуляцыі савецкай ідэі... не было ўвогуле*“.

На нашую думку, тое галасаваньне было прызнаньнем факту страты колішняй вонкавай імпэрыі Расіі, якая распалася ў выніку антыкамуністычных рэвалюцыяў у Цэнтральнай Эўропе і спробай стварыць неабходныя перадумовы для адбудовы яе ў новых формах і ў межах СССР, адначасова ўмацаваўшы ўнутраную імпэрыю ў выглядзе Расійскай Фэдэрацыі. Дэклярацыя сувэрэнітэту РСФСР і „парад сувэрэнітэтаў“, які адбыўся адразу пасьля гэтай падзеі ў саюзных і аўтаномных рэспубліках, быў цалкам сплянаванай і скаардынаванай у Маскве акцыяй, якая мусіла прадухіліць горшы для Расіі сцэнар разьвіцьця сытуацыі ў Саюзе па балтыйскім варыянце. Гэты плян удаўся толькі напалову: краіны Балтыі выйшлі з СССР, Савецкі Саюз распаўся фактычна пасьля жнівеньскага путчу 1991 г. і юрыдычна пасьля падпісаньня Белавескіх пагадненьняў і іхнай ратыфікацыі, СНД, якое павінна было выконваць ролю „мяккай імпэрыі“, забясьпечваючы палітычны, вайсковы і эканамічны ўплыў Расіі на фармальна незалежныя краіны, прадэманстравала сваю недзеяздольнасьць; падтрымка расійцамі сэпаратыстаў у Абхазіі, Паўднёвай Асетыі, Прыднястроўі, правакаваньне імі канфліктаў у Карабаху, Кіргізстане, Таджыкістане на нейкі час дало магчымасьць

забясьпечыць расійскі ўплыў у розных рэгіёнах былога СССР, але паступова то адна, то другая краіна гэты ўплыў аслаблялі. Ад новай вонкавай імпэрыі на сёньня застаюцца Арменія, чыё геапалітычнае становішча і тэрытарыяльны канфлікт з Азэрбайджанам прымушаюць падтрымліваць шчыльныя сувязі з Масквой, Таджыкістан, чые сувязі з Масквой слабеюць, і Беларусь, якая трапіла ў пастку з-за антыпатрыятычнай палітыкі А.Лукашэнкі. Пры гэтым разьвіцьцё падзеяў на Паўночным Каўказе і дзьве крывавыя вайны супраць Чачэніі засьведчылі, што пагроза існуе ня толькі для вонкавай, але і для ўнутранай імпэрыі Расіі.

Варта заўважыць, што паколькі Расія ніколі не была і не імкнулася быць нацыянальнай дзяржавай, разуменьне прадстаўнікамі ейнай палітычнай эліты вартасьці выбару на карысьць яе выклікае вялікія сумневы. Г.Фядотаў у свой час пісаў, што „*калі б Расія была нацыянальнай дзяржавай, як Францыя ці сучасная Нямеччына, адказ* (на пытаньне аб лёсе краіны ў выпадку ейнай паразы ў магчымай вайне з Захадам — **У.Р.**) *быў бы адносна простым і не такім для яе трагічным… Аднак справа ўскладняецца тым, што Расія не нацыянальная дзяржава, а шматнацыянальная Імпэрыя; апошняя, адзіная ў сьвеце, якая засталася пасьля ліквідацыі ўсіх Імпэрыяў. Было б цудам, калі б яна выйшла непашкоджанай з той катастрофы, якае яе чакае. Мы не жадалі бачыць складанай шматплямённасьці Расіі. Для большасьці з нас перакройваньне Расіі ў СССР, намінальную фэдэрацыю народаў, здавалася небясьпечным маскарадам, за якім хаваецца ўсё тая ж расійская Расія ці нават сьвятая Русь. Як растлумачыць нашую ілюзію? Чаму расійская інтэлігенцыя ў XIX ст. забылася, што яна жыве не ў Расіі, а ў Імпэрыі? Тэмы палітычнага вызваленьня і сацыяльнай справядлівасьці завалодалі ёю цалкам, да запамарачэньня. З пункту гледжаньня гуманітарнага і лібэральнага ганіліся Імпэрыі, усе Імпэрыі, як гвалт над народамі, але вынікі гэтага гвалту прымаліся як бясспрэчныя. Інтэлігенцыя абуралася гвалтоўнай русіфікацыяй альбо хрышчэньнем іншародцаў, але гэтае абурэньне адносілася да мэтадаў, а ня мэтаў. Асыміляцыя ўспрымалася як непазьбежнае наступства цывілізацыі. Яшчэ паўстагодзьдзя ці стагодзьдзе, і ўся Расія будзе чытаць Пушкіна па-расійску і ўсе этнаграфічныя перажыткі зробяцца набыткамі музэяў і спэцыялізаваных*

часопісаў. Так укаранілася ў сьвядомасьці ня толькі лібэральнай, але часткова і рэвалюцыйнай інтэлігенцыі наіўнае ўяўленьне аб тым, што расійская дзяржава, у адрозьненьне ад усіх дзяржаваў Захаду, будавалася ня гвалтам, а мірнай экспансіяй, не заваёвамі, а калянізацыяй".

Гэтае „неразуменьне" прадстаўнікамі расійскай эліты імпэрскай сутнасьці сваёй дзяржавы перайшло ў спадчыну да сучаснай інтэлектуальнай і палітычнай клясы, якая фармуе масавую сьвядомасьць расійскага грамадзтва. Таму нічога дзіўнага няма ў тым, што гэтая сьвядомасьць зьяўляецца паранейшаму разарванай. З аднаго боку, яна ўспрымае разбурэньне СССР як нацыянальную трагедыю; народы расійскіх аўтаноміяў — як тыя, што павінны быць удзячнымі свайму лёсу за тое, што засталіся разам зь вялікім расійскім народам; успрымае тэрыторыю, вайсковую магутнасьць і далучэньне новых земляў як вартасьці больш значныя, чым упарадкаваньне сваёй зямлі. З другога боку, яна лічыць, што СССР разьвіваўся коштам прыніжэньня дзяржаўнасьці Расійскай Фэдэрацыі; яна шукае расійскую нацыянальную ідэю, якая павінна стаць грунтам згоды і прымірэньня ўсіх сацыяльных і нацыянальных групаў краіны.

Нявыкараненасьць імпэрскіх ідэяў з сацыяльнай сьвядомасьці непазьбежна нэгатыўна ўплывае на лёс свабоды ў Расіі. Думка, што „ня можа быць свабодным народ, які занявольвае іншыя народы", зь цяжкасьцю прыжываецца на расійскай глебе, што вымушае рабіць самыя пэсымістычныя прагнозы пра пэрспэктывы свабодаў і дэмакратыі ў Расіі. Зноўку вернемся да Фядотава: „*Для самой Расіі гвалтоўны працяг імпэрскага быцьця значыў бы страту надзеі на ейную асабістую свабоду. Ня можа дзяржава, якая існуе тэрорам на палове сваёй тэрыторыі, забясьпечыць свабоду для другой паловы. Як пры маскоўскіх царох самадзяржаўе было коштам, заплочаным за экспансію, так фашызм зьяўляецца адзінай сыстэмай уладкаваньня, здольнай падоўжыць існаваньне катаржнай Імпэрыі. Вядома, коштам далейшага пагаршэньня ейнай культуры*".

Гэтак сучасны расійскі капіталізм, ня маючы належнага культурна-цывілізацыйнага грунту, пакуль не стварае перадумоваў для пасьлядоўнай лібэралізацыі краіны, разьвіцьця дэмакратычных інстытутаў і прынцыпаў. Больш за тое, пагроза фашызацыі „капіталістычнай" Расіі зьяўляецца

абсалютна рэальнай. „Мяккі фашызм“ *a la Mussolini* ўжо знайшоў там сваіх „лібэральных“ прыхільнікаў і ідэолягаў. Для Расіі фашысцкая пэрспэктыва робіцца магчымай яшчэ й таму, што фашыстоўская эканамічная мадэль (зьмяшаная эканоміка і дзяржаўнае рэгуляваньне прыватнага капіталу) у прынцыпе задаволіла б сёньняшнюю паноўную эліту, якая баіцца вяртаньня да камуністычнай казармы, але звыкла да супрацоўніцтва зь дзяржаўным апаратам.
З 1993 г. Расія дрэйфуе ад дэмакратыі да дыктатуры. Чым скончыцца гэты дрэйф і якая форма аўтарытарызму ці таталітарызму паўстане ў канцы шляху, невядома. Але факт, што трэцяя ў XX ст. спроба рэалізацыі ідэяў свабоды ў Расіі пацярпела паразу. Тое, пра што так яскрава пісаў Фядотаў: „*...імпэрская сьвядомасьць кармілася ня столькі інтарэсамі дзяржавы — тым менш народу, — колькі юрам улады: патасам няроўнасьці, радасьцю прыніжэньня, гвалту над слабымі. Страта імпэрыі ёсьць маральным ачышчэньнем, вызваленьнем расійскай культуры ад страшэннага ярма, што перакручвае ейнае духоўнае аблічча. Вызваленая ад ваеннага і паліцэйскага клопату Расія зможа вярнуцца да сваіх унутраных праблемаў — да пабудовы выпакутаванай у страшэнных пакутах свабоднай сацыяльнай дэмакратыі*“, — застаецца непрачытаным суайчыньнікамі філёзафа.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by

Кнігі і артыкулы, цытаваныя ў тэксьце:
D.Apter, „The Role of Traditionalism in the Political Modernization of Ghana and Uganda“
// World Politics, #13, October, 1960.
D.Bell. The Cultural Contradictions of Capitalism. — New York: Harper Collins, 1976.
S.Huntington. The Clash of Civilizations. Remaking of World Order. — New York: Touchstone, 1996.
Н.А.Бердяев. Истоки и смысл русского коммунизма. Москва: Наука, 1990.
Н.А.Бердяев. О России и русской философской культуре. Философы русского послеоктябрьского зарубежья. — Москва:

Наука, 1990.
У.Лакер. Россия и Германия. Наставники Гитлера. — Вашингтон: Проблемы Восточной Европы, 1991.
В.В.Леонтович. История либерализма в России // Опыт русского либерализма. Антология. — Москва: Канон, 1997.
М.Ю.Соколов. Поэтические воззрения россиян на историю: в 2-х кн. — Москва: SPSL —„Русская панорама“, 1999.
П.Б.Струве. Patriotica: Политика, культура, религия, социализм. — Москва: Республика, 1997.
Г.П.Федотов. Судьба и грехи России // Избранные статьи по философии русской истории и культуры. — Санкт-Петербург: София, 1991.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

АНДЖЭЙ КАРАШЭЎСКІ польскі публіцыст, сталы аўтар часопіса ***Kultura***.

Анджэй Карашэўскі
Паміж багацьцем і беднасьцю

David S. Landes, The Wealth and Poverty of Nations. Why some are so rich and some so poor.
New York: W.W.Norton, 1998.

Рэлігія ёсьць часткай культуры, можа, нават найважнейшай часткай культуры, якая фармуе спосаб нашага мысьленьня і ўсю сыстэму маральных пачуцьцяў. Няверуючыя, і нават проста антыклерыкалы калі-нікалі думаюць, што гэтая важнасьць рэлігіі ў нашым жыцьці іх не датычыць, але гэта памылковае ўражаньне. Мы спадкаемцы мэнтальнасьці, сфармаванай пад час доўгатрывалага гістарычнага працэсу, незалежна ад таго, ці належым мы да традыцыяналістаў ці да бунтаўнікоў. Тэарэтычна ўсе мы ўсьведамляем, што рэлігіі былі пачаткам і фундамэнтам новых цывілізацый, і гэтыя ж рэлігіі ставаліся каменем на шыі, робячы немагчымым паразуменьне ды прыстасаваньне да новых умоваў у зьмененым сьвеце. На практыцы мы зазвычай адносім гэтую веду да далёкай гісторыі, глыбока перакананыя, што яна мала стасуецца сучаснасьці. Мы ведаем, што арабскі сьвет страціў сваю дынамічнасьць і ўспрымальнасьць на пераломе XIII і XIV стагодзьдзяў і дагэтуль яе не вярнуў. Кітай стагодзьдзямі чэрпаў натхненьне з твораў Канфуцыя, каб застыгнуць нарэшце ў самаўпэўненым перакананьні, што, маўляў, сьвет нічога ня можа яму прапанаваць. Чым больш артадаксальную галіну хрысьціянства спавядае краіна, тым больш у ёй бедных, што пакладаюцца на

ласку божую. Усе праваслаўныя краіны сёньня больш адсталыя, чымся краіны каталіцкія, а краіны з каталіцкай традыцыяй натужна адпрацоўваюць запазычанасьць перад пратэстанцкімі краінамі. Шукаючы крыніцы багацьця нацыяў, Адам Сьміт на першае месца стаўляў вольны абмен тавараў і паслугаў. У гэты самы час у Польшчы абсалютная бальшыня палітычных і рэлігійных элітаў трактавала такія ідэі як герэзію, абразьлівую для Бога. Пакуль Бог маўчыць, тлумачэньне таго, што Яго абражае, бяруць на сябе простыя сьмертныя.
Пытаньне Адама Сьміта пра крыніцы багацьця нацыяў застаецца ў сіле. Два гады таму ў Злучаных Штатах зьявілася кніга аднаго з найлепшых сучасных гісторыкаў эканомікі Дэвіда Лэндза пад прыкметнай назвай „Дабрабыт і галеча нацыяў: чаму адны багацеюць, іншыя галеюць?“. На працягу некалькіх месяцаў гэтая кніжка некалькі разоў перавыдавалася і перакладалася на многія замежныя мовы. Лэндз ня мае аднаго адказу на пытаньне пра крыніцы багацьця адных і прычыны беднасьці іншых нацыяў. Надзвычайна маляўніча ён апісвае эканамічную гісторыю сьвету, паказваючы, якая незьлічоная колькасьць чыньнікаў (і выпадкаў) вызначае лёс нацыі. Але найперш ён вучань Адама Сьміта і Макса Вэбэра. Акурат культура, ці хутчэй сфармаваная рэлігійнай традыцыяй мэнтальнасьць вырашальна ўплывае на здольнасьць разьвязваць узьніклыя праблемы ці, наадварот, заставацца ў зачараваным коле беднасьці, укрыўджанасьці, няўдалых паўстаньняў, рэвалюцыяў і дыктатураў.

Увага аўтара засяроджваецца перадусім на эстафэтнай палачцы лідэраў і на лёсе тых, каму ўзнагародай ёсьць толькі мартыралёгія. У шмат якіх выпадках учорашнія лідэры апынаюцца аўтсайдэрамі. Кітайцы дагэтуль цешацца тым, што шмат вынаходзтваў, якія сталіся нарожнымі камянямі прагрэсу Эўропы, былі пазычаныя ў іх. Праблема, аднак, у тым, што калі хрысьціянская цывілізацыя заахвочвала людзей, якія цікавіліся інавацыямі і шукалі новае прыстасаваньне розным вынаходзтвам, кітайская цывілізацыя сфармавала тып чалавека, перакананага ўва ўласнай дасканаласьці, упэўненага, што рэшта сьвету — гэта барбары, ад якіх варта адмежавацца. Першыя партугальскія місіянэры, прыбыўшы ў Кітай, прывезьлі з сабой гадзіньнік, эпахальнае вынаходзтва, якое адкрывала

шлях навуцы, новым формам мэханізацыі, новаму грамадзкаму ладу. Гадзіньнік зацікавіў нават кітайцаў, але дзеля таго што спрэчка вялася пра тое, атрыбуты чыйго розуму маюць больш боскую сілу (а езуіты не хавалі, што гадзіньнік ды іншыя вынаходзтвы ёсьць довадам эўрапейскай вышэйшасьці і павінны служыць аргумэнтам на карысьць пераходу ў праўдзівую веру), кітайцы зразумелі намёк і дзеля прынцыпу разам з вадою вылілі і дзіцянё.

На думку Лэндза, наперад пэлетону Эўропу выштурхнула тое, што менавіта тутака было вынайдзенае вынаходзтва. І тут ён зноў спасылаецца на Сьміта: умоваю попыту на інавацыі быў пераход да таварнай эканомікі і сыстэматычнае расшырэньне рынку. Пад канец Сярэднявечча, адначасна з вызваленьнем ад прыгону і паступовым пераходам да чыншавай эканомікі, мы назіраем у Заходняй Эўропе тэхналягічны выбух. Здаўна вядомаму вадзяному млыну знаходзяць новае прыстасаваньне. Лэндз надзвычай высака ацэньвае вынаходзтва акуляраў, якія на пачатку XIV стагодзьдзя масава выраблялiся ў Італіі, — яны ня толькі падаўжалі прадукцыйны век шмат якіх рамесьнікаў, але й выкрывалі новы абсяг дасьледаваньня навакольнага сьвету. Мэханічны гадзіньнік быў ня толькі ключом да новай мэханікі, але і вынаходзтвам велізманнага палітычнага значэньня. Створаны напрыканцы XII стагодзьдзя, ён пашырыўся з хуткасьцю маланкі, падрываючы царкоўную манаполію на вымярэньне часу. Царкоўны час быў часам „прыродным“, і больш як сто гадоў Царква не прызнавала д’ябальскага вынаходзтва. Такім чынам, у першыя часы новыя цуды тэхнікі напышліва ўзвышаліся на вежах ратушаў, узбуджаючы цікавасьць разявакаў і зьмяншаючы прычараваньне храмаў. Паступова не царкоўны звон, а гадзіньнік на ратушы стаў рэгуляваць час працы й публічных спатканьняў. Гэта была рэвалюцыя, значэньне якой не маглі ацаніць яе творцы. Але яе адчулі мусульмане, і, падобна да кітайцаў, адкінулі новае вынаходзтва, глыбака перакананыя, што не машына, а малітва мае рэгуляваць чалавечы час.

Разам зь зьяўленьнем мэханічнага гадзіньніка ў тэхніцы адкрываўся шлях да дакладнасьці і мініятурызацыі. Існуе цесная сувязь паміж мэханічным гадзіньнікам і цэлай гамай інструмэнтаў, якія адразу распаўсюдзіліся і ў мястох, і ў сёлах. Чарговым вынаходзтвам, якое ў вялікай меры паспрыяла

эўрапейцам у доўгатрывалым утрыманьні першынства ў эканамічнай канкурэнцыі, быў друк. Падобна да паперы, пораху і дзясяткаў іншых рэчаў, якія вынайшлі кітайцы, але ўдасканалілі і ўвялі ў агульны ўжытак эўрапейцы, друк стаў пашыральнікам навукі, тэхнічных і арганізацыйных вынаходстваў.

Адкуль гэтая розьніца ў падыходзе, адкуль узялося гэтае зацікаўленьне навакольным сьветам і тэхнікай, і як вынік гэты попыт на новыя вынаходзтвы? Перш як утварыўся адносна вялікі рынак з грашыма і кліентурай, яму папярэднічала традыцыя атэнскай дэмакратыі, а пасьля хрысьціянскага двоеўладзьдзя. Хрысьціянская Эўропа не зазнала дэспатычнай манаполіі рэлігійнай ці палітычнай улады. Богу богава, кесару кесарава. Апрача таго, з двума панамі заўсёды лягчэй. Усходні дэспатызм, які Лэндз называе гідраўлічным, меў, аднак, свае градацыі. Японцы, якія перанялі пісьмо, рэлігію і большую частку тэхнічнай культуры ад кітайцаў, ня мелі маральнага супраціву, прымаючы навацыі і ад іншых. Яны зь першага моманту захоплена зрэагавалі на эўрапейскія вынаходзтвы, да таго ж ня толькі што да самой тэхнікі, але і што да папулярызаванай пры яе пасярэдніцтве рэлігіі. Хто ведае, якім быў бы далейшы лёс Японіі, калі б ня поўная шчырасьць прыбышоў з Эўропы, якія паінфармавалі, што падпарадкаваньне новых краін — вельмі лёгкая і зручная справа дзякуючы дапамозе тых, хто спавядае новую супольную веру. У такой сытуацыі японцы забілі зь дзьве сотні белых і не адзін дзясятак тысяч раскосых хрысьціян і спынілі ўсё гэта на некалькі стагодзьдзяў. І што самае дзіўнае: іхная гатовасьць пераймаць навінкі ад іншых ператрывала гэтую досыць доўгую пярэрву.

Надзвычай павучальна прасачыць, як эканамічнае першынство пераходзіла ад адной краіны Эўропы да другой. Неймаверныя посьпехі італійскіх мястоў, Францыі, маленькай Партугаліі, Гішпаніі — і страта гэтай перавагі амаль неўзабаве, тады, калі Царква ставалася адзіным вартаўніком якой-любя праўды. Рэлігійная артадаксальнасьць прыводзіла, з аднаго боку, да выбуху ксэнафобіі (як рэлігійнай, так і этнічнай), зь іншага — да хваравітай падазронасьці да ўсяго новага. Люстрацыі падлягала ўсё наскрозь, а асьветныя ўстановы дбалі перадусім пра тое, каб вынішчыць нездаровую цікавасьць. Наступствы не

прымусілі чакаць: абязьлюджваньне мястоў, уцёкі спэцыялістаў у іншыя краіны, расавыя і рэлігійныя чысткі, якія спустошылі банкаўскую сфэру, гандаль, мэдыцыну і г.д., абыякавасьць да навукі і скарачэньне рынку. Неўзабаве ўсе гэтыя зьмены даюцца ў знакі таксама пры арганізацыі і ўзбраеньні войска. Сьвяты Дух быў на баку езуітаў, але рахункі за стаўку на неталерантнасьць аплачвалі падданыя багабойных валадароў.

Шмат месца прысьвечвае Дэвід Лэндз аналізу розных узораў пратэстанцкага і каталіцкага каляніялізму. Гішпанцы і патругальцы вырушаюць у сьвет на пошукі залатога руна. Сёньня, з гістарычнай пэрспэктывы, мы можам сказаць, што Паўночная Амэрыка мела проста лепшыя прыродныя ўмовы — лепшую зямлю, лепшы клімат, лепшыя камунікацыйныя магчымасьці, важную сыравіну. Аднак ад самага пачатку пратэстанцкія і каталіцкія калянізатары стаўлялі сабе цалкам розныя мэты. Гішпанцы і партугальцы шукаюць найперш золата і срэбра. У чарговыя паходы амаль на сто працэнтаў рушылі маладыя адзінотныя мужчыны са зьбяднелай шляхты. Тым часам сярод брытанскіх або галяндзкіх калянізатараў пераважалі цэлыя сем'і, як правіла, тут ёсьць таксама земляробы і рамесьнікі. У першую фазу калянізацыі імгненна павялічваюцца гішпанскія і партугальскія запасы золата і срэбра, выклікаючы лавінападобнае ўзрастаньне імпарту і паступовае скарачэньне ўласнай вытворчасьці. Сыстэма пасяленьня ў заваяваных краёх падпарадкоўваецца таму самаму прынцыпу ксэнафобіі, які дзейнічае ў мэтраполіі. У гішпанскія калёніі пускаюць толькі гішпанцаў-каталікоў. Партугальцы мусілі быць больш цярпімымі і прымалі кожнага, абы гэта толькі быў шчыры каталік. Адміністрацыйная сыстэма гэтых калёній займалася перадусім транспартаваньнем здабычы на бацькаўшчыну і пільнаваньнем духоўнай чысьціні. Першы занятак быў дастаткова прыбытковым, каб карупцыя сталася галоўным прынцыпам падзелу пасадаў у калёніях, а другое дазваляла не дапускаць на поле бітвы ўсіх непажаданых праціўнікаў. Гішпанцы пачуваліся валадарамі найвышэйшай духоўнай культуры і бяз зайздрасьці пазіралі на захоп „убогіх" земляў брытанцамі і на прымітыўныя звычаі жыхароў брытанскіх калёніяў. У той час, калі брытанскія і галяндзкія калёніі імгненна сталіся самастойнымі ў сфэры вытворчасьці

інструмэнтаў, зброі, караблёў і г.д., каталіцкія калёніі амаль усё завозілі з сваіх мэтраполіяў (а дзеля таго што вытворчасьць там заняпала, гэта часта былі брытанскія або нямецкія вырабы). Злучаныя Штаты здабылі незалежнасьць, бо адчулі сябе эксплюатаванымі, а насельніцтва ня мела ахвоты згаджацца з абмежаваньнямі эканамічнага разьвіцьця, якія наклаў Лёндан. Краіны Паўднёвай Амэрыкі стаюцца незалежнымі ў XIX стагодзьдзі ў выніку палітычнага і эканамічнага банкруцтва іхных мэтраполіяў. Незалежнасьць звалілася на іх так сама нечакана, як нядаўна на колішнія савецкія рэспублікі.

Лэндз зьвяртаецца да пытаньня, над якім ужо шмат хто задумваўся: чаму прамысловая рэвалюцыя адбылася ў Англіі і ці сапраўды гэта была рэвалюцыя? Для яго другая частка гэтага пытаньня ёсьць уступам да адказу на першую. Выбух вынаходніцтва на пачатку XIX стагодзьдзя — гэта толькі паскарэньне працэсу, які цягнуўся ўжо задоўга перад гэтым. Чаму ў Англіі — бо Англія першая адмовілася ад прыгону і перайшла на чыншавае гаспадараньне ў земляробстве, бо мела найбольш разьвіты падзел працы, бо мела найвышэйшы адсотак пісьменнага насельніцтва, бо рамяство не было абмежавана цэхамі да такой ступені, як у іншых краінах, бо тут быў найбольшы развой дакладных навук і найбольшае назапашваньне тэхнічнай веды. Чаму ў Англіі, а не ў Нямеччыне, Італіі або Францыі? Рэнэсанс зь яго паваротам да дакладных навук пачаўся ў Італіі, але італійскія або ганзэйскія месты цярпелі на гіпэртрафію ўлады рамесьніцкіх цэхаў, якія дбалі пра тое, каб масавая вытворчасьць не нанесла шкоды іхным прыбыткам. Штосьці падобнае было ў Францыі. Больш за тое, Францыя і Італія ў выніку контрарэфармацыі, перасьледу пратэстантаў і жыдоў страцілі мноства спэцыялістаў. (Лэндз зьвяртае ўвагу на тое, што, напрыклад, бальшыню французскіх вытворцаў гадзіньнікаў складалі пратэстанты, і яны або загінулі, або былі выгнаныя.)

Іншай спадчынай Сярэднявечча (нашмат мацнейшай на мацерыку, чымся ў Англіі) былі бар'еры межаў і мытняў, якія перашкаджалі гандлю. Мытныя зборы на ўсіх месцкіх раздарожжах і на рэчках. „Валы і жыды па чатыры шэлегі", — цытуе Лэндз шыльду, што вісела на брамах шмат якіх нямецкіх мястоў. Безумоўна, усе гэтыя зборы стваралі ніяк не падваліны

інфраструктуры, а толькі перашкоды для гандлю. У Нямеччыне гэтыя мытні выглядалі на параною. Толькі Напалеон прымусіў звольніць гандаль ад мытаў па лініі Рэйну, пасьля мытную сыстэму спрабавалі ўпарадкаваць у 1834 годзе, але ў асобных нямецкіх краінах раздарожжы пасьпяхова служылі бар'ерам для прагрэсу гандлю яшчэ ў сямідзясятых гадох мінулага стагодзьдзя. Хто ведае, ці толькі разьвіты заморскі гандаль, ці таксама іншыя чыньнікі абумовілі тое, што пошасьць мытных бар'ераў нарабіла менш шкоды ў Англіі, чымся ў якой-любя іншай краіне Заходняй Эўропы, аднак гэта мела значэньне для разьвіцьця рынку і для пашырэньня тэхнічных навацыяў. Шмат значыў для пачатку прамысловай рэвалюцыі ў Англіі таксама факт вельмі разьвітай перад тым саматужнай вытворчасьці ваўняных тканін. Забаўна, бо задоўга да прамысловай рэвалюцыі шукалі магчымасьці мэханізацыі прадзеньня і ткацтва, але пералом зьдзеяўся ў сувязі з імпартам бавоўны з Індыі. Бавоўна дзякуючы даўжэйшаму валакну аказалася лягчэйшым матар'ялам. Аднак з таго моманту, калі зьявіліся першыя прадзільныя машыны і кросны, мэханізацыя ўва ўсёй тэкстыльнай прамысловасьці рушыла поўным ходам.

Лэндз шмат разоў падкрэсьлівае, што пры вялікіх інавацыйных скачках усё залежыць ад таго, ці гатовае да іх грамадзтва і ці будзе суправаджацца выкарыстаньне новых прыладаў належным доглядам за імі, ці зьявіцца служба іхнага рамонту і тэндэнцыя да іх сыстэматычнага ўдасканаленьня. Адсутнасьць догляду і абслугоўваньня — сыстэматычная прычына паразаў уводжанай зьверху індустрыялізацыі або (як было ў выпадку з былымі калёніямі) перайманьня гатовай інфраструктуры новай уладай. Лэндз падае статыстыку шляхоў камунікацыі, пакінутых калянізатарамі ў Індыі і Афрыцы, і беспрэцэдэнтна хуткі тэмп іх зьнішчэньня. Ён таксама паказвае, як часта поўным непаразуменьнем абярталіся розныя праекты дапамогі такім краінам, якія ня бралі пад увагу культурных і кліматычных адметнасьцяў і ўзроўню падрыхтаванасьці спажыўцоў. Мары пра раптоўны скачок у сучаснасьць, якую стварыў нехта іншы, зазвычай аказваліся кульбітам у парожні басэйн. Адной з прычын гэтых трагічных паводле наступстваў задумаў ёсьць памылковая інтэрпрэтацыя каранёў уласнай

адсталасьці. Былыя калёніі або напаўкалёніі маюць глыбокую патрэбу тлумачыць усе свае паразы эксплюатацыяй каланізатараў і мэтаскіраваным тармажэньнем прамысловага разьвіцьця ў іхных краінах. Калі пры гэтым закранаюцца рэлігійныя адметнасьці, гарчэль набывае дадатковы сакральны вымер. Цалкам ігнаруецца факт, што гэтыя краіны лучылі ў залежнасьць з-за папярэдніх слабасьцяў, найважнейшымі зь якіх былі, як правіла, прымусовая праца, адсутнасьць падзелу працы, фанатызм, блякаваньне асьветы ўладнымі элітамі і глыбокая варожасьць да вольнага гандлю. Бачачы ўсялякія перашкоды толькі ў вонкавых чыньніках, яны трапляюць у чарговыя пасткі, якія яшчэ больш аддаляюць іх ад найбольш разьвітых краін. Тут зьяўляецца чарговы элемэнт зачараванага кола: дзеля таго што гэта сьвет вінаваты ў нашай нядолі, то новыя праблемы выклікаюць узмацненьне разнастайных фанатызмаў і радыкалізмаў. Лэндз не належыць да палітычна карэктных. Ён ніяк не спрабуе прыменшыць сквапнасьць і драпежнасьць магутнейшых, але таксама ўважае, што танная сэнтымэнтальнасьць да тых, хто апынуўся ў прайгранкавым становішчы, нікому не дапамагае. Арабскія краіны і надалей характарызуе дэспатызм, а паступленьні ад продажу нафты блізу не павелічаюць іх вытворчых магутнасьцяў. Лацінская Амэрыка часткова страціла сваю глыбокую варожасьць да Злучаных Штатаў і зь пераменным посьпехам спрабуе сёньня мадэрнізаваць сваю эканоміку. Але і надалей тут не відаць нават спробы аналізу і разуменьня нутраных прычын назапашаных праблем. Падобнаю, толькі значна горшаю, бачыцца сытуацыя ў Расіі. Наколькі тут вінаваты камунізм, а наколькі мы маем справу з ранейшай спадчынай? На палёх роздумаў пра тое, чаму прамысловая рэвалюцыя зьдзеялася ў Англіі, Дэвід Лэндз піша:

„Усходняя Эўропа была, нібы іншы сьвет. У славянскіх краінах, асабліва ў Расіі, сыстэма паншчыны трымалася ў сваёй найгоршай форме. Бязьмежныя багацьці ў руках арыстакратыі азначалі нечуванае зьмяншэньне попыту на асноўныя прамысловыя тавары, попыту, які мог бы прывесьці да стварэньня масавай вытворчасьці... Насельніцтва было прызвычаенае да беднасьці і ня мела панятку пра вонкавы сьвет, Расія была дзяржавай зь вялікімі тэрытарыяльнымі амбіцыямі.

Рана (з XVI стагодзьдзя) яна спрабавала вучыцца ў Захаду, хаця б для таго, каб здабыць самастойнасьць у вырабе зброі. Як дзяржаве, Расіі патрабавалася прамысловасьць, і царскі ўрад заахвочваў іншаземцаў адкрываць фабрыкі або працаваць на расейскіх фабрыках. Асобныя арыстакраты нават заахвочвалі прадпрымальных сялян ствараць майстэрні ў абмен на чынш. Але вынік прыводзіў толькі да ўзьнікненьня выспачак хірлявай прамысловасьці.
Расійскія прадпрыемствы ніколі ня дзеялі ў тым самым сьвеце, што заходнія прадпрыемствы“.
Зьмяняюцца гістарычныя дэталі й дэкарацыі няўдалых гаспадарчых рэформаў, застаецца сама сутнасьць праблемы: прыдушаная ўласнымі элітамі свабода гандлю, станавая або каставая сыстэма, якую аберагаюць рэлігійныя структуры. Усё адно, апынемся мы ў Расіі ці Асманскай імпэрыі, Індыі ці Лацінскай Амэрыцы, мы паўсюль бачым тыя ж самыя тытанічныя намаганьні абараніць боскі грамадзкі парадак.
І амаль усе наступствы ўчорашняга прыгоньніцтва дапаўняюцца барацьбой за захаваньне „традыцыйнага“ месца жанчыны ў грамадзтве. Параўноўваючы ісламі Японію, Лэндз паказвае, якім падманлівым можа быць знадворны выгляд. Японская культура ёсьць нечувана *macho*, жанчын не відаць ні на палітычнай арэне, ні ў буйным бізнэсе. Аднак даволі зірнуць на асьветную статыстыку і троху больш уважліва прыгледзецца да японскай эканомікі, каб зразумець, што маем справу зь якаснымі адрозьненьнямі. Існуе дыскрымінацыя ў аплаце жанчын, жанчын вельмі часта звальняюць з працы дзеля іхнага замужжа, іх не відаць на палітычнай арэне, але ўсё гэта нельга нават параўнаць з становішчам жанчыны ў ісламскім сьвеце — у японскай сям’і і грамадзтве жанчына мае цалкам іншы статус. Лэндз захоплены Японіяй і іншымі краінамі Паўднёва-Ўсходняй Азіі. У шмат якіх сфэрах Злучаныя Штаты прайгралі канкурэнцыю зь Японіяй, а самой Японіі ўсё часьцей даводзіцца напружвацца, каб ісьці ў нагу з сваімі суседзямі. Лэндз поўніцай згаджаецца з Вэбэрам, што кальвінісцкі варыянт пратэстантызму быў найлепшым рухавіком капіталізму. Аднак існуюць пэўныя падабенствы ў разьвіцьці Эўропы і Японіі.
„У Японіі не было кальвінізму, — піша Лэндз, — але яе прадпрымальнікі практыкавалі аналягічную этыку працы. Ключавою тут была ўстаноўка на працу. Манах Судзукі Шосан

(1579—1655), які спавядаў будызм, разглядаў сквапнасьць як духоўную атруту; але сама праца — штось зусім іншае. „Усе прафэсіі ёсьць формай практыкі будызму; праз працу мы спасьцігаем будысцкасьць“. Ня трэба быць вэбэраўскім пратэстантам, каб дзеяць так жа“, — камэнтуе Лэндз.

Бясспрэчна, што ключом да азіяцкага посьпеху была этыка працы, а каапэрацыя зь іншымі разглядалася ў Азіі як гульня. Зь сярэдзіны мінулага стагодзьдзя японцы поўніцай усьвядомлівалі, што расклад сілаў няроўны і што яны мусяць змагацца зь невыгоднай кан’юнктурай. Адным з назіраньняў князя Акуба, калі ён у 1873 годзе вярнуўся з двухгадовага падарожжа ў Злучаныя Штаты і Эўропу, было тое, што брытанцы адмовіліся ад пратэкцыянізму на карысьць філязофіі *laissez-faire* адразу пасьля ўзмацненьня свайго эканамічнага першынства. Нават Адам Сьміт мусіў бы згадзіцца з гэтым назіраньнем, піша Дэвід Лэндз і дадае, што японцы навучыліся па-майстэрску абмінаць невыгодныя для іх пункты, накінутыя сілай дамоваў. Сёньня гэта ўжо не пытаньне беспасярэдняга прымусу, а барджэй уціску і дыялёгу. Амэрыканскія і эўрапейскія эканамісты часта стаўляюць пытаньне: хіба японцы не разумеюць, што іх палітыка ізаляцыі ўласнага рынку ўдарае па іхных уласных спажыўцох? Хіба яны не разумеюць, што вольны гандаль адкрывае шлях да разьвіцьця і багацьця?
„На гэтыя рытарычныя пытаньні, — піша Лэндз, — японцы адказваюць, што мэтай эканамічнай палітыкі ёсьць нізкія цэны і таннае спажываньне. Мэтай ёсьць дамагчыся найбольшага ўдзелу ў рынку, узрастаньня патэнцыялу, прамысловай і вайсковай сілы. Вытворцы важнейшыя за спажыўцоў. Кожны ўмее купляць, але ня кожны ўмее выраблять“.
Дэвід Лэндз канчвае сваю кнігу ў міленарным настроі. На працягу апошняе тысячы гадоў чалавецтва павялічылася зь некалькіх сотняў мільёнаў да шасьцёх мільярдаў. Адкінуўшы містыку і забабоны, мы перайшлі ад няпэўных, разумовых назіраньняў да магутнай і ўсё больш усёабсяжнай навуковай веды. Наша веда пра прыроду — адназначна вялікшая і больш надзейная, чымся наша веда пра чалавека. Мала хто хацеў бы павярнуць час назад, але нават тыя, хто адварочваецца ад сучаснасьці, паслугоўваюцца кнігай, акулярамі, езьдзяць аўтамабілямі, карыстаюцца найноўшымі дасягненьнямі

мэдыцыны (часам для таго, каб пазбаўляць іншых празьмернай цікавасьці да матэрыяльнага сьвету). Сучасны сьвет падзяляецца на тых, хто траціць грошы, каб пазбыцца залішняй вагі, на тых, хто есьць і п'е, дзеля таго каб жыць, і на тых, хто не ўяўляе, дзе й калі ім пашчасьціць паесьці ў наступны раз. Калі мы можам нечага навучыцца з гісторыі эканамічнага разьвіцьця, — піша Лэндз, — гэта таго, што перадусім культура ёсьць асноўнай крыніцай гэтых адметнасьцяў. Людзі, якія жывуць сваёй працай, — гэта невялікая прывілеяваная эліта, але гэтая эліта адкрытая для ўсіх. Выснова, якую можна зрабіць з гэтай кнігі, палягае ў тым, што ўвесь час трэба рабіць усё новыя і новыя спробы трапіць у яе. Тут няма надзеі на цуд, на дасканаласьць, на міленарны пералом. Мы мусім культываваць скептычную веру, — піша Лэндз, — унікаць догмаў, умець слухаць і бачыць, спрабаваць удакладняць і фармуляваць свае мэты і шукаць усё лепшыя сродкі для іх рэалізацыі.
Эўрапейскі Зьвяз — гэта супольнасьць, дзе вядуцца прыземленыя спрэчкі пра цэны на селядцы і ялавічыну, пра мытныя тарыфы, пра магчымасьць паступовай адмовы ад межаў. Гэта супольнасьць, у якой людзі і нацыі вучацца адзін у аднаго, дзе ад самага пачатку існуе першынство эканамічных справаў перад палітычнымі, ня кажучы ўжо пра ідэйныя або рэлігійныя прынцыпы. Эўрапейскі парлямэнт не займаецца праблемай люстрацыі або нават хрысьціянскіх вартасьцяў. У краінах Зьвязу практычна ўжо няма людзей, якія б ня ведалі, што, дзе й калі яны змогуць паесьці ў наступны раз. Удзел у гэтай супольнасьці здаецца мне не найгоршай мэтай.
Паводле *Kultura*, 1999, №6.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2000
[image]

Алег Гардзіенка Гісторык, які перайграў гісторыю

АЛЕГ ГАРДЗІЕНКА
асьпірант Інстытуту гісторыі НАН Беларусі, стваральнік альманаху *Historica*. Сталы аўтар газэты „Наша Ніва“.

Мікалай Улашчык. „Краязнаўства“. Нататкі пра бадзяньні ў 1924—1929 гг. Менск. Пейто, 2000.
Хроніка: [Аўтабіягр. нататкі М.Улашчыка] // Скарыніч: Літ.-навук. гадавік. Менск, 1991. — Вып. 1.
Хроніка (II): [Аўтабіягр. нататкі М.Улашчыка] // Скарыніч: Літ.-навук. гадавік. Менск, 1993. — Вып. 2.
Навальніца: [Аўтабіягр. нататкі М.Улашчыка] // Скарыніч: Літ.-навук. гадавік. Менск, 1999.

Раней урыўкі з успамінаў і дзёньнікаў Міколы Ўлашчыка, ці не найбуйнейшага беларускага акадэмічнага гісторыка ў XX стагодзьдзі, урыўкамі зьмяшчаліся ў пэрыядычным друку. Найбольш значным з апублікаванага зьяўляецца ягоная „Хроніка“ — разнастайныя ўспаміны пра асноўныя этапы жыцьця да 1955 г.: дзіцячыя гады, сталінскія лягеры, жыцьцё між арыштамі. „Краязнаўства“ адчыняе новую старонку — Мікола Ўлашчык піша ў ім пра свае студэнцкія гады. Няма ў „Краязнаўстве“ той звыклай акадэмічнасьці, якая мусіць быць неад'емнай часткай Прафэсара Гісторыі, са старонак кнігі на нас пазірае жартаўлівы і праніклівы 20-гадовы студэнт Мікола. У прадмове да кнігі гісторык Віталь Скалабан распавядае, што

ў самым пачатку 70-х Мікола Ўлашчык сам прынёс у Акадэмічную бібліятэку рукапіс „Краязнаўства (Нататкі пра бадзяньні ў 1924—1929 гг.)“: 12 вучнёўскіх сшыткаў, перавязаных чорнай ніткай у адным блёку. Рукапіс пісаны тарашкевіцай, хоць Віталь Скалабан датуе рукапіс прамежкам часу паміж 1937 г. і чэрвенем 1941 г. (адзін з трох сшыткаў, зробленых у Ленінградзе, мае дату выпуску — студзень 1937 г., а слова „даваенны“ Ўлашчык ужывае ў дачыненьні да першай сусьветнай вайны). Гэта быў час, калі карыстаньне клясычным беларускім правапісам прыроўнівалася да вялікага злачынства. У 1935 г. Мікола Ўлашчык пасьля адбыцьця лягернага тэрміну выйшаў на волю і пачаў сваю вымушаную вандроўку па ўсім Савецкім Саюзе (каб унікнуць паўторнага арышту і немінучага ў гэтым выпадку расстрэлу, патэнцыйныя “ворагі народу” мусілі ўвесь час мяняць месца жыхарства — на такую стратэгію выжываньня зьвяртае ўвагу таксама Сымон Кандыбовіч у сваёй працы „Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі“, што нядаўна была выдадзеная ў бібліятэцы часопіса „Беларускі гістарычны агляд“). У 1939 г. Улашчык вырашае настала спыніцца ў Ленінградзе, уладкоўваецца на працу школьным настаўнікам. Напэўна, тады ён і сьпяшаецца занатаваць свае ўспаміны ў звычайных школьных сшытках, у тым, што было пад рукой. Улашчык піша не з пазыцыі трыццацігадовага чалавека, у якога за плячыма — сталінская турма, а стылем 20-х, жыцьцярадасным і дынамічным.

1.

Савецкая (ці, каму больш падабаецца, Усходняя) Беларусь сярэдзіны 20-х гадоў. Канула ў Лету страшэнная эпоха ваеннага камунізму, набірае абароты НЭП. Яшчэ далёка да безьлічы палітычных судовых працэсаў, якія ахопяць Беларусь у 30-х. Нават суды над антысавецкімі партызанамі ці працэс Юркі Лістапада 1925 г. былі хутчэй выняткам, чым правілам. Змучаны франтамі, акупацыямі і рэквізыцыямі селянін савецкай Беларусі паціху ўстае на ногі, замест старой пахіленай хаты будуе новую, прастарнейшую. Празь некалькі год гаспадарку калектывізуюць, жывёлу абагуляць, вялікую хату забяруць пад калгасную адміністрацыю, сялянскую сям’ю — не, не расстраляюць, а толькі вышлюць на Поўнач, выпраўляцца. Савецкая Беларусь 1921—1928 гадоў — гэта

апошні момант сытага жыцьця перад перакрышам, *Апошняя Аркадыя*, залатая пара сялянскай, вясковай, зрэбнай Беларусі, залаты век нацыянал-камуністаў, легенда беларускага сацыялізму. Вымушаны антракт, зацішша перад крывавым патопам. Гэтага антракту, у тактычных мэтах дазволенага Масквою (Сталін вырашыў абаперціся на партарганізацыі нацыянальных ускраінаў у барацьбе за ўладу са сваімі канкурэнтамі ў цэнтры), хапіла, каб „*беларускі рух рос у геамэтрычнай прагрэсіі. Беларусы, нацыянальна сьведамыя людзі, перасталі быць навіною, дзівам*“. Усё ж заваёвы нацыянал-камуністаў былі невялікія і нетрывалыя: „*… У газетах і розных выданнях увесь час пісалася пра пераход устаноў і дзяржаўнага апарату на беларускую мову. Гэта лічылася як паказнік рэвалюцыйнасці… Як памятаецца, на апошнім месцы стаяў Віцебск… Можна сказаць, што ў 1926 г. і далей гаварыць па-беларуску сярод моладзі сталася модаю… Усё гэта аднак не набыло сапраўднага масавага руху, і калі курс змяніўся і гаварыць па-беларуску стала небяспечна, большасць зраклася сваёй мовы*“. Так падрахоўвае вынікі беларусізацыі Ўлашчык.

У 1924—26 гадох адбыліся два ўзбуйненьні БССР. Улашчык пацьвярджае складанасьць моманту: *„У нас ускрозь казалі, што магілёўцы далучаліся, як кажуць, раўнадушна, але віцябляне ўпіраліся з усяе сілы*“.

На той час прыпадае і пачатак шырокай краязнаўчай работы. Сёньня мы жывем стэрэатыпам, што ў моцным руху беларусізацыі БДУ быў галоўнай сілай беларушчыны, і спасылаемся на тагачасны БДУ ў сваіх патрабаваньнях беларусізацыі. Улашчык быў адносна БДУ куды менш аптымістычны: “*Ун*[*івэрсытэ*]*т … аддаваў надта мала ўвагі і гэтай рэспубліцы, і народу. Прафэсары зьехаліся з усіх канцоў Расіі. Іх праца была зусім не ўвязана тэматычна зь Беларусьсю*“. Нягледзячы на дэклярацыі пра беларусізацыю, беларусаў ува ўнівэрсытэце было ў 20-х толькі каля адной трэці. У 1926/27 навучальным годзе толькі 31% прадметаў у БДУ выкладаліся на беларускай мове. Сьмешна, але пад час беларусізацыі існавала толькі адна ВНУ, калі яе можна назваць ВНУ, дзе выкладаньне вялося выключна па-беларуску — Магілёўская вышэйшая савецкая партыйная школа. Цікава, што ў 20-х „раўнадушная“ на сёньня Магілёўшчына была авангардам

беларусізацыі, у параўнаньні зь Віцебшчынай, Полаччынай і нават Меншчынай.
Унівэрсытэт, пра які марыў Улашчык-нацыяналіст, расчароўваў на кожным кроку. *„Хто гутарыў па-беларуску, той быў прыяцель, хто па-руску — той чужы*, — прызнаецца Ўлашчык. *— І прыяцеляў былі рэдкія адзінкі, а маса — чужыя*“.
Расчараваўшыся ўва ўнівэрсытэцкім навучаньні, Мікола Ўлашчык, як і ягоныя аднадумцы, шукаюць выйсьце для сваёй энэргіі ў краязнаўстве. Так паўстае краязнаўчае таварыства ў БДУ. На першы ўстаноўчы зьезд гуртку зьявілася аж каля 10 чалавек. Ініцыятыву на сябе ўзяў Нічыпар Чарнушэвіч, які прапанаваў сябе за старшыню. На наступны дзень Мікола Ўлашчык напісаў зацемку ў „Савецкую Беларусь“ пра стварэньне новай арганізацыі.
Увесну 1925 г. адбыліся першыя дасьледчыя экспэдыцыі: раскопкі курганоў вакол Менску і краязнаўчая вандроўка да Койданава і койданаўскага замку. Пабачанае ў замку выклікала жах: *„Здалёк ён выглядае прыгожа: на ўзгорку, увесь у зеляні. Сьцены, вежы, у сярэдзіне — сабор строгай архітэктуры. Праз браму заходзім у замак і перапаўняемся так злосьцю. Замак жудасна забруджаны. Месца, куды павінны зьяжджацца адусюль экскурсіі, уяўляе сабой нейкі катух, кучу гразі. У самай большай вежы стаяць сьвіньні. Гной з гэтага хлява цячэ па замкавай гары*“.
У 1926 г. была наладжаная экскурсія ў Ленінград, з мэтаю азнаямленьня з тамтэйшай краязнаўчай працай. Па дарозе ў цягніку разгарэлася спрэчка пра існаваньне беларускага этнасу. Апанэнт, паводле словаў аўтара, даказваў у вагоне, што самастойнай беларускай мовы не існуе. Улашчык, які, з уласных словаў, перачытаў горы кніг па беларускай гісторыі і культуры і быў добра *падкаваны* ў гэтым напрамку, высьмеяў дарэвалюцыйныя заходнерускія тэорыі, узятыя на ўзбраеньне студэнтам-беларусафобам. З уласьцівым Улашчыку гумарам ён піша: *„Загнаўшы ў трубу першага, я пачаў задзіраць, выклікаць на спрэчкі іншых і ўсіх палажыў на абедзьве лапаткі… Я быў цалкам здаволен. Праціўнікі не адважваліся вылазіць*“.
Паездка ў Ленінград не прынесла плёну, бо досьведу Ўлашчык не набраўся: краязнаўчая работа там адсутнічала, і Ўлашчык з выглядам пераможцы і гонарам за краязнаўцаў БДУ вярнуўся дахаты.

Сьціпла ён распавядае пра першы краязнаўчы зьезд, які адбыўся ў лютым 1926 г., паведамляючы пра тое літаральна адным радком, хоць на зьезьдзе прысутнічалі вядомыя людзі. Пры канцы кнігі прыводзіцца сьпіс 146 дэлегатаў зьезду. Сярод іх Максім Гарэцкі, Зьміцер Даўгяла, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Зьміцер Жылуновіч, Язэп Дыла, Усевалад Ігнатоўскі, Сьцяпан Некрашэвіч, Уладзімер Пічэта, Андрэй Шашалевіч, Алесь Чарвякоў, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Кандрат Атраховіч (Кандрат Крапіва), Пятрусь Броўка. Абыходзіць увагаю зьезд былі важкія прычыны: успаміны пісаліся ў часы наймагутнейшага размаху рэпрэсій, і большасьць удзельнікаў зьезду была вынішчаная, успамінаць іх было яшчэ больш небясьпечна, чым пісаць тарашкевіцай. Пішучы нататкі як помнік эпохі, Улашчык ня мог гарантаваць, што яны ня будуць аднойчы выкарыстаныя ў якасьці абвінаваўчага дакумэнту.
Ад паходаў у ваколіцах Менску трэ было пераходзіць на новыя рубяжы. Наступны разьдзел „Краязнаўства“ — „Тураўшчына“, апісаньне дасьледчай вандроўкі на Палесьсе. Тураву і тураўскай зямлі дастаецца „на гарэхі“ ад аўтара. Тураўшчына, якая калісьці была калыскай беларускай дзяржаўнасьці, цяпер уяўляла прыкрае відовішча, забіты, бедны, жахліва ўбогі край. Улашчык падрабязна апісвае побыт, строі, жытло палешукоў, кпіць зь іх неахайнасьці. Магчыма, менавіта Ўлашчык запусьціў ва ўжытак такі анэкдот: *„У Радзіловічах мы раз убачылі дзевачку, мурзатасьць якое пераходзіла ўсе нават палескія нормы. „Цётка, — запыталіся мы ў яе мацеры, — ці мыеце вы калі сваю дачку?“ Маці, якая длубалася каля печкі, флегматычна зірнула на сваё патомства і адказала: „От, калі ідзе дождж ды ў канаве ёсьць вада, то яна палошчыцца, а калі вады няма, то ж дзе ж мыцца“. Гледзячы на паніклую, шэрую фігуру мацяры, на яе жабрацкую хату, мы нічога не сказалі*“. Палесьсе, адкрывае для сябе Ўлашчык, не падобнае да цэнтру Беларусі ні па ладзе жыцьця, ні па антрапалягічным тыпе: *„Каб Палесьсе раней не ўваходзіла ў склад Менскай губерні, то ня быць бы яму ў складзе Беларусі. Жыхар Палесься ніколі не заве сябе ні беларусам, ні ўкраінцам. Ён — паляшук. Гэта яму цьвёрда ведама і зараз, і ў мінулым, калі ў нас яшчэ жылі „тутэйшыя“. Дарэчы, нас, беларусаў, паляшукі завуць яшчэ і дагэтуль літвінамі, а край — Літвою*“.
Тураўская экспэдыцыя прынесла славу дасьледчыкам, і

падарожжа ў Полацак ужо добра прафінансавала дзяржава. Але другая старажытная сталіца Беларусі таксама не зрабіла ўражаньня на маладога Ўлашчыка. Спадзеючыся пабачыць горад з трывалымі гістарычнымі традыцыямі, ён моцна расчараваўся: "*…горад, які* [*як*] *ніводзін горад Беларусі насычаны гістарычнымі помнікамі, — ён зусім закінуты… а самі сучасныя палачане ведаюць пра свой горад столькі ж, колькі ж ведаюць і іншыя жыхары пра свой — т.е. нічога… Усіх нас агулам пасьля абвінавачвалі, што мы длубаліся ў старасьветчыне, што цікавіліся і апісвалі замкі, цэркві. Гэтыя людзі не хацелі ведаць ці, можа, і сапраўды ня ведалі, што ў XI—XII стагодзьдзі ў гарадах ня было палацаў культуры і рабочых клюбаў*".
Уражвае тая аб'ектыўнасьць, зь якой Мікола Ўлашчык глядзіць на Беларусь 20-х, што заставалася местачковай, шэрай, паглыбленай у дробязныя праблемы. Гэта было балюча для маладых рамантыкаў. Дастаткова згадаць апісаньне вандроўкі на Лысую Гару, самую высокую кропку Беларусі (Сьвятая Гара заставалася ў Заходняй Беларусі). Лысая Гара аказалася невялічкай плешкай зямлі, ушчэнт забруджанай сьвіньнямі. Але ж захапленьне ад убачанага было: „*Навокал, як кінуць вокам, відаць узгоркі, лагчыны, ляскі. Краявід для Беларусі надзвычайна шырокі*". І наступная фраза, звычайная, але з прыхаваным зьместам. „*На захадзе, дзе спускалася сонца, была відаць кучка* новенькіх (вылучана намі. — **А.Г.**) *домікаў — гэта ўжо Заходняя Беларусь у палякаў*".
З 1927 г. да свайго першага арышту ў 1930 г. Улашчык штолета выбіраўся ў вандроўкі ўва Ўкраіну. Улюбёным горадам быў для яго Кіеў: „*Дняпро, каштаны на вуліцах, з самага раньня на вуліцах зьяўляліся маладыя малочніцы, смуглявыя і наогул прывабныя. Прывабнасьць апрача іншага ім прыдавала адзеньне, белыя іх кофтачкі былі ва ўсіх з рознымі ўзорамі, вышытымі ад рукі, зверх гэтых кофтачак былі лёгкія безрукаўкі. У 20-ыя гады Кіеў меў амаль чыста ўкраінскі характар: на вуліцы і наогул скрозь гаварылі па-ўкраінску: нам было завідна*".

2.

Мікола Ўлашчык нарадзіўся 1 лютага 1906 г. на гістарычнай Койданаўшчыне, у вёсачцы Віцкаўшчына, што ў 20 км ад Менску, на колішнім тракце Менск—Варшава. Што да паходжаньня, то дзед па маці Міколы Ўлашчыка быў уніятам,

пра гэта М.Улашчык распавёў у лісьце да Адама Мальдзіса *„Дзеда пры пераводзе ў праваслаўе доўга білі, але, стаўшы праваслаўным, ён захаваў уніяцкую ікону ці нават некалькі іх“*.
Шматдзетная сям’я (было некалькі сыноў) прымушала задумацца над будучыняй дзяцей. Старэйшы Ўлашчык пайшоў на звычайны для адукаванага беларускага селяніна крок. Каб не драбіць гаспадаркі, ён абяцае яе аднаму з сыноў, а астатніх вырашае вучыць, у лік іх патрапіў і Мікола-малодшы. Пасьля сканчэньня рэальнага вучылішча (гэта ўжо за савецкімі часамі) М.Улашчык наведвае заняткі ў вечаровай школе. Але ж усе мары былі пра вышэйшую адукацыю. Да таго ж, Мікалай меў перавагу перад астатнімі абітурыентамі, да паступленьня ў БДУ ў 1924 г. ён з траўня 1924 г. працаваў у Кніжнай Палаце Беларускай дзяржаўнай і ўнівэрсытэцкай бібліятэкі (у траўні 1926 г. бібліятэка была падзеленая на дзьве: уласна дзяржаўную, сёньняшнюю нацыянальную, і ўнівэрсытэцкую). Канечне, гучна сказана — Палата. Як сьцьвярджае супрацоўніца бібліятэкі Людміла Навіцкая, Мікола Ўлашчык быў адзіным супрацоўнікам кніжнай палаты. У 1926 г. у Дзяржаўную Бібліятэку прыйшоў новы супрацоўнік, які год таму вярнуўся з эміграцыі, колішні кіраўнік слуцкіх паўстанцаў Уладзімер Пракулевіч. Відавочна, Пракулевіч і Ўлашчык сутыкаліся ў нетрах бібліятэкі і, безумоўна, гаварылі між сабой, але пра што? На старонках „Хронікі“ Мікола Ўлашчык мімаходзь кідае фразу наконт гутарак са знаёмым хлапцом-балахоўцам, але, на жаль, не паведамляе, дзе адбываліся гэтыя сустрэчы. Тое самае і з Пракулевічам.
Існуе нават фантастычнае меркаваньне, што пад час працы ў Дзяржаўнай бібліятэцы менавіта Мікола Ўлашчык знайшоў купалаўскі аўтограф, водгук на падзелы Беларусі: *„Далі шэсьць паветаў, дзякуй і за гэта“* — знайшоў і запомніў, бо пасьля купалаўскія рукапісы ў бібліятэцы былі рэвізаваныя, і значна пазьней, ужо пасьля сталінскіх часоў, зноў запусьціў купалаўскую фразу ўва ўжытак.
Пасьпяхова здаўшы ўсе неабходныя іспыты на сацыяльна-гістарычнае аддзяленьне пэдагагічнага факультэту, Мікола Ўлашчык 8 кастрычніка 1924 г. быў… выкрасьлены са складу тых, што паступілі. Што здарылася?
Разгадка была вельмі простая. Улашчык аказаўся сынам кулака, што было дрэнна, тым больш у даведцы, пададзенай ім

у канцылярыю БДУ, пазначалася, што бацька мае 24 дзесяціны зямлі, 3 каровы, 3 кані, 3 авечкі, 2 сьвіньні. Праўленьню БДУ клясавае пачуцьцё падказала, што юнак з такім ганебным радаводам не павінен навучацца ў БДУ, каб не сапсаваць сваім шкодным уплывам кухарчыных і пралетарскіх дзяцей. За Ўлашчыка заступіўся паэт Станіслаў Шушкевіч, бацька будучага першага кіраўніка незалежнай Беларусі, і амаль што на наступны дзень зьявілася насьценгазэта з намаляванымі кулаком Улашчыкам і падкулачнікам Шушкевічам. Вядома, Мікола Ўлашчык у „Краязнаўстве“ ні словам не абгаворваецца пра сутнасьць справы, абмяжоўваючыся сухой фразай пра адлічэньне.

Улашчык ня склаў рук, змагаўся ўсімі спосабамі за тое, каб яго аднавілі. Зьвярнуўся па дапамогу ў Галоўпрафасьвету, якая даслала ў Праўленьне БДУ запіску, дзе прасіла залічыць Мікалая Ўлашчыка ў студэнты. Праўленьне праігнаравала пазыцыю Галоўпрафасьветы. За Ўлашчыка заступіўся Дэканат пэдагагічнага факультэту, але… Праўленьне БДУ пісьмова адказала *„Дзеля таго, што гр.Улашчыку адмоўлена ў прыёме як мясцовай, так і цэнтральнай прыёмачнай камісіяй і прымаючы пад увагу паданыя на яго адводы, захады яго адхіліць*“.

Невядома, чым бы ўсё гэта скончылася, але ўрэшце добрую службу адыграла Краязнаўчае Таварыства БДУ, ачольванае рэктарам Пічэтам, у якім Улашчык быў сакратаром. Улашчык здолеў аднавіцца ў шэрагах студэнтаў, дайшоўшы да Ігнатоўскага і Пічэты. Але беды на тым ня скончыліся. Яго яшчэ двойчы выключалі з альма-матэр. А замест плаціць стыпэндыю студэнту Ўлашчыку, зь яго пачалі гэтыя грошы ўтрымліваць. Матывацыя была тая самая: паходжаньне зь сям’і кулака.

Праляцела навучаньне ў БДУ, увесну здадзеныя выпускныя іспыты. У траўні, за месяц да ўрачыстага выпускнога вечара, у прафкам пэдагагічнага факультэту паступіў ліст, які мае сэнс працытаваць цалкам, каб захаваць калярыт той эпохі:

„У прафкам Працасветы Педфаку ад сябра Працасветы Ю.Ерафеева.

Заява

Будучы ў падшэфнай вёсцы Грычынскага с/с, мне па справах арганізацыі калектыву прышлось праводзіць працу з батракамі

вёскі Віцкаўшчына суседняга Рубілкаўскага с/с Самахвалавіцкага р-ну. У працэсу працы па заяве батракоў было высьветлена наступнае: Улашчык М.М., студэнт Педфаку 4 курсу сацыяльна-гістарычнага аддзяленьня праісходзе з в.Віцкаўшчына Рубілкаўскага с/с Самахвалавіцкага р-на, бацька якога „знамяніты эксплуататар“ (словы батракоў) мае 35—40 дзесяцін зямлі, меў 2-х батракоў, але лічачы, што прафсаюз устанаўлівае высокую стаўку, рашыў падзённа нанімаць. Меў некалькі спагнаных штрапаў за неймавернную эксплуатацыю батракоў. Мае два дамы, прычым 1 дом здае ўлетку пад дачу, прыязджаючым і адпачываючым. Разам з усім памянёным ён жа і царкоўны стараста ў Віцкаўшчыне, за што таксама атрымлівае прыбытак. На маё пытаньне, ці прыязджае сын да бацькі, адказ быў уцьвярдзіцельны. Акрамя гэтага, тыя ж батракі паведамілі, што бацька памянёнага студэнта запісаў 5 душ лішніх для атрыманьня большай колькасьці зямлі. Запісаны дзьве дачкі, адна з іх у Менску настаўніца, атрымлюе 130 руб, замужам за дырэктарам тэхнікуму (не ведаюць якога), другая на іждзівені памянёнай і вучыцца ў тэхнікуме. Адзін сын скончыў палітэхнічную школу ў Ленінградзе і працуе. Усе гэтыя душы запісаны для землеўпарадкаваньня.

Лічу недапушчальным такую справу і прашу звярнуць увагу прафкому на гэтую справу, напярэдадні праверыўшы, па якіх дакументах прынят Улашчык. Аб сапраўднасьці мной апісанага раней пацьвердзіў старшыня батрачкома Маёраў, старшыня Грычынскага с/с т. Саўчук, які жыве ўсяго 1 км ад Улашчыкаў

Заявіцель Ю.Ерафееў“.

Невядома, чаму, нягледзячы на гэты данос, Улашчыка не зачапілі і ён атрымаў дыплём. Ці то данос быў ня першы і быў звычайнай зьявай для БДУ, ці то ўлады ўжо „трымалі“ Міколу Ўлашчыка для больш адказнае справы.

3.

У 1930 годзе быў дадзены ход справе „Саюзу Вызваленьня Беларусі“. У грандыёзным, хоць кепска зрэжысэраваным спэктаклі было занята шмат актораў. Не абмінулі ўвагай і Ўлашчыка. Прычым яму знайшлася адна з „прэстыжных“ і „найлепшых“ роляў.

Трэба сказаць, што Ўлашчык інтуіцыйна прадчуваў арышт, дый як было не прадчуваць, калі навокал пачалі браць сяброў,

выкладчыкаў, калег па навучаньні і краязнаўчай рабоце. Арыштам спрыяла татальная сыстэма *данасіцельства*. Як успамінаў Улашчык, вуліцы Менску стракацелі аб'яўкамі кшталту *„ў такі дзень чыстку будзе праходзіць такі-то, давайце на яго кампраметуючыя матэрыялы*".

Мікола Ўлашчык яшчэ й таму ня мог не адчуваць небясьпекі, бо ён заўсёды ўважліва сачыў за падзеямі ўва Ўкраіне. Там „змаганьне" з ворагамі народу пачалося шчэ раней, чым у Беларусі.

Наўрад ці Мікола Ўлашчык меў калі ілюзіі наконт савецкай улады ці справядлівасьці савецкіх карных органаў — у адрозьненьне ад многіх нацыянал-камуністаў ці маладых беларускіх адраджэнцаў пралетарскага паходжаньня. Каб уратавацца ад Малоха рэпрэсій, Улашчык выпісваецца зь Менску і перабіраецца ў Маскву, дзе жыве ў свайго сябра Фэлікса Купцэвіча, чалавека незвычайнага лёсу і, безумоўна, адданага патрыёта Беларусі.

Вось асноўныя этапы жыцьця Купцэвіча: камісар на чыгунцы, барацьбіт з працоўным дэзэрцірствам, сакратар Крычаўскага райкаму партыі, потым намесьнік галоўнага рэдактара „Зьвязды". Ад сучасьнікаў ён атрымаў мянушку *другі беларускі Бялінскі* (першым беларускім Бялінскім лічыўся Адам Бабарэка). Раптам кар'ера абарвалася. Пад час навучаньня ў маскоўскім Інстытуце чырвонай прафэсуры яго *распазнаюць* расейскія выкладчыкі і выключаюць *за нацыяналістычны ўхіл у бок беларускага нацыянал-дэмакратызму*. За выключэньнем з Інстытуту прыйшло выключэньне з партыі. Яму, на шчасьце, удалося ўладкавацца фрэзэроўшчыкам на адным з маскоўскіх заводаў, потым эканамістам у дзяржаўным выдавецтве Расіі. Але гэта не ўратавала. Купцэвіч тройчы арыштоўваўся карнымі органамі, а ў сакавіку 1938 г. быў расстраляны.

Магчыма, Улашчык сапраўды меў нейкае шостае пачуцьце небясьпекі. У любым разе, ён проста адчайна і пры гэтым вельмі ўзважана змагаецца за выжываньне ў адрозьненьне ад многіх сваіх сучасьнікаў, што пакорліва чакалі арышту і зьнішчэньня.

Адчуўшы, што над Купцэвічам таксама згушчаюцца хмары, Улашчык пакідае Маскву, перабіраецца ў Ленінград да свайго брата Канстанціна. За гэты час сьледзтва набірае шмат кампрамату супраць яго: менавіта яму пачынаюць

інкрымінаваць кіраўніцтва маладзёвым крылом СВБ. Чэкісты абвяшчаюць яго ўва ўсесаюзны вышук. Канстанціна выклікаюць у сьледчыя органы. Канстанцін на допыце адказвае, што нічога ня ведае.
Канстанцін Улашчык працаваў галоўным інжынэрам на заводзе. Удзень яго пакідалі ў спакоі, але працягвалі выклікаць у ДПУ ўначы — штоночы. У двубоі чэкістаў і інжынэра кулацкага паходжаньня не вытрымлівае Мікола Ўлашчык, які добраахвотна ідзе да чэкістаў з павіннай. Яго арыштоўваюць 12 чэрвеня 1930 году і перавозяць у Менск, у страшную „амэрыканку“. У „двухмесным нумары“ (выслоўе Ўлашчыка) ён спачатку тры месяцы сядзіць разам з Іванам Цьвікевічам, потым яго пераводзяць у адну камэру з Вацлавам Ластоўскім.
Улашчыку, якому інкрымінавалася кіраўніцтва маладзёвым крылом СВБ, галоўнае было не зламацца, не прадаць сяброў, нават праходзячы праз усе колы Дантавага пекла. Ён выстаяў.
Апроч Улашчыка, на завадатараў „маладых нацдэмаў“ сваталі Алеся Аніхоўскага, тады інструктара Белкаапцэнтру, і карэктара „Зьвязды“ Пятра Зенюка. НКВД беспамылкова залічвала карэктараў, перахоўвальнікаў беларускага слова, да галоўных ворагаў, здольных падтачыць падваліны расейскага панаваньня.
Краязнаўчая праца, якая на пачатку 20-х здавалася натуральнай праявай цікавасьці да роднага краю і мела выразны навуковы профіль, у 1930 годзе была прызнаная шкоднай і канечне антысавецкай. Вось якія галоўныя абвінавачаньні былі кінутыя краязнаўцам:
пастаноўка нацыянал-дэмакратычнай прапаганды ў навучальных установах і друку,
ператварэньне краязнаўчай сеткі ў арганізацыйныя цэнтры нацыянал-дэмакратычнага руху,
захоп у свае рукі выдавецкай справы і часткі пэрыядычнага друку,
апрацоўка нацыянальна-дэмакратычна настроенай праслойкі камуністаў і прасоўваньне ў кампартыю членаў нацыянал-дэмакратычнай арганізацыі.
10 красавіка 1931 г. суд вынес вырак. Згодна з артыкуламі 58-10 (антысавецкая прапаганда і агітацыя, што ўтрымлівае заклік да зрынаньня, падрыву ці аслабленьня савецкай улады) і 58-11 (усялякага роду арганізаваная дзейнасьць, накіраваная

на падрыхтоўку ці зьдзяйсьненьне злачынстваў) ч.1 Крымінальнага Кодэксу Мікола Ўлашчык быў сасланы ў Налінск, што ў Вяцкай вобласьці. Там ён апынуўся разам з навукоўцам Міколам Азбукіным і будучым вядомым эміграцыйным дзеячом Яўхімам Кіпелем. Кіпель у сваіх мэмуарах „Эпізоды“, выдадзеных у 1998 г. у Нью-Ёрку выдавецтвам газэты „Беларус“, так характарызуе Налінск: *„Жыцьцё ў Налінску было спакойнае: мы рэгістраваліся, дзе было патрэбна. Стараліся не зьвяртаць на сябе ніякай увагі… Мне было лягчэй, бо я ўладзіўся спачатку ў хімічную лябараторыю, Азбукін працаваў на складзе, а Мікола Ўлашчык доўгі час хадзіў бяз працы*“. Далей цікавая заўвага: *„Аднойчы Ўлашчык выклаў мне свае пляны на будучыню. У ягоных плянах я яго падтрымаў і дапамог, чым мог. Хутка мы зь ім рассталіся. Ён пражыў ліхалецьце і выпрабаваньні. Здаецца, працуе ў Маскве. Няхай дэталі нашых гутарак і ягоных асабістых плянаў так і застануцца паміж намі*“. Успаміны Яўхіма Кіпеля пісаліся ў 1964—1969 гадах. Што ўтойвае ад нас Кіпель? Чаму ён не схацеў пра штосьці сказаць? Адзіная крыніца, дзе можна спраўдзіць Кіпелевы словы, гэта нумар „Беларускага Гістарычнага Агляду“ за травень 1996 году, цалкам прысьвечаны Міколу Ўлашчыку, дзе сярод „успамінаў сяброў і калег” зьмешчаная зацемка Вітаўта Яўхімава, сына Кіпеля (с.126—127). Сп. Вітаўт прыгадвае: *„Бацька часта пра Улашчыка згадваў, верыў, што жыве, бо хоць і дапамагаў бацька яму з уцёкамі з высылкі (казаў, што планавалі яны, каб Улашчык уцёк на Захад), думаў, што на Захад Улашчык не трапіў, а пісаць нешта — баяўся „лапаў НКВД”*. Словы пра ўцёкі на Захад — гэта больш фантазія ці праўда? На жаль, спраўдзіць немагчыма. Што ж, Улашчык, чалавек цьвярозага розуму, мог прыцэньвацца й да ўцёкаў. Калі б на гэта былі шанцы. Зноўку зьвернемся да зацемкі Вітаўта Кіпеля — яшчэ аднаго штрышка. Гэта асабістыя ўражаньні малалетняга Вітаўта пра Міколу Ўлашчыка. *„Часта ці адзін, ці другі дзядзька Мікола браў мяне за руку, бывала нават садзіў на карак, шпацыраваў уздоўж крутога берагу Воі ды вучыў беларускія песні. Дзядзька Улашчык вучыў мяне тады „Мы выйдзем шчыльнымі радамі*”. Мікола Ўлашчык у высылцы, пад наглядам энкавэдыстаў, навучае малое хлапчанё нацыяналістычнага гімну, за дэклямацыю якога можна было атрымаць другі тэрмін!

У Налінску Мікола Ўлашчык прабыў тры гады, а потым, як вынікае з афіцыйных папераў, сапраўды… *зьдзейсьніў пабег*. Ну, ці то пабег, ці то Ўлашчык, як ён сам тлумачыў, проста без дазволу паехаў наведаць сябра Алеся Аніхоўскага, такога ж пасяленца, што жыў на Вятчыне. У любым разе, адпаведныя структуры зрэагавалі імгненна, і Міколу Ўлашчыка арыштоўваюць паўторна. На гэты раз ён быў высланы ў Сібір. Напачатку ў Марыінск, неафіцыйную сталіцу сібірскіх канцлягераў, горад, дзе адзначыліся прысутнасьцю многія беларусы, якіх этапавалі да палярных медзьвядзёў (тутака, у Марыінску праз 7 год памрэ тытан беларускага адраджэньня, першы выдавец і рэдактар „Нашай Нівы“, сэнатар Другой Рэчы Паспалітай Аляксандр Уласаў).

Мікола Ўлашчык выжыў, бо быў малады і, як тая жаба ў гляку, ніколі не здаваўся, стараючыся, у лепшых беларускіх традыцыях, знайсьці мажлівасьць уладкавацца пры любых умовах. 5 лютага 1935 году ягоны тэрмін кары нарэшце скончыўся. Зноў зьвернемся да „Хронікі“: *„У мяне нібы нешта абарвалася, але ніякай буйной радасці не перажываў“*. Чаму не было радасьці? Мо з-за сасланага бацькі. У нататках „Роздумы на схіле“, напісаных у 1983—1986 гадах і апублікаваных у кнізе „Будам жыць“ Аляксея Каўкі, Мікола Ўлашчык успамінае пра бацьку: *„Сфатаграфаваўся ён з братам… Бацька сядзіць, у манішцы з гальштукам, брат за ім стаіць. Дык я пазьней забраў той здымак і ў мастацкае фота занёс: асобна бацькаў партрэт зрабіць. Усе глядзяць: які ж гэта мужык? Панам глядзіцца! А гэты „пан“ праз усе гады сякеры ці гэбліка з рук не выпускаў. За што і раскулачылі, саслалі ў Котлас. Памірае дамоў адпусьцілі. На могілках нямецкіх у Менску пахаваны. На пліце радня надпіс зрабіла: „Мікалай Фэліцыянавіч Улашчык. 1861—1934“. Зянон Пазьняк кажа, мусіць, гэта адзіны надпіс надмагільны па-беларуску“*.

Вярнуцца ў Беларусь для Міколы Ўлашчыка значыла выракчы сябе на беспрацоўе і непазьбежны новы арышт. Улашчык, прайшоўшы школу ГУЛАГу, з усіх мажлівых і немажлівых сілаў імкнецца ўнікнуць другога тэрміну за кратамі. Самы дзейсны спосаб — не затрымлівацца на адным месцы працы больш за год. *„Пасля выхаду з лягеру ў 1935 г. я ўзяў за правіла: працаваць на дадзеным месцы не больш за адзін год. Праўда, у гэтым быў вялікі дыскамфорт, прыходзілася кідаць у якойсці*

ступені абжытае месца, пакідаць вучняў, з якімі былі найлепшыя адносіны, і ехаць немаведама куды, але досвед падказваў, што для гэтага часу гэта быў найлепшы спосаб захаваць вольнасць. Ува ўсялякай установе, вялікай і маленькай, былі стукачы. Натуральна, што калі з'яўляўся новы, невядомы чалавек, яны выяўлялі да яго незвычайны інтарэс, ды і начальства, якое таксама сачыла за ўсімі, мусіць наўпрост загадвала сваім агентам даведацца як мага больш пра навічка. Стукач стараўся, але паколькі пра навічка ці наогул ніхто не ведаў, то збор звестак ішоў марудна; калі з цягам часу матэрыял збіраўся, я браў разлік і з'язджаў, нікому не кажучы куды еду, тым больш, што і сам я пра гэта не ведаў".

Першым горадам, дзе спыніўся Ўлашчык, быў Ташкент. Узбэцкая сталіца на той час была горадам сасланых, а сярод іх і згубіцца лягчэй. Але знайсьці працу ў Ташкенце было вялікай праблемай — у горад сагналі поўна людзей з вышэйшай адукацыяй. Можна было завэрбавацца ў войска, але, са словаў Улашчыка, баразьніць на жываце выпаленую мясцовасьць яму не хацелася. А тутака яшчэ захацелася заскочыць у Менск, наведаць знаёмых. Але Менск, той Менск, які Ўлашчык так любіў, які яму так хацелася зрабіць падобным да Кіева, сустрэў яго зусім ня ветліва. У горадзе знаёмыя стараліся не пазнаць Улашчыка, перабягалі на іншы бок вуліцы. Наадварот, дабіваліся сустрэчы і сяброўства тыя, хто ніколі сябрам ня быў — такая ўжо ў іх была служба.

Жахнуўшыся, Улашчык хутчэй выяжджае ў Вятку, якую вось толькі год як перайменавалі ў Кіраў. Шукае працы. Спрабуе ўладкавацца ў абласную плянавую камісію, бо „мэтодыка працы яму спадабалася". (Улашчык распытваў знаёмую дзяўчыну пра характар працы і як людзі працуюць. „*А вось так. Прыйдуць рана і пачынаюць курыць у калідоры, пасля чытаюць газеты, пасля прыносяць чай, ну і далей таксама. Вы ж пэўна, умееце піць чай. А курыць не курыце. Гэта ўжо загана, бо нашыя ў асноўным кураць, такі ж нечым заняты*".) О, сацыялістычная праца, што трывае й да сёньня! Улашчыка ўсё ж у камісію не прымаюць, але не таму што ня ўмеў паліць, а бо меў дрэннае мінулае. Пакуль знайшлася праца іншая, у Вятцы-Кіраве сярод высланых беларусаў пачаліся арышты. І Ўлашчык сьпяшаецца зноў пакінуць горад.

Працягваецца Адысэя па савецкім моры: Іванава, Горкі,

Ульянаўск, Саратаў, Дзергачы. Ці зьведаў хто зь беларусаў матухну-Расею лепей? І паўсюль пільнае вока Старэйшага Брата. Доўгія гады жыцьця ў вечным страху, калі, устаючы раніцой з ложка, ня ведаеш, чым скончыцца дзень. Іншых гэты страх параліжаваў, Улашчыка цьверазіў і прымушаў канцэнтравацца. І гэтак блукаючы па Расеі, ён нават знайшоў час ажаніцца.
Яшчэ ў 20-х ён празь Сяргея Шутава пазнаёміўся са студэнткай Ленінградзкага інстытуту прафзахворваньняў Натальляй Шамшорынай. Гэтая прывязанасьць перарасла ў каханьне, у 1938 годзе маладыя людзі ажаніліся, праз год Мікола перабіраецца да жонкі ў Ленінград, дзе ўладкоўваецца на працу настаўнікам і дабіваецца мажлівасьці здаваць асьпіранцкія іспыты. Спакойнае жыцьцё парушае нямецка-савецкая вайна. Напярэдадні яе савецкія органы праводзілі, карыстаючыся сёньняшняй лексыкай, „зачыстку“ гораду. Пад гэтую зачыстку патрапіў і Ўлашчык, яго мабілізавалі ў войска, нягледзячы на тое, што яго на гэты час ужо прызналі белабілетнікам. Прызванага ў кашары Ўлашчыка 23 чэрвеня 1941 году зноў арыштоўваюць. Дасьледчыкі жыцьця Ўлашчыка так і не вызначыліся, з-за чаго адбыўся арышт, хутчэй за ўсё падставай для яго сталіся „старыя правіны“. Лягічны ўчынак савецкай улады на пачатку вайны: каб жа на фронце колішнія рэцыдывісты-ворагі народу ня здрадзілі, каб жа не перайшлі на бок нацыстаў! 7 ліпеня, на праваслаўнага Йвана, Міколу Ўлашчыка адпраўляюць на этап, і пачынаецца чарговы трагічны пэрыяд жыцьця. 11 дзён у набітых людзьмі, як селядцамі, вагонах, і прыехалі ў горад Златавуст. Тутака ў турме Мікола Ўлашчык прабудзе год і чатыры дні. 22 ліпеня 1942 году суд вышле яго ў Навасібірскую вобласьць на 5 год.
На шчасьце, за вызваленьне Ўлашчыка змагалася ягоная жонка Натальля Шамшорына, навуковы супрацоўнік АН СССР, якая ў той час разам з Акадэміяй Навук знаходзілася ў эвакуацыі ў Казані. Там жа, у Казані, знаходзіўся віцэ-прэзыдэнт АН СССР Лявон Абгаравіч Арбелі, якога і ўмаліла Натальля Шамшорына заступіцца за яе мужа. Арбелі на ўласную рызыку напісаў прашэньне на імя Берыі, дзе хадайнічаў за Міколу Ўлашчыка як за таленавітага гісторыка, вельмі неабходнага савецкай навуцы. Цуд ці ня цуд, а ваенная адсутнасьць працоўных рук на волі — але хадайніцтва дзейнічае, і 28 лістапада Ўлашчыка

вызваляюць з турмы, ледзьве жывога, хворага на плеўрыт.
У турме ён пабачыў дзіўны сон, пазьней запісаны ўва ўспамінах: „*Пачуцьцё такое, што я як бы адзін у космасе. Ні сьцен, ні рэчаў побач, наогул нікога й нічога каля мяне. Нават не адчуваю свайго цела, я як бы штосьці абстрактнае, толькі бачу нябесную сфэру й лінію далягляду. Затым заўважаю над сабою зорку сярэдняй яркасьці. Потым гэтая зорка пачала рухацца па небасхіле павольна, як у плянэтарыі. Я сачу за ёй і пачынаю разумець, што гэта мая зорка, мая плянэта, і калі яна закоціцца за далягляд, я памру. Гэтая акалічнасьць мяне ніколькі не турбуе. Я толькі назіраю за тым, як заканчваецца маё жыцьцё… Затым яна стала на нейкі час нерухомай… І я зразумеў, што застаўся жывым, але да гэтага аднёсься абыякава, як і да сьмерці. Радасьці не было*“.
Улашчык выжыў, выйшаў з турмы, неяк дабраўся да свайго брата Івана ў Татарыю. В.Чамярыцкі і В.Станішэўскі, грунтуючыся на ўспамінах Міколы Ўлашчыка, сьцьвярджаюць, што брат жыў у Азнакаеве, Аляксей Каўка, таксама грунтуючыся на ўспамінах Улашчыка, даводзіць, што гэта была Бугульма. Але гэта неістотна. Галоўнае, што Мікола дабраўся да брата, *ды ў такім стане, што косьці стукалі*, і адлежваўся ў яго, змагаючыся з хваробай, 4 месяцы. Брат Іван у 1935 г. працаваў лесьніком на Лагойшчыне. Добрыя людзі падказалі, папярэдзілі пра блізкі арышт. Ня доўга думаючы, сабраў пажыткі і ўцёк з жонкай і дочкамі ў Татарыю. Але не баяўся прыняць у сябе брата-рэцыдывіста. А Мікола Ўлашчык, ачуняўшы ў брата, толькі ўлетку 1943 году дабраўся да Казані, да жонкі-выратавальніцы.
Зь ягоных уласных словаў, „*вайсковыя камісіі, куды выклікалі некалькі разоў, бракавалі, бо абодва лёгкія былі дзіравыя*“. Вайна зь немцамі ўнесла пэўныя карэктывы ў жыцьцё Савецкага Саюзу. Цяпер ужо ня трэ было шукаць працы. Праца сама адшуквала яго. Пры канцы 1943 году ён уладкаваўся выкладчыкам гісторыі ў мэдычную школу. Магчыма, так бы ўсё і скончылася, Улашчык і застаўся бы працаваць у Казані, бо ў сталіцы ехаць не хацеў, баяўся новага арышту, слушна разумеючы, што тамака „чысткі“ нашмат шчыльнейшыя. Але — выпадак… Жончына сяброўка (мабыць, не бяз жончынага падбою) пачала падбухторваць Улашчыка да навучаньня ў асьпірантуры, хоць яму было 37 год — не асьпіранцкі век, дый

не было самага элемэнтарнага — пашпарту. Іспыты ў асьпірантуру былі здадзеныя яшчэ да вайны, аднак дакумэнтаў, якія пацьвярджалі гэта, таксама не было. Усё ж рызыкнуў, паступіў — о, жанкі, чаго вы ня зробіце з намі!..
У студзені 1944 году Мікола Ўлашчык перабіраецца ў Маскву навучацца ў асьпірантуры АН СССР. Пасьля непрацяглага туляньня па выпадковых начлегах яму далі жытло ў гасьцініцы „Якар“, у якой жылі беларускія навукоўцы. Гэта ўносіла пэўны дыскамфорт, бо сустрэчы з знаёмымі маглі абвярнуцца непрыемнасьцямі. Праўда, на шчасьце, неўзабаве Менск вызвалілі ад немцаў, і беларусы зьехалі на бацькаўшчыну, дыхаць стала лягчэй.

4.

У 1947-м ён абараняе кандыдацкую дысэртацыю на тэму „Падрыхтоўка эканамічных рэформаў у Беларусі і Літве перад 1861 годам“. Чытае лекцыі ў Маскоўскім унівэрсытэце, працуе ў Інстытуце гісторыі АН СССР. Не вытрымлівае: аднойчы ў кабінэце намесьніка дэкана гістфаку МДУ, дзе разам з намесьнікам дэкана знаходзіўся таксама Ўлашчыкаў навуковы кіраўнік, неабачліва выказваецца пра цяжкое калгаснае жыцьцё аднавяскоўцаў.
У сьнежні 1950 году Міколу Ўлашчыка зноў арыштоўваюць. На ягоную просьбу даць з сабой у камэру рукапісы навуковых працаў, каб папрацаваць зь імі, два палкоўнікі-сьледчыя рагаталі пару хвілінаў, а потым, выціраючы сьлёзы замілаваньня, выціснулі: яны табе ніколі не спатрэбяцца. Але ж спатрэбіліся, празь пяць год. Выжыць у высылцы дапамог начальнік тамтэйшага лягеру Міхаіл Галенчык, аднавясковец Улашчыка. Ён прызначыў хворага пасьля ранейшых тэрмінаў Улашчыка загадчыкам рэчавага складу зэкаў. Так Улашчык зноў уратаваўся.
Толькі пасьля 1955 году працы Міколы Ўлашчыка ўжо ніхто не перабіваў.
Іронія лёсу, што аўтарам першай рэцэнзіі на артыкул Улашчыка яшчэ за часоў Другой Рэчы Паспалітай быў беларускі гісторык Мікола Шкялёнак, у будучыні ідэоляг беларускага нацыяналізму пад час ІІ сусьветнай вайны, у 1945 годзе арыштаваны і павешаны бальшавікамі.
Мікола Ўлашчык усё пасьлялягернае жыцьцё пражыў у Маскве.

Недахоп Беларусі ён кампэнсаваў вандроўкамі па Бацькаўшчыне пад час адпачынкаў і ліставаньнем зь беларускімі навукоўцамі. Перапісваўся зь ім нават партыйны лідэр Беларусі Мазураў.
Уладзімер Арлоў так успамінае пра апошнія дні жыцьця Міколы Ўлашчыка: *„Ён ведаў, што ў яго засталіся дні жыцьця і не хацеў губляць ні хвіліны часу. Яму было цяжка гаварыць, але ў той кароткі мой візыт ён пасьпеў прадыктаваць мне ліст у Браслаў: за некалькі тыдняў да хваробы Мікалай Мікалаевіч знайшоў у Яраслаўлі павятовы браслаўскі архіў, вывезены ў глыбіню Расіі ў гады першай сусьветнай вайны. Улашчык быў гісторыкам да канца*“.

5.

Нярэдка мэмуарыстыка беларускіх грамадзкіх дзеячоў падаецца нейкай архіпатрыятычнай. Калі чытаеш успаміны, складваецца такое ўражаньне, што мэмуарысты літаральна кожны дзень прыносілі ахвяру на алтар Бацькаўшчыны. Ніякага асабістага жыцьця, ніякага гумару і іроніі, „смажаных“ факцікаў. Мікола Ўлашчык — вялікі гісторык — насычае ўспаміны безьліччу выпадковасьцяў: тут і заляцаньні да дзяўчатаў, і вясёлае студэнцкае баўленьне часу на вечарынках, і гумарыстычнае апісаньне знаёмых і сустрэтых людзей.
Але пры гэтым якая дзейсная любоў да бацькаўшчыны без патэтыкі, які жвавы розум без разумнічаньня паўстаюць з гэтых успамінаў!
У 1929 годзе Ўлашчык адпраўляецца ў „апошні паход“ па Бацькаўшчыне. Бесклапотная маладосьць сканчалася разам з канцом пэрыяду адноснай свабоды ў грамадзкім жыцьці, у паветры патыхала трагедыяй. Улашчык сканчае свае ўспаміны выпадкам з падарожжа, што адразу набірае сымбалічнага значэньня. Гэта апошняя сустрэча на мяжы Палесься і Случчыны — сустрэча з вужакай: *„Я прыціскаю яе да зямлі, рашчапляю палку, уціскаю ў рашчэп галаву вужакі і нясу, выцягнуўшы перад сабою. Вужака паказвае мне язык і кажа сваё „с-с-с“. Хвост яе круціцца ва ўсе бакі. Яна энэргічна цярэбіцца з кійка, што, урэшце, ёй і ўдаецца*“. Але гульня сканчаецца сьмерцю няшчаснай: *„Я ўшчамляю яе трэці раз, але такая гульня ўрэшце абрыдла, палажыўшы на пень, разьбіваю ёй галаву і іду далей*“.

Ці хто яшчэ наважваўся ў Савецкай Беларусі на напісаньне такіх мэмуараў перад вайною?
Гісторыя гуляла з гісторыкам у іншую гульню, ня менш небясьпечную, але ён супрацьставіў ёй жалезную волю да жыцьця. І выжыў тады, калі амаль ніхто не выжываў. Дзякуючы банальным рэчам: настойлівасьці і вытрываласьці ў змаганьні з сыстэмай, але таксама дзякуючы любові і вернасьці родных і блізкіх. Дзякуючы таму, што ніколі не паддаваўся ілюзіям, што меў халодную галаву і гарачае сэрца — гэтыя якасьці, можа як нідзе, адлюстраваліся ў “Краязнаўстве”. Дзякуючы гэтаму гісторык перайграў гісторыю, чалавек — сыстэму.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

Сяргей Харэўскі
Цэрквы з дрэва

Ева й Андрэй Кечынскія.
Драўляныя цэрквы Беласточчыны
(бел., ангельск., польск. мовы).
— Беласток—Белавежа: Беларускі Саюз у Польшчы, 1999.

Часам бібліяграфія кажа болей, чым назоў выдавецтва, прозьвішчы аўтараў і прадмова разам узятыя. Першае, што кідаецца ў вочы ў кнізе Кечынскіх, гэта поўная адсутнасьць беларускіх крыніцаў літаратуры ў бібліяграфічным сьпісе. Ніводнага, нават даведкавага выданьня, ня кажучы ўжо пра кнігі гэткіх аўтарытэтных беларускіх дасьледчыкаў драўлянае архітэктуры, як Якімовіч, Лакотка ці Сергачоў. Зрэшты, увесь сьпіс літаратуры выключна польскі. Хоць лягічна было б прыпусьціць, што па гэткіх тэмах, як праваслаўе і драўлянае дойлідзтва, не абысьціся безь літаратуры расейскіх аўтараў. Багата чаго для разуменьня адрознасьці нацыянальных школаў маглі б даць і ўкраінскія дасьледчыкі. Ня лішнім было б пазнаёміцца і з дойлідзтвам Літвы, а таксама Славаччыны і Скандынавіі, дзе драўляная сакральная архітэктура лічыцца нацыянальным скарбам... Але аўтары абмежаваліся літаратураю адно на даступнай сабе мове, прытым што магчымасьцяў доступу да іншамоўных крыніцаў у польскіх дасьледчыкаў непараўнана болей, чым у дасьледчыкаў беларускіх.

Другая акалічнасьць, што зьвяртае ўвагу, — большасьць выданьняў са сьпісу літаратуры адносяцца да 80—90-х гадоў.

Самая „старая“ кніга ў сьпісе — *Wschodnie Chrześcijaństwo* нейкага Жэрнова за 1967 год. Ня трэ быць Шэрлакам Холмзам, каб здагадацца, колькі ж гадоў самім аўтарам.
Са сказанага зусім не вынікае, што гэтая бібліяграфія ня вартая ўвагі. Хутчэй наадварот, беларускі чытач мае магчымасьць пазнаёміцца амаль з усім сьпісам выдадзенай у Польшчы літаратуры, што тычыцца гэтае лякальнае тэмы.

У самой жа кнізе „Драўляныя цэрквы Беласточчыны“ няма ні аналізу рысаў дойлідзтва Падляшша, ні ягонага параўнаньня зь іншымі беларускімі рэгіёнамі кшталту Пінска-Тураўскага Палесься ці Падзьвіньня. Няма таксама аналізу нацыянальных адметнасьцяў беларускае архітэктуры ў параўнаньні з польскай, літоўскай, украінскай. Хоць аўтары і падыходзяць да гэтага пытаньня: „Аналіз захаваных помнікаў царкоўнае драўлянае архітэктуры на землях Польшчы выяўляе дзьве зоны: паўночна-ўсходнюю й паўднёва-ўсходнюю. Першая ахоплівае драўляныя падляскія цэрквы, у другой знаходзяцца ўніяцкія сьвятыні лэмкаў, бойкаў, украінцаў. Архітэктуру паасобных зонаў адрозьнівае прасторавае разьмяшчэньне — гарызантальныя праекцыі, тэхнічная адметнасьць цясьлярскага майстэрства, розны спосаб выкарыстаньня будаўнічага матэрыялу…“. На тое, паводле аўтараў, „былі свае прычыны“. У аналіз гэтых прычынаў і ў прыклады адрознасьці аўтары „не ўдаюцца“.
Зрэшты, гэта становіцца зразумелым пры дэталёвым знаёмстве з усім тэкстам. Структурна ён падзелены на чатыры няроўныя часткі: „Царква — гісторыя“, „Царква — сымбаль“, „Царква — будова“ і два абзацы ў частцы „Сьвятыні стараверaў“.
Перадусім аўтары паставілі перад сабою задачу растлумачыць канфэсійныя адрозьненьні праваслаўнае практыкі будаўніцтва ад неправаслаўных. Невыпадкова таму добрая частка першага разьдзелу — гэта апалягетыка праваслаўя са сьціслым выкладам сымбалю веры.
Рэзкае абмежаваньне менавіта праваслаўнымі й стараверскімі прыкладамі сакральнае архітэктуры, бязь іхняй сувязі з прыкладамі на астатніх беларускіх тэрыторыях, і нават у суседніх ваяводзтвах Польшчы (у кнізе разглядаюцца помнікі выключна Беластоцкага ваяводзтва), звужае навуковую вартасьць выданьня. Гэтак, прыкладам, аўтары сьведама

ігнаруюць амаль усе ўніяцкія сьвятыні, адкідаючы найбольшы культурны пласт беларускага драўлянага дойлідзтва. Яны цікавяць іх толькі выключна ў тым выпадку, калі ў іх сёньня месьцяцца праваслаўныя сьвятыні (Сакі, Стрыкі, Мельнік, Чорная Вялікая, Парцава ды іншыя).
Праўда, і захапіць чытача прыгажосьцю й выяўленьнем унікальных рысаў праваслаўных сьвятыняў аўтары ня ставілі на мэце. „Падляскія цэрквы ўражваюць простай архітэктурай і беднай аздобай...“ Чалавек незаангажаваны хутчэй за ўсё ня стаў бы й чытаць далей. Аднак для цікаўных кніга ёсьць крыніцаю інфармацыі. Найперш інфармацыі візуальнай, як і дэкляруюць укладальнікі выданьня. Ілюстратыўны матэрыял, сабраны ў фотаальбом, які займае большую частку кнігі, яскрава сьведчыць і пра тое, што праваслаўе на Падляшшы ў пэўнай ступені ёсьць расейскай інсьпірацыяй. За выняткам Бельску-Падляскага праваслаўных бажніцаў да расейскае акупацыі тут больш не было. Затое пазьней яны зьяўляюцца трыма хвалямі. Першая — у 20—30-х гадох XIX стагодзьдзя. Другая (найбольшая) — пры канцы 60-х гадоў XIX стагодзьдзя, гэтак званыя „мураўёўкі“, у тым ліку й царква Сьв.Апостала Яана Тэоляга, што ў каліноўскіх Мастаўлянах. Самі аўтары шчыра пішуць: „Большасьць праваслаўных храмаў, збудаваных пасьля 1839 г., узьведзена ў новым архітэктурным стылі, які прынята называць бізантыйска-расійскім, або нацыянальным“. І трэцяя хваля — гэта XX стагодзьдзе, зь перапынкам у 30-я гады. Аднак і ў гэтым стагодзьдзі царкоўнае дойлідзтва толькі перапявала папярэднія расейскія ўзоры, ня дбаючы пра адраджэньне мясцовых („уніяцкіх“) традыцыяў. Прыкладам — група цэркваў 1950-х гадоў (нечуваная рэч для БССР): у Арэшкаве, Малешах, Гайнаўцы, Дубічах Царкоўных, Дабраводзе і г.д. Нават тут памкненьні імітаваць узоры цэнтральнае Расеі відавочныя: клясычныя „цыбуліны“, паўкруглыя вокны, алюзіі на „какошнікі“...
Дарэчы, пільна ўглядаючыся ў здымкі, можна адцеміць і тое, што ўсе вонкавыя надпісы на сьценах цэркваў, а таксама на надмагільлях, зробленыя па-расейску. Што ж... Для беларусаў Беласточчыны і гэта спосаб захаваць тоеснасьць. Праўда, якую?...

Найбольшую вартасьць кнізе надае менавіта ілюстрацыйны

матэрыял. У прыватнасьці дзьве мапы Беласточчыны, на адной зь якіх пазначаныя ўсе бажніцы ўсіх канфэсіяў, а на другой выключна праваслаўныя й стараверскія цэрквы.
Супастаўленьне абедзьвюх мапаў дае яскравае ўяўленьне, наколькі трывалы на Падляшшы артадаксальны праваслаўны ўплыў.
Апроч таго, у кнізе зьмешчаны каталёг са здымкамі 91 драўлянай сьвятыні. Гэта ўнікальны матэрыял, які ўлучае амаль усю спадчыну драўляных сьвятыняў Беласточчыны. Варта адзначыць і высокі прафэсійны ўзровень фатографаў. Вось у смузе, у нішчымніцу міжсэзоньня, выплывае перад намі царква Маці Божае Казанскае, што ў Нарве. Альбо прыцярушаная сьнегам, у засені спракавечных дрэваў, што сьцерагуць вечны сон, царква Перамяненьня Гасподняга, што ў Тапалянах, якая „пасьля ўвядзеньня Берасьцейскай уніі яшчэ 100 гадоў была праваслаўнай“. А вось маленечкая царкоўка Сьвятога Анопрыя, што на могілках у Стрыках, сярод соснаў і драўляных крыжоў. Здаецца, чуеш нават гэты пах — разагрэтага сонцам старога дрэва й жывіцы.
Нават пры беглым праглядзе гэтых здымкаў міжволі зьвяртаеш увагу на дагледжанасьць падляскіх сьвятыняў. Багата набудавана новага (Мацьковічы, Канюкі, Беласток ды інш.). Але часам сустракаецца ўсё тая ж беларуская хвароба „эўрарамонту“. Гэтак, замест спаленай сьвятыні на Сьвятой Гары Грабарцы пабудавалі новую з цэглы й ашалявалі... дрэвам. Трагедыю яе спаленьня ў 1990 годзе добра памятаюць беларусы. Але як з цэглы то з цэглы... А ў Сабятыне, напрыклад, былая ўніяцкая царква Пятра й Паўла, 1672 году, ашаляваная цяпер... сыдынгам (пластыкавымі дошкамі). Як у Амэрыцы... Аднак, справа ня ў гэтым. Рэч у тым, што тутэйшы люд не шкадуе на справу сваёй веры. І хоча, каб было, як найлепей.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

Крыніца Рэакцыі – Лісты ў рэдакцыю

аналізыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Генадзь Туровіч
Радзівілаўскія конікі

Татарынаў Ю.А. Чарадзейныя яблыкі: Аповесьці. — Менск: Юнацтва, 1999.

Апошнім часам стала модай дэбютаваць з творамі, якія зьяўляюцца апрацоўкай старых беларускіх легендаў. Тэмаў і сюжэтаў тамака невычэрпная крыніца, хопіць нашым пісьменьнікам, бадай, шчэ не на адно стагодзьдзе. Вось і Ю.А.Татарынаў, багата павандраваўшы ў розных мясьцінах Беларусі, напэўна, быў найбольш уражаны паданьнямі Нясьвіжу, бо прапаноўвае мастацкі твор, навеяны імі. Ён аб'ядноўвае некалькі паданьняў у адно цэлае пад назовам „Сэрца панны Марыі".

Адразу трэба зрабіць рэмарку. Аўтар аповесьці, напэўна, шукае прастору для больш поўнага раскрыцьця характараў сваіх герояў, бо нідзе ў аповесьці няма згадкі пра час дзеяньня. Месцам дзеяньня выступае ў аповесьці замак, у якім лёгка пазнаецца Нясьвіскі. Дзе-нідзе пісьменьнік пакідае таксама сьляды эпохі, па якіх можна заключыць, што часамі дзеяньня зьяўляюцца апошнія гады існаваньня Рэчы Паспалітай абодвух народаў. Гэта бачна з таго, што кароль польскі яшчэ ў Варшаве, а лісты францускага караля Люі XVI (якому адцялі галаву ў 1792 годзе) з гонарам захоўваюцца ў замкавым архіве. На гэты ж час указвае й праца мастака Гескага (у аповесьці яго прозьвішча зьменена на Гнезскі) па росьпісе фарнага касьцёла, што адбывалася недзе ў 1750—1770 гадох. Але побач — пералёты ў іншыя эпохі: галоўны герой аповесьці, прыгонны

садоўнік, працуе над стварэннем Марысінага парку, які, як вядома, быў закладзены толькі ў 1892 годзе, калі ні караля ў Варшаве, ні прыгону ўжо даўно не было. Вось гэты прамежак у сотню гадоў паміж рознымі падзеямі, пра якія стварыліся легенды і якія пакінулі па сабе рэальныя праявы чалавечага жыцця й дзейнасці (парк, загадкавая бочачка-дамавіна, касцёльныя фрэскі), не дазваляе аўтару зьяднаць у аповесьці розныя эпохі. Ю.А.Татарынаў становіцца закладнікам пастаўленай перад сабой мэты. Грунтуючыся на паданьнях і маючы перад вачыма цудоўныя сьведчаньні багацьця й калярыту канкрэтнай гістарычнай эпохі, пісьменьнік вымушаны пазьбягаць дэталяў.
І паколькі ўсе падзеі ў аповесьці разгортваюцца на працягу паўтара гадоў, сп.Татарынаў пазбаўлены магчымасьці паказаць каханьне пані Марыі й простага парабка на шырокім гістарычным фоне. Рознасьць эпохаў, дзяржаўных формаў, назваў пасадаў, якія ён робіць спробу зьвесьці ў адно, прымушае яго раз-пораз збочваць з простай дарогі. Радзівілаў ён перайначвае ў Эрдзівілаў і г.д. Жаданьне разьвязаць сабе рукі і пазбавіцца ад неабходнасьці апісваць канкрэтную эпоху і канкрэтны славуты род служыць пісьменьніку далёка ня лепшую службу. Напэўна ж, аповесьць задумвалася й стваралася, каб выхоўваць у чытачоў павагу да ўласнай гісторыі, легендаў і паданьняў свайго народу, каб далучаць да вечных ісьцін, а атрымоўваецца наадварот. Школьнікі будуць лічыць, што гаспадарылі ў Беларусі нейкія няясныя князі са жмудзкімі прозьвішчамі, ледзь ня вылюдкі й ведзьмакі, як гэта паказана ў аповесьці. Гэта сьпеў у старую дуду, стары міт пра заваёву Беларусі жмудзінамі, даўно адпраўлены на сьметнік гісторыі.

З другога боку, карыстаючыся мінімумам гістарычнай інфармацыі і ў той жа час прытрымліваючыся вельмі сьціслых рамак паданьня, пісьменьнік вымушаны адразу раскрыць свае карты. Разгубленасьць, прадбачаньне й прадчуваньне хуткай сьмерці, пра якую кажа галоўная гераіня, пазбаўляе аповесьць інтрыгі. Навошта ж чытаць далей цэлыя дзьвесьце старонак, калі адразу становіцца ясным, што вынік каханьня паміж князёўнай і прыгонным селянінам будзе трагічным, прынясе ім толькі пакуты і сьмерць. Адзінае, што застаецца чытачам, —

гэта спадзяваньне, што аўтарам будуць знойдзены нейкія пікантныя падрабязнасьці, нешта незвычайнае... Але ў меру набліжэньня да разьвязкі ўпэўніваемся, што нічога такога няма. Усё заканчваецца, як заплянавана — сьмерцю ўсіх галоўных герояў, нават дзіця пісьменьнік не пашкадаваў.
Каб даць юным чытачам прыклад для перайманьня, узор для паводзінаў, большасьць герояў аповесьці — станоўчыя вобразы. Да іх, безумоўна, адносяцца й панскі садоўнік са сваёй каханкай паннай Марыяй. Зь дзяцінства іх аб'ядноўвае ня толькі родная вёска, аднолькавы век, але й адно гора — абое сіроты. Разам гадаваліся, таму пачуцьцё паміж імі ўзьнікае цалкам натуральна. Ім ня ведамы табу тагачаснага грамадзтва. Хлопец, здольны музыка, хутка спасьцігае навуку садова-паркавага мастацтва. Ён непасрэдны, не хаваецца за чужыя сьпіны, сам трымае адказ за свае справы. Ён — прыклад для перайманьня. Але паслухайце яго мову: *„Я, як тая камета, лячу да Зямлі“* (с.98) або: *„Знікне цывілізацыя, людзі забудуцца словы, аднак навекі застанецца маё пачуццё да Вас“* (с.160). Заўважу — гэтыя тырады гучаць з вуснаў простага селяніна, што ніколі не пакідаў межаў сваёй вёскі, што не спасьцігаў навукі ўва ўнівэрсытэтах. Дзіва! Так, XVIII стагодзьдзе ўвайшло ў гісторыю як век адукаванага абсалютызму, але не настолькі ж, каб просты парабак пачаў разважаць пра цывілізацыю! Гэта ня мова селяніна. Узгадайце хоць бы „енеральну парапіцу“ з клясыкі, які жах яна наводзіла на мясцовых сялянаў...
Гэта мова аўтара. Не знайшоўшы нейкіх простых і шчырых словаў, а мо наадварот, жадаючы паказаць уласную эрудыцыю, Ю.А.Татарынаў укладвае ў вусны свайго героя гутарковую мову жыхара плянэты Зямля канца XX стагодзьдзя, знаёмага ня толькі з астраноміяй, але і з працамі Арнольда Тойнбі. Такім чынам, давер да кніжкі яшчэ больш зьніжаецца. Але вернемся да галоўнага героя. Помнікам садоўніку застаецца ягоная праца — Марысін парк. Садоўнік прымае сьмерць, па-сапраўднаму і ня зьведаўшы шчасьця каханьня, але зрэалізаваўшы сябе на ніве садова-паркавага мастацтва.
Іншым разам высілкі аўтара больш-менш канкрэтна акрэсьліць той ці іншы вобраз увогуле прыводзяць да дзіўных характарыстык. Вось што піша аўтар пра Пахомія Лагафета: *„У кампаніі маладых ён* (Пахомі. — **Аўт.**) *стаў кімсьці тыпу мясцовага свяшчэнніка“* (с.252). Што гэтым хоча сказаць

сп.Татарынаў? І што б ён адказаў, калі б пра яго самога нехта напісаў: „Выдаўшы тры кніжкі, Ю.А.Татарынаў стаў кімсьці тыпу мясцовага пісьменьніка“?
Прыкладам самаадданасьці выступаюць хатнія слугі панны Марыі, сярод іх выдзяляецца пакаёўка Люцыя. Яна таксама загіне, ахвяруючы сваё жыцьцё дзеля гаспадыні. Яе вуснамі гаворыць народ, у крытычны момант яна дае найбольш разумную параду, але яе ня слухаюць. На гэтым пералік станоўчых герояў ня скончваецца.
Самы загадкавы зь іх — гаспадар замка князь Эрдзівіл. Усемагутны магнат, безь якога кароль ня можа ступіць ані кроку, бо ўвесь час тэрмінова выклікае яго да сябе ў сталіцу, уражвае сваёй інфантыльнасьцю. Гэты глыбока няшчасны ў шлюбе чалавек зычыць сваёй пляменьніцы толькі дабра, але кожны раз пакідае яе ўва ўладзе сваёй жонкі-вядзьмаркі. Дзіўная роля адведзена яму аўтарам. Магчыма, перад тым як сасватаць родзічку за прынца, князь хоча ўпэўніцца, ці вартая яна таго? Ён ня мае сумневу наконт выгляду, але, пакідаючы Марыю сам-насам са сваёй жонкай і прыдуркаватым сынам, напэўна, спрабуе высьветліць, ці цьвёрды характар тая мае. Ці здольная яна высака, з гонарам пранесьці па жыцьці знакамітае імя Радзівілаў (ай, прабачце, высокашаноўнае спадарства, канечне ж, Эрдзівілаў). Інакш немагчыма вытлумачыць паводзіны князя ў дачыненьні да Марыі, бо, маючы такую ўладу й такія грошы, ён не схацеў забраць яе з сабой у вялікі сьвет, а пакінуў на верную сьмерць.

Завяршаюць кагорту станоўчых вобразаў прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі: мастак Гнезскі й архіварыюс Кржыш (зноў небеларускія прозьвішчы). Яны добрыя майстры, але цалкам засяроджаныя кожны на сваёй справе. Яны ўсьведамляюць, што ў замку пануе зло, але ня здольныя супрацьдзейнічаць яму. Жыцьцё нясе іх па плыні, іхні лёс — гэта захаваньне для нашчадкаў лістоў Пятра І, Карла XII, Люі XV і XVI, а таксама чамусьці сьмяртэльнага ворага польска-літоўскай шляхты Б.Хмяльніцкага, ды таксама росьпіс касьцёльных сьценаў. Часам здаецца, што аўтар аповесьці будуе яе на тых самых прынцыпах, што й знакаміты мультсэрыял пра Чабурашку, дзе ў першай сэрыі той чытае па складах, а ўжо к чацьвертай у яго гэта звычка страчваецца, і ён шчыра прызнаецца кракадзілу

Гену, што не сустрэў яго, бо ня здолеў прачытаць тэлеграму. Гэтак сама паньне Марыі ў 17-гадовым веку зьбіраюцца даць адукацыю (гэта галоўны довад яе тэрміновага пераезду ў замак), а ўжо перад сном у першы ж дзень, каб неяк бавіць час, яна раскрывае кніжку. Яшчэ ж праз колькі старонак „вясковая прынцэса“ зьдзіўляе мастака Гнезскага параўнаньнем кветак німфэі са знакамі ангельскай кароны. Цікава было б даведацца, няўжо пра форму ангельскай кароны раней ёй распавядалі вясковыя пастушкі? Каб перадаць ні з чым не параўнальны калярыт кніжкі, навяду шчэ колькі прыкладаў: *„Жадаючы хутчэй скончыць сумны рытуал, ён* (князь Эрдзівіл. — **Аўт.**) *раптам павярнуўся, звякнуў шпорамі, пакрочыў да карэты. Слуга адчыніў перад ім дзверку“* (с.161). Дазвольце папытацца, навошта Ю.А.Татарынаў начапіў на боты шпоры, калі князь зьбіраўся ехаць ня верхам, а фурманкай?
Шчэ з кніжкі можна даведацца, што „губы“ — прыналежнасьць мужчынская, а „вусны“ — жаночая („Намагаючыся пацалаваць яе, той дакрануўся губамі да яе вуснаў“). У кніжцы можна знайсьці й „каталіцкі манастыр“, і „прыказчыка“.
Новая кніжка Ю.А.Татарынава пабачыла сьвет у сэрыі „Бібліятэка прыгод і фантастыкі“. Выдавецтва „Юнацтва“ шчэ ў 1982 годзе распачало друкаваць найлепшыя творы сусьветнай літаратуры для дзяцей. Стаяць на адной паліцы з А.Дзюма ганарова для любога пісьменьніка, але гэта таксама накладае на яго пэўную адказнасьць. Сама менш трэба адпавядаць стандартам забаўляльнай літаратуры. Ці здолеў дасягнуць гэткай вышыні аўтар „Чарадзейных яблыкаў“ і „Сэрца панны Марыі“, рашаць, зразумела, маленькім чытачом, калі ім не перашкодзіць зрабіць гэта цвырканьне конікаў. Гэтыя маленькія жывёліны стракацяць ня толькі ў парках Нясьвіжу, але й на бачынах кніжкі — старонках 10, 12, 17, 92, 95, 141, 175, 204... Ад гэтага стракаценьня хочацца згарнуць „Яблыкі“ і перачытаць „Паданьні Нясьвіжу“ сп.Шышыгінай-Патоцкай.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум

№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 29-07-2000
[image]

[illegible]ізм

[image]
ARCHE Skaryna № 4 (9) – 2000
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[illegible] [illegible] [illegible] [

Праведнікамі, а таксама (хоць і рэдка) нямецкімі вайскоўцамі.

Самыя каштоўныя факты змешчаны ў другім раздзеле. Тут аўтар, карыстаючыся архіўнымі анкетамі яўрэяў-актывістаў супраціву, спрабуе прасачыць унутраную логіку іх дзеянняў. Ён шмат распавядае пра падпольшчыкаў з менскага гета (балазе гэтая тэма ўжо адносна добра вывучаная), яўрэяў-партызанаў, слаўных заснавальнікаў яўрэйскіх сямейных лагераў у Налібоцкай пушчы Шлёмы Зорына і Тув'і Бельскага. Кніга нават магла б, напэўна, мець назву кшталту „Катастрофа і змаганне". Падступае аўтар і да няпростых тэмаў „Яўрэі і палякі сярод беларускіх партызанаў", „Антысемітызм у партызанскім руху".
Што да трэцяга раздзелу, дык фактычна гэта кампіляцыя матэрыялаў Надзвычайнай камісіі па злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая працавала ў Беларусі ў 1944–45 гадах, і ўспамінаў сведкаў Катастрофы. Поўнай і падрабязнай гісторыі беларускіх гета тут няма, аднак можна даведацца пра падзеі ў прыкладна 50 гарадах і мястэчках. Заслугай аўтара з'яўляецца ўвядзенне ў навуковае абарачэнне шэрагу новых дакументаў.

Чацверты й пяты раздзелы маюць дачыненне збольшага да пасляваеннага перыяду — тут вядзецца пра замоўчванне тэмы Катастрофы ў БССР, пра помнікі генацыду. Змясціў аўтар і нарыс пра свой родны горад, Рэчыцу. У кнізе маюцца разнастайныя дадаткі, якія займаюць прыкладна чвэрць ад агульнага аб'ёму (432 стар.). Часам яны носяць выпадковы характар: так, аўтар перадрукаваў з „ARCHE-Вялікая айчынная вайна" (у перакладзе з беларускай) зварот да беларускіх паліцыянтаў, дзе яўрэі зусім не згадваюцца. Увогуле, у кнізе шмат другаснага, аб'ектыўна неабавязковага, пры тым, што некаторыя важныя аспекты Катастрофы засталіся ў ценю — тая ж антысеміцкая прапаганда, разгорнутая сярод беларускага насельніцтва. На старонках кнігі раз-пораз прыніжаюцца (дзеля рэкламы?) папярэднія даследаванні, што перш за ўсё выяўляецца ў прадмове супрацоўніка Ерусалімскага універсітэта Д.Раманоўскага: *„Кніга Л.Смілавіцкага — гэта першая расійскамоўная навуковая праца па гісторыі Катастрофы яўрэяў Беларусі… Усё дагэтуль напісанае па-*

беларуску і па-расійску было, уласна кажучы, не гісторыяй, а краязнаўствам“. Каб спраставаць гэта, досыць будзе адной спасылкі: на зборнік „Трагедия евреев Белоруссии в 1941–1944 гг.“ пад рэдакцыяй Р.Чарнаглазавай, супрацоўніцы беларускага Музею вялікай айчыннай вайны, які двойчы выдаваўся ў Менску — у 1995 і 1997 гадах. Да гонару Л.Смілавіцкага, ён прызнае, што гэтая кніга (і яшчэ „Пинские евреи, 1939–1944 гг.“ Я.Разенблата і І.Яленскай, Берасце, 1997), адпавядаюць самым высокім патрабаванням да навуковай працы.

На жаль, распавядаючы пра менскае гета, аўтар мала карыстае з кнігі аднаго з важакоў тамтэйшага падполля Гіршы Смоляра „Мсціўцы гета“, што выходзіла ў Маскве ў 1946 і 1947 г. (адпаведна, на ідыш і на расійскай), з прычыны яе ўяўнай „павярхоўнасці“. Толькі ўзгадваецца й выдатная кніга нядаўна памерлай Ганны Краснапёркі „Пісьмы маёй памяці“ (Менск, 1984). Навуковую вартасць кнігі Смілавіцкага зніжаюць стылёвыя неахайнасці, паўтарэнні, шматлікія памылкі друку. Сям-там аўтар пераказвае факты з іншых крыніц без адмысловай спасылкі на апошнія (напрыклад, на с.72 — эпізоды з кнігі А.Рубенчыка „Правда о Минском гетто“, Тэль-Авіў, 1999). Сустракаюцца кур’ёзы перакладу („падпальшчык“ як „подпольщик“). Аўтар зусім справядліва прыгадвае, што дакладная колькасць яўрэйскіх ахвяраў на Беларусі невядомая, і падае розныя версіі: ад 245 тысячаў да мільёну чалавек. Сам ён лічыць, што загінула больш за 80% беларускіх яўрэяў, або мінімум 700 тысячаў чалавек (і гэта падобна да праўды), але не тлумачыць, як падлічыў. Да таго ж ён крыху супярэчыць сам сабе, калі піша, што да верасня 1941 году здолела з’ехаць у эвакуацыю *„толькі 20% яўрэйскага насельніцтва рэспублікі“* (с.68).

У аснову кнігі пакладзены артыкулы Л.Смілавіцкага з ізраільскіх навуковых часопісаў. Можна заўважыць, што кніга зроблена крыху паспешліва — і ўсё ж, нягледзячы на шэраг істотных недахопаў, яна будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй яўрэяў Беларусі, другой сусветнай вайной, партызанкай і яўрэйска-беларускімі стасункамі.

Аўтар кнігі — прафесійны гісторык, PhDr. Нарадзіўся ў Беларусі ў 1955 г., эміграваў у Ізраіль у 1992 г. Працуе ў Інстытуце яўрэйскай дыяспары пры Тэль-Авіўскім універсітэце.

Кніга выдадзена коштам некалькіх ізраільскіх фондаў.
Замовіць яе можна непасрэдна ў аўтара: L.Smilovitsky, Olsvanger str., 111–37. 96673, Jerusalem, Israel. Тэл. 02-6417146.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

Ганна Штэйнман
У дзяржаўніцкіх каардынатах

Уладзімер Арлоў, Генадзь Сагановіч.
Дзесяць вякоў беларускай гісторыі.
— Вільня: Наша Будучыня, 1999.

„Гістарычная сьведамасьць яшчэ настолькі кволая, дый не даецца яна за год-другі. Асабліва ўва ўмовах недахопу літаратуры, фальсыфікацыяў, разброду гістарыяграфічных трактовак (то мы балты, то ня балты)… Словам, не кансалідуе таксама“.
(Сяргей Паўлоўскі. „Мова наша і ваша“ // „Наша ніва“, 27.01.97)
Калі некалькі год таму ў „Свабодзе“ пад рубрыкай „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі“ пачалі зьяўляцца артыкулы Ўладзімера Арлова і Генадзя Сагановіча, прысьвечаныя адметным падзеям і постацям нашае мінуўшчыны, большасьць маіх аднагодкаў-школьнікаў ужо ведала, што гістарычны шлях Беларусі распачаў не „Вялікі Кастрычнік“ і не абвяшчэньне БССР, — ведала, у асноўным, зь першых падручнікаў у бел-чырвона-белай мяккай вокладцы, а тыя, хто цікавіўся гісторыяй, пасьпелі ўжо прачытаць „Імя ў летапісе“ Вітаўта Чаропкі і „Памяць пра легенды“ Кастуся Тарасава. Тым ня менш, зьмешчаныя ў газэтах артыкулы вядомых гісторыкаў адразу знайшлі свайго чытача, які нецярпліва чакаў выхаду кожнага новага нумару.
Прайшло некалькі год, і цяпер сабраныя і выдадзеныя асобнай кнігаю „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі“ ёсьць у першую

чаргу адлюстраваньнем адпаведнай гістарычнай канцэпцыі, у цэнтры якой — беларуская нацыянальная дзяржава. Пра тое, наколькі карысна для беларускай інтэлігенцыі культываваць і прапагандаваць такі падыход у сёньняшняй Беларусі, няма чаго й казаць. Тым больш, што апошнім часам на рынку гістарычнай літаратуры зьявілася шмат новых выданьняў — ад спэцыяльнага падручніка на расейскай мове, прызначанага для выкладаньня гісторыі Беларусі ў Вышэйшай школе міліцыі з адпаведнай вэрсіяй гісторыі, да зялёнага і афіцыёзнага „братнеславянскага“ дапаможніка ў дзьвюх частках, які, між іншым, сьцьвярджае, што далучэньне Беларусі да Расейскае Імпэрыі паспрыяла разьвіцьцю прамысловасьці нашае краіны і самавызначэньню беларусаў. З аднаго боку, зьмешчанай у кнізе інфармацыі можа папросту забракнуць, для таго каб пасьпяхова здаць іспыт па прадмеце, які называецца „Гісторыя Беларусі“. Зь іншага боку, школьным падручнікам (асабліва пасьля таго, як чырвоную паласу на вокладцы зьмянілі на блакітную), відавочна, не стае моманту пэўнае „ідэалізацыі“ і „гераізацыі“ роднай гісторыі — а менавіта ў гэтым галоўная зваба і прычына посьпеху кнігі Ў.Арлова і Г.Сагановіча. Не сакрэт, што аб’ектыўнасьць часьцяком мяжуе з абыякавасьцю, а вызначыць, што ёсьць гістарычнай праўдай і гістарычнай справядлівасьцю, калі гаворка йдзе пра гісторыю тваёй радзімы, цяжка. Калі ўжо на тое пайшло, дык беларускім дзеткам трэба расказваць беларускія казкі пра беларускіх асілкаў, і казкі гэтыя мусяць у першую чаргу быць гераічнымі, а не „аб’ектыўнымі“ — пакінем апошнюю прыкмету для сур’ёзных навуковых распрацовак. „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі“ — казкі для дарослых — спалучаюць праўдзівыя гістарычныя факты з эмацыйнымі вобразнымі камэнтарамі, у выніку ўтвараецца своеасаблівая і вельмі нацыянальная вэрсія гісторыі, дзе акцэнты расстаўленыя і прыярытэты пазначаныя выключна ў адпаведнасьці з нацыянальнымі інтарэсамі беларускае дзяржавы, такімі, якія яны бачацца аўтарам. Просты прыклад: у аповедзе пра забойства ўніяцкага арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча пад час паўстаньня ў Віцебску ў 1623 годзе, ягоным мэтадам увядзеньня ўніяцтва прысьвечана адно некалькі сказаў: *„Язафат Кунцэвіч быў сынам свайго нялітасьціваga часу…“, „Не шкадуючы сябе, гэты чалавек не шкадаваў і іншых…“, „Прысьпешваючы падзеі, ён пераступіў небясьпечную мяжу, за*

якою пачынаецца жорсткасьць…“, затое вельмі падрабязна і натуралістычна апісваецца жорсткая сцэна ягонага забойства, цытуюцца вытрымкі з судовых дакумэнтаў па гэтай справе. Праз 216 год біскуп Іосіф Сямашка праводзіў адваротны працэс — гвалтоўны перавод уніятаў у праваслаўе — і ўся жорсткасьць, зь якою гэта рабілася, добра „прачытваецца“ разам з болем ад страты „нацыянальнай“ рэлігіі. Абсалюту аб’ектыўнасьці няма розьніцы, якую рэлігію на якую зьмянялі гвалтам, але для беларускай дзяржаўнасьці розьніца ёсьць, улічваючы, што *„праваслаўная царква не дала ў XVII стагодзьдзі ніякіх яскравых прыкладаў заступніцтва за нацыянальныя правы беларусаў, а часам выконвала здрадніцкую ролю“* (У.Арлоў, „Берасьцейская царкоўная унія“), а *„новая* [уніяцкая] *царква паступова перамагала як сапраўды нацыянальная, народная. Так яе расцэньвалі Кастусь Каліноўскі, Максім Багдановіч, Вацлаў Ластоўскі (…). Уніяты добра ведалі, што яны не палякі і не расейцы“* (У.Арлоў, „Берасьцейская царкоўная унія“). Тым больш, што, скасаваўшы унію, *„каланізатары замацавалі падзел беларусаў на каталікоў і праваслаўных. Вось адна з галоўных прычын слабой нацыянальнай кансалідацыі беларусаў, ад чаго мы зазналі столькі няшчасьцяў і ў наступным* [XX] *стагодзьдзі“* (У.Арлоў, „Царкоўны сабор у Полацку прымае акт аб ліквідацыі уніі“). У Беларусі настолькі размытае паняцьце нацыянальных інтарэсаў, што абазначыць тую розьніцу вельмі важна. Невыпадкова абраная і форма хронікі. Гістарычная хроніка ў памяці кожнага з нас складаецца з шэрагу вядомых нам гістарычных падзей, паводле якіх мы арыентуемся ў гісторыі, атаесамляючы даты з пэўнымі эпохамі. „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі“ мусяць „пераарыентаваць“ чытача з падзеяў расейскай ці іншай гісторыі на падзеі гісторыі Беларусі. Гэта і найбольшая вартасьць „Дзесяці вякоў“, дзякуючы гэтай акалічнасьці твор Уладзімера Арлова і Генадзя Сагановіча ня згубіцца ў шэрагу іншых гістарычных выданьняў. Мы адчувалі патрэбу ў такой кнізе — цяпер яна ў нас ёсьць. І хоць рыхтавацца да сур’ёзнага іспыту па гісторыі Беларусі, выкарыстоўваючы яе як падручнік, не выпадае, я ўзгадваю, як перад адпаведным іспытам слухала „Песьні касінераў“ Сержука Сокалава-Воюша, і з гэтай жа прычыны раю перачытаць ці хаця б пагартаць „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі“, перад тым як цягнуць білет з пытаньнямі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]

Наста Гулак
Трывожнае ўспрыманьне рэчаіснасьці

Алесь Кавальчук. „Вясельле на хутары“.
— Менск: ARCHE — „Паталёгіі грамадзтва“, 4–1999.

У чацьвертым нумары часопіса ARCHE за 1999 год у стракатай мазаіцы паталёгій грамадзтва апроч іншага прыцягвае ўвагу „Вясельле на хутары“ ананіма Алеся Кавальчука. Апавяданьне шчодра ілюструе тэму нумару: асуджаныя на алькагалізм і прымітывізм хлопцы й дзеўкі беларускага бамонду, нястомныя інтэрнацкія эратаманкі; дасталі высьпятка знаныя ў літаратурных колах асобы. Аднак суседзтва Кавальчука з такімі аўтарытэтамі абсурду і монстрамі паталёгій, як Жорж Батай, Пэтэр Гандке, Адам Глёбус ды аўтар чырвона-зялёнага нататніка з пункту гледжаньня мастацкасьці спачатку здаецца неапраўданым. Пакуль, чытаючы гэтую блякла-саўковую прозу на старонках сур’ёзнага выданьня, не разумееш, што гэта — *брак маральнасьці аўтара*.

У „Вясельлі на хутары“ зь першых жа старонак насьцярожвае сьмеласьць, зь якой аўтар бярэцца называць „рэаліі“ ды „пэрсаналіі“, палохае абсалютнае, зусім лішняе ў творы *літаратурным,* праўдападабенства. Пры тым, што імя самога аўтара*, у адрозьненьне ад усіх імёнаў у апавяданьні*, схавана пад псэўданім.

Даверлівы чытач сіліцца ператравіць гэтую мэмуарыстыку з дакумэнталістыкай і спадзяецца хаця б яркіх эмоцыяў: адчуць

атмасфэру таго часу, узгадаць і сваю маладосьць.
Вось маладыя „нацугі“ на ўік-эндзе. Як яны дачыняюцца? З чаго жартуюць? Нялёгка, спачувае аўтару даверлівы чытач, будзе аднавіць на паперы хоць частку таго бурлескнага зіхатлівага гумару, хоць рэха таго гамэрычнага рогату, якім суправаджаліся маладыя забавы будучых дэмакратаў. Затое, прадчувае ён, гэтыя дзеці андэграўнду будуць раўсьці за кожным тостам „Жыве Беларусь!“. Ці трапна аўтар дасьць партрэты гэтых неардынарных асобаў? А лірычная нота? Акрамя „маладых“, якім паводле статусу належыцца быць закаханымі, можа, аўтар намалюе рамантычны флірт ці пачуцьцёвую любоўную сцэну?

Аднак цьвілы подых савецкіх падручнікаў беларускай мовы амаль адразу навязвае іншы эмацыйны лад. На другой старонцы пачынае перасьледаваць слоўца *„паабапал“*.
„Паабапал дарогі ўсё было зялёным, пафарбаваным у чэрвеньскую сьвежую яшчэ зеляніну“.
„А затым паабапал шляху, можа ў паўкілямэтры адзін ад аднаго пайшлі прагалы зарослага чарналесьсем поля, на якім яшчэ нешта сеялася і расло“.
„Дарога выходзіць зь лесу і праваруч адкрываецца вялікая прагаліна, якую можна назваць сапраўдным полем. Паабапал шляху стаяць два хутары…“
Даверлівы чытач суцяшае сябе тым, што аб беларускі краявід можа зламіць пяро ня толькі Кавальчук. Аднак невыносная трывіяльнасьць апаноўвае старонкі і робіць іх малачытэльнымі.

„— Бляха, як хочацца кінуць усё і пайсьці з гэтага зас… гораду. Вось так жыў бы і жыў, — з зайздрасьцю сказаў я, паглядаючы на гэты аўтаномны і незалежны сусьвет.
— Усё адно, ад прагрэсу далёка не ўцячэш, — мэлянхалічна заўважыў жаніх.
— На халеру мне прагрэс. Хадзіў бы ў Ракаў па хлеб ды соль, — адгукнуўся я.
За хутарам па дарозе паказаўся невялікі ставок, са старымі вербамі паабапал, каля якога нас чакалі паненкі.
— Вось так жывуць людзі, — з сумам заўважыў я, паглядаючы на вербы, што нахіліліся вакол стаўка да самай вады.“

Куртатыя дыялёгі зьмяняюцца загрувашчанымі пэйзажнымі замалёўкамі, а тыя зрэдчасу — мудрагелістымі разважаньнямі кшталту:
Але сам я больш люблю срэбра, бо калі золата — чысьціня, і кожны, хто мае золота, уяўляе, што мае часьцінку дасканаласьці, недасягальнага ідэалу, (? — **Н.Г.**) *дык срэбра — гэта вада. А там, дзе ёсьць вада, ці яе сымбаль, срэбра, чалавек заўсёды можа наблізіцца да чысьціні, ці, па меншай меры, супакоіць сябе гэтай уяваю.* (? — **Н.Г.**)
Тло гэтай шэрай прозы расквечваюць некаторыя даволі ўдалыя эпізоды. Аднак гэтыя апісаньні „дагружаюцца“ трывіяльна-напышлівымі філязафаваньнямі.
Бясспрэчна ўдалым месцам у „Вясельлі“ зьяўляецца сцэна ля стаўка. Аднак дамінуе ўсё ж бытаапісальніцтва. Тое вясельле на хутары паўстае звычайнай саўковай п’янкай: п’юць шмат і апантана, баяцца, што ня хопіць, блююць.
„Гарэлкі было шмат. Увесь час падыходзілі госьці, кожны прыносіў сваё, а мы ўсё пілі і пілі, аж пакуль Колік-алкаш, які і тады быў прыпёрся хвастом за Сысом, не званіtаваў лішкамі кубінскага рому проста на стол, заліўшы нашыя відэльцы і лыжкі“.
„Не пасьпелі мы лыкнуць, як з-за хлява паказаліся Сева з Наталяю“.
„Ліхаманкава пачалі шукаць закусь. Са стала на адкрытай вэрандзе пад шляхецкімі слупкамі папрыбіралі ўвесь брудны посуд і паставілі знойдзеныя Сысом пляшкі.
Хутка вызначылі, што на літр гарэлкі засталося ў нас два літры пітное вады і два няпоўныя пачкі цыгарэтаў. Ды гэта нікога асабліва не турбавала. Паненкі паўздыхалі дзеля прыліку, але ніхто ўсур’ёз не ўспрыняў іхніх уздыхаў“.
Кідаецца ў вочы ярка выражанае нэгатыўнае мысьленьне галоўнага героя, якое выражаецца ў акцэнтаваньні ўвагі на адмоўных рысах асобаў, іх учынкаў. І, што ня дзіўна, менавіта гэтыя моманты найбольш таленавітыя. Партрэт лішэнца-алкаша Коліка самы рэльефны з астатніх:

„Колік, з выгляду хлопчык зь пячоры Ташык-Таш…“
„Колік — траянскі конь з саламянымі косамі і бурачковым прапітым фэйсам…“
„Колік палыпаў запухлымі вочкамі і нешта рохкнуў у адказ“.

Падрабязна, наколькі гэта магчыма ў межах апавяданьня, апісана дэградацыя літаратара Сыса. Надзвычай злая характарыстыка супрацоўніка часопіса Толіка і ягонай спадарожніцы Наталі.

„Яна з прагнасьцю накінулася на гарэлку. Крылы носа ў яе ўзьнесьліся, паказаліся маленькія жоўтыя клычкі, якія драпежна цокнулі аб край кілішка“.
Заганаў гэтай пары, аб якіх бязь ценю сумненьня паведаміў нам аўтар, хапіла б на некалькіх п’яніцаў, альфонсаў і юрлівых блудніц. Госьць Пётра зьвяртае на сябе ўвагу лірычнага героя тым, што багацейшы: *„Троху падфарцоўваў, а таму лічыў даляры і палiў “Marlboro”“.* Аднак найбольш кепска і нематывавана агрэсіўна аўтар ставіцца да Севы, гаспадара хутару. Сам жа гаспадар шчыры ў праяўленьні сваіх эмоцыяў і ня можа зразумець зларадnасьці сваіх гасьцей. Ягоныя эмоцыі раздражненьня — бадай адзіныя сапраўдныя, некрывадушныя ўва ўсім апавяданьні:
„…[Гаспадар — **Н.Г.**] *казаў ёй, што ноччу было жаданьне падперці ўсіх і спаліць хату разам з намі“.*
Госьці п’юць за сталом, потым пераходзяць да вогнішча. То яны таўкуцца ў хаце, кладучыся спаць… Лірычны герой увесь час адчувае сябе дыскамфортна. Ён, старэйшы амаль за ўсіх сябрукоў, выглядае сумным напаўізгоем з уласнага жаданьня: не жартуе, не кахаецца, толькі іранічна, часам зьдзекліва, пасьміхаецца сам сабе.
Вось Кавальчук вымаўляе Астраўцу сэнтэнцыю пра *безыменны фальклёр*. Вось Кавальчук расьпівае дармавую пляшку каньяку зь вядомым паэтам, спэкулюючы на ягоным славалюбстве. Вось Кавальчук бадзёрыць стомленага Скоблу лімаўскай абвесткай пра прыняцьце яго, Скоблы, у Саюз пісьменьнікаў. Вось Кавальчук дакарае Сыса за п’янства. Вось Кавальчук *адганяе хахлоў* і сам распальвае вогнішча. Вось Кавальчук сьмяецца з Коліка і паблажліва называе яго *касьцюкоўскім вахлаком.* Вось Кавальчук ляканічна супакойвае Паліну, кажучы ёй *ты*, у той час як яна яму кажа *вы.* Вось Кавальчук ля калыскі беларушчыны ў Гомельскім унівэрсытэце.
Асабістая *натурфілязофія* лірычнага героя немудрагелістая: *„Ну, што гэтаму чалавеку трэба,… кавалак зямлі зь якога*

паўгектару, азерца, пасечку, цяплічку — жыві сабе, калупайся, гадуй сьвіньні ды дзеці, любуйся прыродай, лаві імгненьне свайго непаўторнага зямнога жыцьця…“. Гэтая *натурфілязофія* аб’ядноўваецца з думкамі іншага міжвольнага аўтара чацьвертага нумару ARCHE: *„Нам такая демократия надо, когда человек работает, получает хоть какую-то зарплату, чтобы и хлебушка купить, молочка, сметаны, творожку, иногда кусочек мяса, чтобы накормить ребенка и так далее“.*

Іх аб’ядноўвае пераважна нэгатыўнае, трывожнае ўспрыняцьце рэчаіснасьці, боязь навакольнага сьвету, жаданьне замкнуцца ў сваей ракавіне. Таму і мастацкае крэда аўтара „Вясельля“ ня можа быць складаным. У творы Кавальчука няма ні інтрыгі, ні характараў, ні арыгінальнасьці. Гэта якраз і азначае, што там няма *літаратуры*.

Чытач, безумоўна, мае права на псыхааналітычныя разважаньні адносна асобы галоўнага лірычнага героя „Вясельля“. Ды і глеба ўдзячная: у дзяцінстве Кавальчук любіў, схаваўшыся, адкалупваць і есьці пячную гліну (не раўнуючы, як гераіня Маркеса); у юнацтве быў схільны да эпатажных учынкаў; у маладосьці, пра гэта мы здагадваемся па цэлым шэрагу дэталяў, жанчыны ня песьцілі нашага героя ўвагай… Аднак, хаця ён і псэўданім, пашкадуем Кавальчукова самалюбства ды спакой. На жаль, сам ён, публікуючы свой опус васьмігадовай даўніны, не схацеў паставіцца так да сваіх былых сяброў.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (9) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **29-07-2000**
[image]